СЯРГЕЙ ВЕРАМЕЙЧЫК

# МІХАЛ КЛЕАФАС АГІНСКІ

1765—1833





*Маёй матулі*
*Марыі Фёдараўне Жлобіч*
*прысвячаю...*

УДК 78.071.1(476)(092)+929Агінскі
ББК 85.313 (4Беи)
В31

*Рэцэнзент доктар філалагічных навук,
прафесар А. І. Мальдзіс*



**Верамейчык С. І.**
**В31** Міхал Клеафас Агінскі, 1765—1833: Продкі, жыццё ў Залессі, нашчадкі (спроба храналогіі)/Сяргей Верамейчык. — Мн.: ВТАА «Кавалер Паблішэрс», 2003. — 128 с.: іл.

ISBN 985-6427-78-9.

Кніга, напісаная краязнаўцам і на краязнаўчым узроўні, з'яўляецца займальным храналагічным даведнікам жыцця выдатнага кампазітара і дзяржаўнага дзеяча М. Кл. Агінскага і будзе вельмі карыснай для настаўнікаў, вучняў і ўсіх цікаўных да гісторыі Беларусі.

**УДК 78.071.1(476)(092)+929Агінскі**
**ББК 85.313 (4Беи)**

**ISBN 985-6427-78-9**
**© Кавалер Паблішэрс, 2003**

СЯРГЕЙ ВЕРАМЕЙЧЫК

# МІХАЛ КЛЕАФАС АГІНСКІ

## 1765—1833

***Продкі, жыццё у Залессі, нашчадкі***

(спроба храналогіі)

Мінск
ВТАА «КАВАЛЕР Паблішэрс»
2003

# Змест

**Ад аўтара** ........ 5
**Маёнтак у Залессі** ........ 9
**Дрэва роду** ........ 12
Герб роду Агінскіх ........ 14
Сямейная лінія Міхала Казіміра ........ 20
**Князь Міхал Клеафас** ........ 39
Палітык ........ 45
Паўстанец ........ 55
Эмігрант ........ 62
Гаспадар Залесся ........ 76
Італьянскі перыяд (пасля 1822 г.) ........ 103
Адступленне — пра лёс паланэзу «ля-мінор» ........ 108
**Залессе пасля М. Кл. Агінскага** ........ 113
**Запавет сыну** ........ 124
**Спіс літаратуры** ........ 127

# Ад аўтара

Шчыра прызнаюся — чатырнаццаць год таму пра Агінскага я амаль нічога не ведаў...

Пра Залессе тады я ведаў адзінае — там жывуць Лось і Ліс, мастакі (муж і жонка), якія з'ехалі з Менску ў гэтую вёску і там, з вясковымі дзецьмі, адраджаюць тэатр «Батлейка».

Пра Агінскага і Залессе я прачытаў, здаецца, у 1981 г. у кніжцы А. Мальдзіса «Падарожжа ў XIX стагоддзе» (у ёй мяне болей уразіла і захапіла асоба Ігната Дамейкі, які нарадзіўся каля Міра, а апынуўся аж у Чылі, дзе працаваў у Сант'яга рэктарам універсітэта).

Праз час і мне прыйшлося адкрываць «сваю Амерыку» — кінуўшы працу архітэктара-рэстаўратара, я ў верасні 1989 г. з'ехаў з Менску ў «эміграцыю» — у Залессе да Алеся Лася і Жэні Ліс. З імі разам планавалася стварыць на базе іх «Батлейкі» школу мастацтваў для дзяцей Залесся і навакольных вёсак. Для размяшчэння школы намі быў запланаваны «захоп» часткі былога палаца Агінскага, які стаяў у парку сядзібы без прыгляду, у стане «бясконцай рэстаўрацыі».

Галоўнай справай-падзеяй у праекце нашай школы было наладзіць свята да дня нараджэння былога гаспадара Залесся (якраз на наступны год быў яго юбілей — 225 гадоў!). Вырашылі рабіць свята ў палацы Агінскага сярод бітай цэглы і рыштаванняў. Тады ж у мяне і ўзнікла думка стварыць «дрэва роду Агінскіх», Алесь жа ўзяўся за герб роду.

Першы варыянт радаводу складаўся з васьмі персанажаў і быў зроблены на старой, зафарбаванай бяліламі «Палітычнай карце свету», якую нам пазычылі ў мясцовай школе. Асноўнай крыніцай для яго была ўсё тая ж кніжка А. Мальдзіса. (Акрамя радаводу і герба, мы прыдумалі і «гульню ў гасцей Агінскага» — «Паўночна-афінскі пасьянс».) Прэм'ерны паказ радаводу адбыўся 25 верасня 1990 г. у так званай «камінная зале» палаца, на першым святкаванні ўгодкаў М. Кл. Агінскага (першым, здаецца, не толькі на Беларусі). Галоўнымі ўдзельнікамі свята сталі вучні і настаўнікі Залескай школы і госці з Менску, Смаргоні і в. Заброддзе — усяго сабралася каля 40 чалавек.

Далей былі праца з дзецьмі ў Залескай школе (майстэрня малявання «Апалонік»), стварэнне музычных спектакляў (у дзіцячай тэатральна-музычнай студыі «Альтанка»), правядзенне штогод святаў у маёнтку, але, здаецца, над усім пераважала «прага адкрыццяў» — пра Агінскага, яго сям'ю і продкаў. Былое Залесся пачало ажываць у новых фактах, узнікалі новыя і новыя персанажы «Паўночных Афінаў» — будаўнікі і архітэктары палаца, садоўнік Струміла, іспанец-скрыпач Эскудэра, італьянец-спявак Паліяні, афіцэр Паўловіч, француз Жан Ралей... У мяне пачалі з'яўляцца тэматычныя папкі — «Кола Паўночных Афінаў», «Вандроўкі Міхала па Еўропе», «Продкі Агінскага», «Сям'я князя», «Мясцовыя гісторыі аб Агінскім», «Персанажы і сюжэты ангельскага парку ў Залессі» і інш.

Вялікіх намаганняў для збору інфармацыі я не рабіў — не ездзіў у бібліятэкі, не сядзеў у архівах, бо ўсё пачало з'яўляцца то там, то тут у друку (у гістарычных часопісах ці кніжках). Акрамя гэтага, знаёмцы і сябры, якія наведвалі нашыя святы, па маёй просьбе прывозілі ўсё, што датычылася тэмы Агінскага. На першым варыянце радаводу (ён штогод служыў аздобай свята ўгодкаў Агінскага) з'ўляліся ўсё новыя персанажы — «дрэва» расло ў вышыню! Урэшце да 230-годдзя князя Міхала быў зроблены другі варыянт яго радаводу, які налічваў ужо 32 асобы.

Аднойчы выпадкова правёўшы экскурсію па сядзібе і нечакана набыўшы славу гіда, я пачаў іх ладзіць пастаянна. На экскурсіях (болей для школьнікаў) я выгаворваў усё, што ведаў, і звычайна пачынаў з радаводу, з жыцця Агінскага, потым апавядаў пра яго прыезд у Залессе, пра «Паўночныя Афіны» (палац, сядзібу, паркі) і заканчваў Фларэнцыяй, дзе пахаваны Агінскі. Ліміт часу (каля гадзіны) вымагаў лапідарнасці аповяду, і шмат «цікавых гісторый» заставалася за яго межамі. Мне заўсёды бракавала лаканічнай храналогіі, маё «шматведанне» абцяжарвала аповяд дробязямі — легендамі, гіпотэзамі і нават анекдотамі (хаця я ўпэўнены, што менавіта на гэтым спачатку трымаецца «слава» любой гістарычнай асобы!). Так што ў маіх экскурсіях былі і «правалы»...

Успамінаючы свае вучнёўскія ўражанні ад музейных экскурсаводаў, якія занудліва засыпалі мяне (тады не вельмі здольнага і прагнага да ведаў вучня) кучаю ўсялякіх датаў і гістарычных падзей, я пачаў прыдумляць новыя прыёмы свайго аповяду пра Агінскага і Залессе — каб зацікавіць дзяцей-слухачоў «дэтэктывам даследчыка» і пазбавіць сябе ад назірання іх патухлых позіркаў, абыякавасці і пазяханняў.

Так узніклі «загадкі і падказкі», «перакруты» з датамі нараджэнняў (Агінскага і Моцарта), «кітайскі яблык у Залессі», «пошукі персанажаў ангельскага парку» і г.д. У час экскурсій я пачаў браць гітару і са слухачамі мы «рэпеціравалі» ў парку спевы на тэму «Паўночных Афінаў».

У сюжэце «адкрыццяў пра Міхала» перыяд з 1996 па 1998 год быў для мяне самым «прыбытковым». За гэты час адбылася паездка з залескімі вучнямі на радзіму Агінскага — у м.Гузаў (Рэспубліка Польшча), потым гузаўцы (ксёндз П. Станяк, настаўнікі і вучаніцы) прыехалі ў Залессе і прывезлі шмат дакументаў пра Агінскага. У кастрычніку 1996 г. Залессе наведаў нашчадак Агінскага сп. Анджэй Залускі, потым — яго брат сп. Іва з жонкай Памэлай (сп. Іва прывёз і падараваў свой дыск з паланезам Агінскага). У 1997-м у Англіі выйшла кніга А. Залускага «Музыка і час М. Кл. Агінскага» , а ў 1998-м і П. Станяк выдаў у Гузаве сваю — «Клеафас Міхал Агінскі».

Новыя паступленні ўжо проста складваліся, і не хапала часу іх сістэматызаваць. Галоўнае — не было зразумела, дзеля чаго. Мой «капітал ведаў» пра Агінскага не знаходзіў выйсця — ён не працаваў, не быў «пушчаны ў абарот»... Маёнтак так і стаяў амаль такі, як і раней, «нежывы». Сродкаў на яго аднаўленне ў дзяржаве пакуль няма...

У сакавіку 2000 г. — тэлефонны званок ад Р. Улана (рэдактара «Новай газеты Смаргоні») з нечаканай для мяне прапановай зрабіць разам WEB-старонку пра Агінскага ў Інтэрнеце.

Ад гэтага званка і бярэ пачатак гэтая «спроба храналогіі», якую я прапаную чытачу.

Інфармацыя, вядома ж, не будзе новай для дасведчанага чалавека, бо гэта толькі спроба аматара гісторыі злучыць вядомую інфармацыю пра Агінскага ў адзіны храналагічны ланцужок для шырокага чытача, цікаўнага да падзей мінуўшчыны нашай Радзімы (зразумела, што гэты ланцужок з'яўляецца толькі «поглядам з Залесся» і ніяк не прэтэндуе на ўсебаковы агляд тэмы).

Выказваю маю шчырую падзяку :

- сп. А. Залускаму — за дасланыя мне ксеракопіі рукапісу мемуараў М. Кл. Агінскага,
- Валянціну Калніну — за гістарычныя звесткі, якія ён мне бескарысна перадаваў,
- прафесару А. Мальдзісу — за парады і заўвагі, якія ён выказаў у сваёй рэцэнзіі,
- ксяндзу П. Станяку — за дасланыя дакументы,
- Таццяне Кляшчонак — за супрацоўніцтва і пераклад дакументаў з польскай мовы,
- Канстанціну Хацяноўскаму — за выхад гэтай кнігі,
- а таксама ўсім сябрам і знаёмым, хто дапамагаў мне ў маёй справе.

Сяргей Верамейчык
*Залессе, 2003 г.*

*Б'е барабан, гучаць фанфары,*
*Граюць альты і кантрабас...*
*Гэта ўспамін былое славы —*
*«Паўночных Афінаў» час,*
*Калі ў Залессі, усімі знаны,*
*Жыў Міхал Клеафас!*

*Слаўнага роду ваяводаў,*
*Роду Агінскіх тых часін,*
*Калі жыхар былога Княства*
*Не забываў, што ён «ліцвін» —*
*Час даўніны былое славы*
*«Паўночных Афін»,*
*калі*
*Прыязджалі ў Залессе госці да гаспадара,*
*Сустракаў іх князь Агінскі, шчыра ўсіх вітаў.*
*І разносілася рэха музыкі сярод алей —*
*Гралі скрыпкі, клавікорды і віяланчэль!*

*З дзіцячага музычнага спектакля*
*«Вечар у Паўночных Афінах»*
*да ўгодкаў М. Кл. Агінскага*
**5.11.2001**
*Залессе*

# МАЁНТАК У ЗАЛЕССІ

*«28 красавіка 1802 года я з'ехаў з Пецярбургу з намерам назаўсёды пасяліцца ў вёсцы, недалёка ад Вільні...»*

Так пісаў ў сваіх мемуарах князь Міхал Клеафас Агінскі — дзяржаўны дзеяч, былы паўстанец, кампазітар-аматар пра той час, калі ён прыехаў у Залессе.

Мясцовасць гэтая першапачаткова звалася Дзербы. У першай палове XVIII ст. яе набыў віцебскі ваявода Марцыян Агінскі (1672—1750), потым яна належала яго сыну Тадэвушу Францішку (1712—1783), ваяводу трокскаму. Пасля смерці Тадэвуша Залессе атрымаў адзін з яго двух сыноў — Францішак Ксаверы (1742—1814), граф і апошні кухмайстар літоўскі. Ня меўшы нашчадкаў, Францішак пакінуў Залессе ў спадчыну свайму пляменніку Міхалу Клеафасу Агінскаму. У Залессі Агінскі



*Палац Агінскіх у Залессі XIX ст., малюнак Напалеона Орды*

пражыў са сваёю сям'ёй 20 гадоў. Жывучы тут, былы дыпламат Рэчы Паспалітай, паўстанец 1794 г., а потым эмігрант атрымаў ад цара Аляксандра I пасаду сенатара Расейскай імперыі. У Залессі ён пачаў пісаць свае літаратурныя творы — «Мемуары пра Польшчу і палякаў з 1788 да 1815 г.» (у іх ён неаднаразова падкрэсліваў сваё ліцвінскае паходжанне) і «Лісты пра музыку». Тут Агінскі склаў большасць сваіх рамансаў, паланэзаў. Існуе версія, што менавіта тут нарадзіўся яго знакаміты паланэз «Развітанне з Радзімай» (памылкова лічыць, што гэтую назву даў сам аўтар — у выданнях музычных твораў Агінскага таго часу паланэз называўся проста «ля-мінор»). З успамінаў сучаснікаў князя Міхала мы даведваемся, што яго залеская сядзіба ў тыя часы звалася «Паўночныя Афіны».

Зараз Залессе — невялікае мястэчка ў Гарадзенскай вобласці, каля Смаргоні, амаль на сярэдзіне шляху па чыгунцы паміж Менскам і Вільняй. Тут да нашых часоў захавалася сядзіба Агінскага (рэстаўрацыя яе з канца 70-х гадоў мінулага стагоддзя вядзецца і дагэтуль) — фрагменты паркаў XVIII—XIX ст., стаў, невялікі палац і адрэстаўраваная ўжо капліца. І хаця рэстаўрацыя сядзібы знаходзіцца ў стане «даўгабуда», сюды, у Залессе, штогод прыязджаюць на экскурсіі школьнікі, настаўнікі і людзі, цікаўныя да сваёй мінуўшчыны. З 1990 г. тут святкуюцца ўгодкі М. Кл. Агінскага — былога гаспадара «Паўночных Афінаў».

Хто ж такі быў князь Агінскі — дзяржаўны дзеяч па прызванні, аматар музыкі па захапленні, чалавек эпохі Асветніцтва ці рамантык пачатку XIX ст.?

Урэшце быў ён чалавек просты, які забяспечваў сям'ю, выхоўваў дзяцей і клапаціўся пра іх будучыню, ці складаная, супярэчлівая натура, у якой сутыкаліся прагматызм і натуральны авантурызм чалавека, што жыў на


*Палац у Залессі, сучасны выгляд*

зломе стагоддзяў? Хто ж быў гэты князь, прозвішча якога моцна зніталася ў нашай памяці з вядомым у тыя часы танцам — «Паланэзам Агінскага»?

Каб адказаць на ўсё гэта і асэнсаваць адну з падзей гісторыі — жыццё князя Агінскага, — узгадаем вядомае «глядзі ў корань» і ажывім у памяці далёкую мінуўшчыну — гісторыю роду Агінскіх, якая пачынаецца ў XIV ст. з часоў Вялікага княства Літоўскага.

# ДРЭВА РОДУ

Гэты радавод — плён аматарскай цікаўнасці аўтара да гісторыі залескай сядзібы і яе былога гаспадара М. Кл. Агінскага. З цягам часу вывучэнне фактаў жыцця Агінскага ў Залессі, кола яго сяброў і знаёмых, яго нашчадкаў, а таксама жыцця князя да прыезду сюды, яго юнацтва і дзяцінства і, нарэшце, продкаў Агінскага прывяло да пошукаў адказаў на пытанні — як і дзе ўзнік род Агінскіх?

Наш радавод адрозніваецца ад традыцыйных, таму што не ахоплівае жыцця ўсіх князёў Агінскіх, а прысвечаны толькі адной персоне — былому гаспадару Залесся Міхалу Клеафасу Агінскаму, які тут жыў 20 гадоў. Радавод створаны ў 1995 г. і не прэтэндуе на ўсебаковасць, бо прызначаўся для выкладання ў Залескай школе на пазакласных занятках па гісторыі і краязнаўстве з мэтай адраджэння гістарычных ведаў пра жыццё як М. Кл. Агінскага, так і яго продкаў, яго род, які ўплываў на падзеі нашай далёкай мінуўшчыны.

Князі Агінскія — старадаўні магнацкі род герба «Агінец», прадстаўнікі якога адыгралі значную ролю ў дзяржаўным, грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі, Летувы і Польшчы. Агінскім належалі землі і маёнткі на Смаленшчыне, Гузаў, Саколаў (Польшча); Еўе, Кроны, Рэтаў, Плунге (Летува); Віцебск, Маладэчна, Ганута, Залессе, Бабры, Мсціславец, Бялынічы, Слонім, Чачэрск, Пінск (Беларусь).




*Радавод М. Кл. Агінскага (склаў аўтар)*

Існуе дзве версіі паходжання роду Агінскіх. Паводле першай род гэты паходзіць ад Рурыкавічаў (т.зв. казельская галіна чарнігаўскіх князёў). Паводле ж другой пачынальнікамі роду з'яўляюцца смаленскія князі Глушонкі. Не абвяргаючы першай версіі, мы спынімся на другой.

Наш радавод «даследуе» толькі мужчынскую лінію, якая была страчана ў пачатку XX ст. (радавод «да нашых дзён» — сем'і Залускіх у Англіі і Высоцкіх у Польшчы — будзе дадзены далей). Аўтарскія каментарыі і гіпотэзы пазначаны курсівам.



# Герб роду Агінскіх

Герб складаецца з дзвюх частак. У верхняй (чырвонай) — Юры Пераможца, у ніжняй (блакітнай) — герб «Агінец»: чырвоная брама да намёту (вайсковага), над ёю — срэбны крыж з раздвоеным верхнім канцом.

*Верагодна, што ніжняя частка герба — старадаўняя (вершнік Юры з'явіўся пазней), на што паказваюць яго назва (сугучная са словам Агінскі) і брама да вайсковага намёту. Вайскавы намёт — атрыбут, знак княжацкага роду (шасцёра з князёў Агінскіх былі ваярамі — ваяводамі Вялікага княства Літоўскага, а потым і Рэчы Паспалітай).*

**Глазына, Глушанок** — мянушкі князёў (прозвішчы з'явіліся пазней, у XVII ст.), якія жылі ў XIV ст. у Вялікім княстве Літоўскім), на Смаленшчыне.

*Да пытання, хто былі Агінскія — палякі ці беларусы: Смаленшчына ў тыя часы была этнічна беларускай тэрыторыяй, якая ўваходзіла ў склад ВКЛ. І яшчэ па сённяшні дзень там ёсць вёскі, дзе гавораць па-беларуску. Радзіма знакамітых паэтаў А. Твардоўскага і М. Ісакоўскага — таксама Смаленшчына.*

**Князь Васіль Глазына** атрымаў ад Вялікага князя ВКЛ Казіміра Ягайлавіча маёнтак Мсціславец на Смаленшчыне. Гэты маёнтак потым па загаду Казіміра быў перададзены сыну Васіля Глазыны — князю Івану.

**Князь Іван Глазына** (сын Васіля), апрача хрышчонага прозвішча Глазыніч, меў мянушку Пузынін. У Супрасльскім сінодзіку запісана: «род князя Глазыніна і ягонага брата князя Івана Пузыніна». Пры Казіміры Ягайлавічы ён уцёк у Масковію, але ягоныя дзеці і жонка былі злоўленыя ў дарозе і засталіся ў ВКЛ. У 1494 г. Вялікі князь Маскоўскі Іван III дамагаецца ад князя ВКЛ Аляксандра выдачы княгіні Іванавай Глазыніч з дзецьмі, але дарэмна.

*Калі б не ўцёкі Івана Глазыны і калі б дзеці яго і жонка не былі затрыманы і не засталіся ў ВКЛ, то і не было б роду Агінскіх. Далейшы ж лёс уцекача ў Масковію невядомы.*

Апроч згаданага ў 1496 г. сына Юрыя князь Іван пакінуў яшчэ сыноў: Дзмітра, Івана (сын яго Цімафей узяў іншую мянушку — Пузына, і ад яго вядзецца пачатак роду Пузынаў), Льва, Міхала і Андрэя, якія ёсць у спісе князёў і баяраў смаленскіх, складзеным у канцы XV ст. Усе яны зваліся Глушанкамі ці Глушонкамі.

**Князь Алёхна Глазына** (другі сын Васіля) у 1458 г. вызначыўся ў вайне з крыжакамі, у 1486 г. ён смаленскі акольнічы, у 1492 г. атрымаў сяло Мамаеўскае на Смаленшчыне. Вялікі князь ВКЛ Аляксандр Ягелончык прызначыў яго намеснікам Лучына (Лучын-гарадок), які паводле дамовы з Масквою быў вернуты ВКЛ у 1494 г. У 1496 г. Алёхна атрымлівае вёскі Кожухава, Вэхры, Разрабовічы, Нямлёнава і Наскова на Смаленшчыне, у 1498 г. — прывілей на Шчарбіны, Казлоў і Чулкаў, а ў 1499 г. — на Давыдкаў, Скавароднa. У 1500 г. Лучын захоплены Масквою і смаленскі акольнічы атрымлівае двор Опса ў Браслаўскім павеце. Быў жанаты з Сапежанкаю, меў дачку Фядору Глазынаву, якая пасля смерці бацькоў, праз свайго дзядзьку, каралеўскага сакратара Івана Сапегу, была выдадзена за Аляксандра Салтановіча, гаспадарскага маршалка.

**Князь Дзмітры Глушонак** (сын Івана) у 1486—1487 гг. атрымоўвае ад князя ВКЛ Казіміра дробныя падарункі з даходаў смаленскіх. Ад князя ВКЛ Аляксандра атрымаў прывілей на ***Агінты*** ў Жыжмарскім павеце.




*Агінты на карце*

*Кар'ера князя Дзмітрыя і «геаграфія роду» пры Аляксандры Ягелончыку змяняюцца ў заходнім накірунку (бліжэй да Балтыкі). Агінты (па-летувіску Uogintae, ад «uoga» — ягада) знаходзяцца каля м.Кайшыядорыс, недалёка ад Кронаў, паміж Трокамі і Коўна (Літоўская Рэспубліка). Зараз у гэтай вёсцы засталося некалькі хат. Апошнім гаспадаром тут быў Антанас Кажынкас. У другую сусветную вайну, у 1944 г., тут усё загінула ў вогнішчы. Засталася толькі маленькая ліпавая алея. Сюды прыехаў князь Дзмітры Глушонак, адсюль пачнецца «другая гісторыя» гэтага роду.*

У 1510 г., відавочна, пасля смерці князя Дзмітрыя, валоданне Агінтамі яго сынам Багданам пацвярджае наступны князь ВКЛ Жыгімонт II.

**Князь Багдан Глушонак** (сын Дзмітрыя) у 1542 г. судзіцца з князем Бароўскім за дом у Вільні. У 1555 г. ягоная ўдава княгіня Багданава Багуміла, складаючы тастамант, называе сваіх сыноў Мацея і Фёдара Багданавічаў, таксама і нябожчыка мужа ***«князямі Агінскімі з Казельска»***.

*Ад запісу ў гэтым тастаманце з сярэдзіны XVI ст. мянушкі князёў роду Глазына, Глушонак знікаюць і да нашых дзён ужываецца ўжо прозвішча роду — Агінскія, ад назвы летувіскага мястэчка Агінты.*

**Князь Мацей Агінскі** (?—1564 г.) і князь Фёдар Агінскі (?—1575 г.) сталі родапачынальнікамі дзвюх галінаў дрэва Агінскіх: старэйшай (якая ў XVII і пачатку XIX ст. ужывала графскі тытул) і малодшай — браслаўскай (якая страціла княжацкі тытул і належала да шляхты, пазней да дваранства).

**Князь Багдан Агінскі** (?—1625, сын Мацея) — падкаморы трокскі, ротмістр гусарскі, палкоўнік войска ВКЛ, удзельнічаў ў Лівонскай вайне 1558—1582 гг., ва ўзяцці Полацка (1579 г.) і Вялікіх Лукаў (1580 г.) і польска-шведскай вайне 1601—1602 гг. Уладальнік маёнткаў Агінты,

Кроны (тут пабудаваў замак і касцёл для уніятаў) і Еўе (заснаваў знакамітую друкарню, дзе ў 1619 г. убачыла свет «Граматыка» Мялеція Сматрыцкага, у якой быў змешчаны герб Агінскіх) у Трокскім ваяводстве. Выконваў дыпламатычныя місіі, удзельнічаў у перамовах з Расеяй (1582, 1587, 1612, 1613, 1615 гг.), быў дэпутатам Галоўнага трыбунала і старастам Віленскага праваслаўнага Святадухава брацтва. Быў жанаты з Раінай Валовіч, меў чатырох сыноў (Яна, Аляксандра, Дзмітрыя і Самуэля) і трох дачок. Братоў Яна (кашталян мсціслаўскі), Аляксандра і Самуэля Агінскіх сучаснікі называлі «стаўпамі праваслаўнай веры». Ян і Аляксандр разам з бацькам Багданам былі фундатарамі манастыра Пятра і Паўла ў Менску. Яны ў 1612 г. падпісалі пратэст супраць пераходу праваслаўных святароў ва уніяцтва. Ян Агінскі фундаваў Багаяўленскі манастыр у Магілёве. Багдан Агінскі і яго жонка пахаваныя ў праваслаўным манастыры ў Кронах (зараз мяст. Круоніс у Літве, недалёка ад Каўнаса).



*Надмагілле Багдана Агінскага*



*Надмагілле Льва Самуэля Агінскага*

У мураванай царкве да нашага часу захаваліся два надмагіллі, рэльефныя выявы рыцараў — Багдана Агінскага і яго сына Льва Самуэля.

**Князь Леў Самуэль Агінскі** (каля 1595—1657) — стольнік трокскі, уладальнік Агінтаў і Еўя ў Трокскім ваяводстве, а таксама Мікуліна і Лёзна ў Віцебскім ваяводстве (гэтыя маёнткі прынесла ў пасаг маці Льва Самуэля Раіна Валовіч, дачка смаленскага ваяводы Рыгора Валовіча). Князь Леў Самуэль жыў у Віцебску, яго пляц і дом узгадваюцца ў дакументах 1627 г., яму ж яшчэ належала ў горадзе 5 дамоў з агародамі.

*Бачна, што «міграцыя рэзідэнцый Агінскіх» працягваецца — пасля Смаленшчыны і Агінтаў Віцебск і Віцебшчына становяцца трэцім месцам жыхарства роду Агінскіх.*

Князь Самуэль і браслаўскі земскі суддзя Себасцьян Мірскі сталі аднаўнікамі Віцебскага Маркава манастыра і дзеля яго набылі навакольныя маёнткі Маркава і Шыдлоўшчыну. Ад шлюбу з Соф'яй Бялевіч стольнік трокскі Самуэль меў чатырох дачок і сыноў Сымона, Караля і Яна.

*У шмат якіх даследаваннях Міхал Клеафас Агінскі называецца пляменнікам гетмана ВКЛ Міхала Казіміра Агінскага. Але гэта не так. Міхал Казімір быў далёкім сваяком Міхала Клеафаса (напэўна, яго траюрадным дзядзькам), таму што яго сямейная лінія бярэ пачатак ад Яна Агінскага, сына Льва Самуэля.*

## Сямейная лінія Міхала Казіміра

**Князь Ян Агінскі** (?—1684), сын Льва Самуэля, харунжы ваўкавыскі, у 1655 г. перайшоў на бок расейскага цара Аляксея Міхайлавіча (бацькі Пятра I).

*1655 г. — час вайны Рэчы Паспалітай з Расеяй (1654—1667). Якраз у гэтым годзе Расея захапіла Вільню і Ваўкавыск. Пэўне, Ян Агінскі, як харунжы ваўкавыскі, быў захоплены ў палон і яго «пераход на бок Расеі» быў не здрадай, а кароткім кампрамісам дзеля захавання ўласнага жыцця.*

У 1656 г. ён ізноў у войску ВКЛ, удзельнічае ў бітвах супраць Расеі. Маршалак ваўкавыскі (1657 г.), ваявода мсціслаўскі (1672 г.), полацкі і гетман літоўскі (1682 г.). Ваяваў супраць туркаў і крымскіх татараў, удзельнік бітвы пад Венай (1683 г.). Валодаў маёнткамі Мікулін (Віцебскае ваяводства), Бакшты (Менскае), Крапіўніцы (Ваўкавыскі павет). Быў жанаты з Ганнай Сямашкай (1645 г.), потым з Іваннай Тэадорай Нарушэвіч (1660 г.). Меў сыноў Мікалая Францішка, Рыгора Антонія (якія ўзначалі канфедэрацыю беларускай і літоўскай шляхты супраць магнатаў Сапегаў у 1697 г.), Лявона Казіміра, Аляксандра, Казіміра Дамініка, Марцыяна і трох дачок — Ганну, Марыянну і Алену.

**Князь Казімір Дамінік Агінскі** (?—1773) — ваявода трокскі, віленскі, ажаніўся ў 1692 г. з Элеанорай Вайнянкай. Меў дачок Марцыбэлу, Тарэсу, Алену, Марыянну і сына Юзафа.

**Княгіня Алёна (Гелена) Агінская** (каля 1700—1790) — дачка Казіміра Дамініка, жонка (з 1739 г.) Ігнацыя Агінскага (?—1775), маршалка літоўскага, кашталяна віленскага (сын Марцыяна Міхала, мечніка літоўскага). Увайшла ў палітыку, дапамагаючы свайму бацьку, які быў у 1726—1727 гг. у Курляндыі як сябра камісіі сейму. У Мітаве пасябравала з княгіняй курляндскай Ганнай (якая у 1730 г. стала расейскай царыцай). У траўні 1731 г., пэўне, па запрашэнні царыцы, прыехала ў Маскву. Акрэдытаваныя ў Маскве заходнія дыпламаты ацэньвалі яе як ***«прыгожую і інтэлігентную польку»***.

У 1740 г. яна ізноў у Расеі — як жонка надзвычайнага пасла Рэчы Паспалітай. Фактычна Алёна была дыпламатам, а яе муж Ігнацы выконваў функцыі толькі прадстаўнічыя. Пісалі, што яна была ***«дамай прыгожай, мудрай і такой вялікай сілы, што падковы магла ламаць»***. У 1775 г. княгіня Алёна перадала ў спадчыну (яе замужжа было бяздзетнае) Андрэю Агінскаму маёнтак Саколаў на Падляшшы і фальварак Скандайтэ на Жмудзі (потым Саколаў пяройдзе ў спадчыну сыну Андрэя — Міхалу Клеафасу Агінскаму). Алёна і Ігнацы Агінскія рабілі шмат касцёльных фундацый у сваіх уладаннях у Еўі, Бабры, Мікуліне (каля Оршы) і Барысаве. Пасля смерці мужа Алёна, уладарка Бялынічаў, у 1761 г. набыла для мясцовага кармеліцкага касцёла цудатворны абраз Дзевы Марыі, пасля чаго Бялынічы ў хуткім часе сталі называць «Беларускай Чанстаховай». Алёна пахавана разам з мужам у Віцебскім езуіцкім касцёле, куды была перавезена труна з яе целам пасля смерці ў Варшаве ў 1790 г.

*У апісанні Рамана Афтаназі сядзібы Дабраўляны (недалёка ад Смаргоні) ёсць успамін Аляксандра Пшаздэцкага аб калекцыі твораў мастацтва, што сабраў гаспадар Дабраўлян Адам Гюнтар (бацька Габрыэлі Пузыны). Пшаздэцкі сярод апісання іншых карцін упамінае і партрэт кашталянкі Агінскай, якая* ***«срэбраны талер рукой сагнула ў трубку, калі ўласныя дзеці хацелі пад выглядам аслаблення яе сілы і пажылога ўзросту адабраць у яе кіраванне маёнткам»*** *(пераклад Т. Кляшчонак). Вельмі хочацца думаць, што ў Дабраўлянах быў партрэт кашталянкі Алёны Агінскай — «дэманстрацыя моцы» ў партрэце і ва ўспамінах пра Алёну супадае, але ...у яе і Ігнацыя, на жаль, не было дзяцей... Можа была яшчэ адна дужая кашталянка Агінская? (Хацелася б самому скласці спіс кандыдатак, але прапаную зрабіць «адкрыццё» сваім чытачам ).*

**Князь Юзаф Тадэвуш Агінскі** (каля 1693—1736) — мечнік літоўскі, ваявода трокскі. Ажаніўся ў 1712 г. з княгіняй Ганнай Вішнявецкай. Меў дачок Аўгусту, Жэнавефу, Кацярыну, Казіміру, Эльжбету і сына Міхала Казіміра.

**Князь Міхал Казімір Агінскі** (1728—1800) — пісар літоўскі, генерал-маёр літоўскі, ваявода віленскі, Вялікі гетман літоўскі, кампазітар, паэт, мецэнат.

Нарадзіўся ў Казельску (Чарнігаўшчына). Бацьку страціў рана, быў пад апякунствам спачатку дзеда па матчынай лініі — гетмана Вішнявецкага, потым пад наглядам Марцыяна Агінскага, віцебскага ваяводы, і, нарэшце, пад апякунствам канцлера Рэчы Паспалітай Міхала Чартарыйскага.

*Напэўна, у час апякунства Марцыяна Агінскага хлапчук Міхал Казімір выхоўваўся ў Віцебску разам з унукам Марцыяна Андрэем Агінскім (бацькам Міхала Клеафаса), якому падчас нараджэння Міхала Казіміра ўжо*

*было 11 гадоў. Можа з гэтых часоў сумеснага выхавання двух хлапчукоў і сталі называць Міхала Казіміра «дзядзькам» Міхала Клеафаса...*


Партрэт Міхала Казіміра Агінскага

Пра выхаванне Міхала Казіміра мала вядома, але без сумневу ён вывучаў музыку і жывапіс і меў здольнасці да мастацтва. Па парадзе свайго апошняга апекуна ён выбірае ваенную кар'еру. У 1748 г. дэпутат сейму атрымаў маёнткі, да якіх далучыў Чачэрск, Кальварыю, Мерач, Пінск, Тухоль і Рычывул. У 1750 г. ён наведаў Парыж, дзе, як сам пісаў, ***«свой час выкарыстоўваў, каб развіваць здольнасці ў ігры на скрыпцы, у жывапісе і невядома ў яшчэ колькіх сваіх маленькіх здольнасцях».***

Яго здольнасці ў сваіх мемуарах ухваляў сам Д. Дзідро. У 1757 г. ён ад'ютант герцага Арлеанскага. 18 кастрычніка 1761 г. у Волчыне адбыўся яго шлюб з дачкой Чартарыйскага, удавой Міхала Антона Сапегі (літоўскага падканцлера) Аляксандрай. За ёй ён атрымаў Слонімскае стараства. Жыў у Пецярбурзе, быў адным з кандыдатаў Кацярыны II на польскі трон. У 1765 г. вярнуўся з Расеі і пачаў ствараць у Слоніме «сядзібу музаў». Праз палескія балоты яго намаганнямі былі пракладзены два гасцінцы — тракты, якія злучылі Пінск са Слонімам і з Валынню. У 1768 г. атрымаў пасаду Вялікага літоўскага гетмана. У 1771 г. далучыўся да Барскай канфедэрацыі. Яго трохтысячнае войска ў ноч на 23 верасня было разбіта пад Сталавічамі



*Палац у Небарове (Польшча), XVII ст.*

войскамі А.Суворава. Пасля эміграцыі атрымаў амністыю. У 1775 г. вярнуўся ў Слонім, дзе пабудаваў некалькі прадпрыемстваў, друкарню, заснаваў оперны тэатр і музычную капэлу (дзеля гэтага ў 1774 г. з-за недахопу грошай ён быў вымушаны прадаць маёнтак Нябораў сваёй пляменніцы — княгіні Гелене Радзівіл, народжанай Пшаздэцкай, і яе мужу).

Па яго ініцыятыве і на яго сродкі, разам з пінскім мечнікам і гарадскім суддзёю Марцінам Бутрымовічам, быў пабудаваны знакаміты канал Агінскага, які звязаў басейны Балтыйскага і Чорнага мораў. Гетман быў масонам, і ў 1781 г. яго абралі «дэпутаваным Вялікім магістрам правінцыі Літва». З 1782 па 1785 год ён падарожнічае (Ахен, Брусель, Амстэрдам, Гаага; наведвае і Англію).

*Пазней, на пачатку 1790-х гадоў, Міхал Клеафас Агінскі як дыпламат амаль паўторыць «шлях гетмана» па Галандыі і Англіі.*

Па сведчанні сучаснікаў гетман па сваіх інтарэсах, адукацыі і характары ў першую чаргу быў усё ж чалавекам мастацтва. У юнацтве Міхал Казімір захапляўся жывапісам — маляваў ландшафты, кветкі, садавіну і птушак «*з лёгкасцю, элегантнасцю і дакладнасцю*». Атрымаўшы грунтоўную музычную адукацыю, выдатна валодаў інструментамі, яго таксама жартам называлі «гетман-кларнет». Пра яго пісалі: «***мае вялікі музычны талент і цудоўна іграе на арфе і скрыпцы***». Сцвярджаюць, што гэта ён вынайшаў падножку да арфы. У 1760 г. яго ігру на арфе на працягу трох гадзінаў слухаў Дзідро, які высока ацаніў яго талент і тэхніку выканання. Для Слонімскага тэатра гетман напісаў оперы «Цыганы» і «Елісейскія Палі», таксама складаў паланезы і іншыя музычныя творы. Акрамя гэтага, ён быў здольны і да паэтычна-літаратурнай творчасці — выдаў «Гістарычныя і маральныя аповесці», «Байкі і нябайкі».

Як філантроп Міхал Казімір зрабіў багатыя ахвяраванні для кляштара і касцёла ў Смілавічах і таксама заснаваў дабрачынны фонд для студэнтаў Віленскага універсітэта. Падчас паўстання Т. Касцюшкі Агінскі знаходзіўся ў Вільні. Цяжка хворы, ён па-ранейшаму атачаў сябе музыкантамі і наладзіў сяброўства з Ё. Гайднам. У канцы 1795 г. Агінскі ўжо ў Варшаве, дзе прысвяціў сябе мастацтву і музыцы. Памёр ён у Варшаве 31 траўня 1800 г.

*З дыстанцыі часу для нас гетман Агінскі выглядае як чалавек неардынарны і адораны шматлікімі талентамі. Яго ўдзел у палітыцы ў розных — нават процілеглых — лагерах, схільнасць да авантур і дыскрэдытуючых афёр, здаецца, выдае ў ім даверлівага і часам наіўнага чалавека ці чалавека «без прынцыпаў» (але гэтае наша «здаецца» не дае падстаў адмаўляць яму ў патрыятызме і жаданні добрасумленна дзейнічаць на карысць свайго краю).*

*Уласныя амбіцыі і славалюбства, схільнасць да акультных ведаў, сентыменталізм і тэатральнасць учынкаў — усё гэта ў 2-й палове XVII ст. было якраз звычайным для паводзінаў свецкага вяльможы, які належаў да прэтэнцыёзнага, інтэлектуальнага асяроддзя тагачаснага маладога караля Рэчы Паспалітай. Доказам «звычайнасці» постаці Міхала Казіміра з'яўляецца жыццёвы шлях (паводзіны, учынкі, здольнасці і сімпатыі) яго т. зв. «пляменніка». Жыццё далёкага сваяка нейкім дзіўным чынам, як у люстэрку, адбілася, паўтарылася, зразумела, па-свойму, у жыцці Міхала Клеафаса Агінскага, да лініі роду якога мы вяртаемся.*

**Князь Сымон Караль Агінскі** (каля 1620 — каля 1699, сын Льва Самуэля) — падкаморы віцебскі, ваявода мсціслаўскі, мечнік літоўскі. У 1639 г. разам з братам Янам Яцакам запісаўся ў Кракаўскі універсітэт. Пазней, у 1641 г., Сымон Караль стаў студэнтам універсітэта ў г. Франекер у Галандыі, дзе выдаў пераклад на лацінскую мову французскага падручніка па правілах этыкету. У Франекеры ён ажаніўся з дачкой бургамістра Т. Стакманс, якая ў хуткім часе пасля прыезду мужа на радзіму пакінула яго і разам з дачкой Соф'яй вярнулася дадому.

*Магчыма, у Галандыі і жывуць нашчадкі Сымона Караля ад яго дачкі Соф'і, і гэтая «галандская лінія Агінскіх» яшчэ чакае свайго даследчыка.*

У 1655 г. разам з бацькам у Вільні прыняў расейскае падданства, але ўжо ў 1660 г. ён — паручнік у войску ВКЛ і ваюе супраць маскоўскага цара. Валодаў Еўем, а на Віцебшчыне — маёнткамі Лёзна і Рудня (Мікуліна атрымаў ў спадчыну яго брат Ян). У 1672 г. ён стараста брацтва Св. Духа ў Вільні, аднак каля 1680 г. ён, як і пераважная большасць яго крэўных, перайшоў ў каталіцтва.

Калі Віцебск захапілі расейскія войскі падчас вайны 1654—1667 гг., быў выкананы «Чарцёж» горада 1664 г.

(яго дасылалі на зацверджанне ў Маскву, цару Аляксею Міхайлавічу). На «Чарцяжы» выява дома ваяводы, у якім жыў Сымон Караль.

Нягледзячы на пераход у каталіцтва (да гэтага ўсе ў родзе Агінскіх былі праваслаўнымі), Сымон Караль падтрымліваў фундацыямі праваслаўны Віцебскі Маркаў манастыр. Пасля пажару 1690 г. ён аднавіў манаскія келлі і ўзвеў драўляную саборную царкву Св. Тройцы, на дзвярах якой быў выразаны герб Агінскіх «Агінец» (царква гвалтоўна знішчана ў 1920-я гады). Падкаморы віцебскі быў тройчы жанаты. Ад шлюбу з другой жонкай, Тэадорай з Корсакаў, меў сыноў Багуслава, Марцыяна Міхала і Ежы і дачок Хрысціну і Элеанору. Ад апошняга шлюбу з Тарэсай Война Ясянецкай — сына Аляксандра. Сымон Караль Агінскі памёр у 1699 г. і быў пахаваны ў Вільні ў фундаваным ім касцёле Св. Тарэсы пры кляштары кармелітаў, што знаходзіўся ў прадмесці Рыбакі.



*Палац ваяводы Сымона Караля Агінскга з «Чарцяжа» Віцебска 1664 г.*

**Князь Марцыян Міхал Агінскі** (1672—1750, сын Сымона Караля і Тэадоры, дачкі полацкага кашталяна Яна Корсака) — мечнік літоўскі, кашталян, а потым ваявода віцебскі, староста барысаўскі і віштынецкі.

Зямельныя ўладанні на Віцебшчыне — маёнткі Мікуліна, Лёзна, Марцыянава, Веляшковічы, Горспля, Усвяцкае і Бабінавіцкае староствы. Шлюб з Хрысцінай з Абрамовічаў (удава Яна Казіміра Ленфарда) прынёс яму Бобр і Бялынічы ў Аршанскім павеце. Карабельны

лес, які рос у Бабінавічах, сплаўлялі па рэках Лучосе і Заходняй Дзвіне ў Рыгу. Ад гэтага Агінскі меў неблагія прыбыткі. Фінансавыя яго справы доўгі час вёў габрэй Шмуйла Іцкавіч, галоўны касір Гераніма Фларыяна Радзівіла. Марцыян Агінскі намагаўся ператварыць некаторыя свае маёнткі ў мястэчкі, а з цягам часу — і ў невялікія гарады. Маёнтак Веляшковічы амаль на самай мяжы з Расеяй ён задумаў зрабіць горадам пад назваю «Руская Варшава». Па традыцыі роду князь Марцыян у маёнтку Мікуліна ў 1720 г. фундаваў касцёл Св. Антонія і заснаваў пры ім кляштар бернардзінаў. Таксама выдаткоўваў грошы на касцёл кармелітаў у Вільні — месца супачыву свайго бацькі. 2000 талераў князь запісаў Віцебскаму дамініканскаму кляштару. У 1730 г. ён атрымаў пасаду ваяводы віцебскага, і 7 лютага 1731 г. адбыўся святочны ўезд ваяводы ў горад: «У ***9 гадзін раніцы ваявода на багата ўпрыгожаным турэцкім кані, якога вялі лёкаі ў турэцкіх касцюмах у суправаджэнні войска, сяброў і служак, пад гучныя залпы гармат выехаў са свайго палаца...»***. У другой палове 1730-х гадоў Марцыян Агінскі амаль што адышоў ад спраў палітычных, меў асобны палац у віцебскіх Лукішках, аднак жыў пераважна ў маёнтку Марцыянава недалёка ад Віцебска. Ад чатырох шлюбаў ён меў пяць сыноў і пяць дачок. Яго жонкі — Тарэса Бжастоўская (1701 г.), Тарэса Тызенгаўз (1723 г.), Крысціна Абрамовіч (1733 г.) і Тэкля Ганна Лярская (1745 г.). У Віцебскім езуіцкім касцёле ваявода зрабіў фамільную грабніцу. Тут былі пахаваны дзве ягоныя жонкі — Тарэса з Бжастоўскіх, дачка трокскага кашталяна Яна Уладзіслава (памерла ў 1721 г.), і Хрысціна з Абрамовічаў (памерла ў 1738 г.). Сам князь памёр 29 кастрычніка 1750 г., пахаваны ў Віцебску ў склепе езуіцкага касцёла (касцёл зруйнаваны ў 1920-я гады). Сыны

Марцыяна Станіслаў, Францішак Ксаверы, Тадэвуш Францішак, Казімір, Ігнацы — ад шлюбу з Тарэсай з Бжастоўскіх. Францішак Ксаверы ў 1733 г. у Варшаве ўступіў у ордэн езуітаў, быў рэктарам паслядоўна Віленскага, Віцебскага і Менскага езуіцкіх калегіумаў. У першай палове XVIII ст. Марцыян Міхал набыў Залессе, якое запісаў у спадчыну апошняй жонцы Тэклі Ганне Лярскай (фон Ляр), пасля смерці якой Залессем стаў валодаць сын ваяводы ад першага шлюбу Тадэвуш Францішак.

**Князь Тадэвуш Францішак Агінскі** (1712—1783) — Вялікі пісар літоўскі, кашталян трокскі, ваявода трокскі і віцебскі, староста ашмянскі, ветборскі і пшэвальскі.



***Князь Тадэвуш Францішак Агінскі, ваявода Трокскі***

Першая жонка — княгіня Ізабэла Радзівіл (сыны Андрэй і Францішак Ксаверы), другая — Ядзвіга Залуская, за якой атрымаў рэтаўскі надзел на Жмудзі (г. Рэтаў у Летуве). Яго галоўнымі рэзідэнцыямі былі Маладэчна і в. Ганута. Валодаў Лучаямі, Тадулінам, Ізабэлінам (названы ў гонар першай жонкі), Залессем, Аборкамі. Пасля смерці Тадэвуша яго маёмасць перайшла ў спадчыну сынам. Залессе атрымаў Францішак Ксаверы.

*Каб лепш зразумець учынкі, паводзіны і характар Міхала Клеафаса Агінскага (унука князя Тадэвуша), тыя прыклады з гісторыі роду Агінскіх, на якія ён, магчыма, абапіраўся, далей даецца невялікі аповяд жыцця Тадэвуша. Ён зроблены як кароткі пераказ працы Казіміра Барташэвіча «Тадэвуш Агінскі і яго дыяруш 1712—1783 гг.», 1914 г., скарочаны.*

Нарадзіўся 26 жніўня 1712 г. У 20 гадоў — віцебскі дэпутат на Варшаўскім сейме 1732 г. (актыўна ўдзельнічаў у яго зрыве; як піша сам князь Тадэвуш у сваім дыярушы, ***«у рэспубліцы такіх скандалаў не было»*** ), затым — на сейме 1733 г. як дэпутат ад Браслаўскага павету. Калі пачалася барацьба за трон паміж Аўгустам III і Ляшчынскім, князь быў на баку апошняга. На прымірэнчым сейме 1736 г. (пасля ўступлення на трон Аўгуста III) ён як віцебскі дэпутат абраны ў Літоўскую камісію, якая абмяркоўвала павелічэнне сродкаў на войска Рэчы Паспалітай. Хутка князь атрымаў пасаду Вялікага пісара літоўскага.

Ажаніўся з княгіняй Ізабэлай Кацярынай Радзівіл. Заручыны адбыліся ў Лахве 27 лютага 1737 г. у князя Міхала Казіміра Радзівіла, у «Рыбанькі». Шлюб адбыўся ў Карэлічах 22 верасня. У1738 г. Казімір Агінскі з жонкай Разаліяй перадаў у маёмасць свайму брату Тадэвушу Гануту і Маладэчна з фальваркамі. У 1739 г., у час нарады сенату, кароль аддаў кн. Тадэвушу Ашмянскае староства, а да пасады пісара далучыў тытул палкоўніка яго каралеўскай мосці. Уезд Агінскіх на староства Ашмянскае адбыўся 2 траўня 1740 г., калі князь склаў прысягу ашмянскаму земскаму суддзі Барановічу. У той час Агінскія жылі ў Тадуліне, дзе 13 красавіка 1740 г. нарадзіўся іх першы сын Андрэй Марцыян Іахім (імя Андрэй ён атрымаў у гонар благаслаўлёнага Андрэя Баболі — пакутніка часоў казацкіх войнаў). Хрэсьбіны сына адбыліся ў студзені 1741 г., на іх было шмат гасцей, забавы доўжыліся чатыры дні.

На сейме 1744 г. у Гародні князь Тадэвуш быў абраны маршалкам сейму. Сейм так і не вырашыў адно з галоўных пытанняў — аб павелічэнні войска. ***«Мы не хочам ратавацца,*** — казаў маршалак сейму, — ***калі надышла вякамі жаданая пара. Не наракайце ж на нікога —***

***самі па сабе ліце слёзы!»*** Гэта было апошняе яго дэпутацтва — ён стаў сенатарам, а потым, у лістападзе, кашталянам віленскім.

У Тадуліне, у Віцебскім павеце, князь Тадэвуш пабудаваў царкву і базыліянскі кляштар. У 1757 г. кашталян перадаў аднаму сыну — Андрэю — староства Ашмянскае, а другому — Францішку Ксаверыю — Пшавальскае. У гэтым жа годзе ён са сваёй жонкай распачаў будаўніцтва парафіяльнага касцёла ў г. Маладэчне і там жа — кляштара ксяндзоў трынітарыяў. Агінскія ўжо пачалі жыць у Маладэчне, дзе князь Тадэвуш аднавіў для сябе стары палац князёў Збараскіх. 7 лістапада 1761 г. памерла жонка кашталяна, 15 лютага яе пахавалі ў новым касцёле. Праз два гады ў Сенна адбыўся другі шлюб князя з Ядзвігай Тарэсай Залускай, удавой рэтаўскага старасты Кшыштафа Тышкевіча.




*Двор Тадулін, з карты 1743 г.*



*Сядзіба Тадэвуша Фрнацішка Агінскага ў в. Ганута. Малюнак XIX ст. Напалеона Орды*

Рэтаў пераходзіць у маёмасць роду Агінскіх і амаль праз стагоддзе стане месцам нараджэння ўнукаў Міхала Клеафаса Агінскага — апошніх нашчадкаў роду па мужчынскай лініі.

Па смерці Аўгуста III кашталян падтрымаў узыходжанне на каралеўскі трон Станіслава Аўгуста, якога ён потым прасіў аб пасадзе ваяводы трокскага.

За кошт мужа і жонкі Агінскіх 7 кастрычніка 1768 г. з Рыму былі прывезены рэліквіі для маладэчанскага касцёла, а ў 1772 г. у касцёл францысканаў ў Сенна былі прывезены рэліквіі Св. Фартуната. Галоўнай філантрапічнай справай княгіні Ядзвігі Агінскай было заснаванне ў 1766 г. у Вільні дома падкідышаў і сірот, або ўстановы Дзіцяці Езуса.

У пачатку 1770 г. памёр ваявода трокскі Аляксандр Пацей, і 7 красавіка князь Тадэвуш атрымаў чаканую пасаду. Уезд на ваяводства Трокскае адбыўся з вялікай пыхай і шматлікімі панегірыкамі ад святароў. У той час Агінскі жыў ў Гануце, у Ашмянскім павеце, якую выбраў сваёй апошняй рэзідэнцыяй, дзе каля 1765 г. збудаваў палац і сядзібу (зруйнаваныя пасля 1939 г.)

*З Тадуліна на Віцебшчыне месца жыхарства і грамадскіх інтарэсаў роду Агінскіх ізноў змяняецца ў накірунку: Маладэчна, Ганута, Залессе, Ашмяны, Вільня, Трокі (Тракай) і Рэтаў. Род «вяртаецца» ў мясціны, дзе ўзнікла прозвішча роду, — у Летуву.*

З набожных учынкаў апошніх гадоў жыцця князя належыць адзначыць пабудову капліцы Божага Цела ў касцёле Св. Яна ў Вільні. Для гэтага касцёла Агінскаму ў 1780 г. з Рыму былі прысланыя рэліквіі Св.Тэафіла. У склепе капліцы Божага Цела і быў пахаваны ваявода трокскі, князь Тадэвуш Агінскі — ён памёр 25 лістапада 1783 г. у Ганунце.

**Князь Францішак Ксаверы (Станіслаў)** (1742—1814) — малодшы сын Тадэвуша, дзядзька Міхала Клеафаса, стражнік польны літоўскі, кухмайстар Вялікі літоўскі, стараста рэтаўскі і пшэвальскі. Быў барскім канфедэратам, яму належалі Маладэчна, Ганута і Залессе. Меў тытул графа.

Стражнік Агінскі *ў 1771 г. удзельнічаў у тым самым баі пад Сталавічамі ў ноч на 23 верасня, калі трохтысячны атрад канфедэратаў (на чале з гетманам Міхалам Казімірам Агінскім) пацярпеў паразу ад расейскага войска (на чале з Суворавым). Стражнік трапіў у палон. Бацька яго, віцебскі ваявода Тадэвуш Агінскі, даведаўшыся аб* ***«разбітым лагеры войскаў літоўскіх»****, напісаў ліст каралю Станіславу Аўгусту, у якім прасіў за свайго малодшага сына, тлумачачы, што ён* ***«выконваў службу ў суровых умовах свайго камандзірскага становішча»****. Кароль ужо ведаў аб сітуацыі стражніка ад мечніка літоўскага Андрэя Агінскага (брата Францішка) і ў лісце да ваяводы ад 6 кастрычніка пісаў, што ён ахвотна зрабіў* ***«прыстойныя і эфектыўныя крокі да яго*** *(стражніка)* ***асобы»****.*

Залессе Францішка Ксаверыя ўпамінаецца ў інвентарах з XVIII ст. Граф Францішак нашчадкаў не меў і таму перадаў Залессе ў спадчыну свайму пляменніку Міхалу Клеафасу.

**Князь Андрэй (Ігнацы, Еахім, Есафат) Агінскі** (13.04.1740—12.09.1787) — сын Тадэвуша Францішка і Ізабэлы з Радзівілаў, мечнік літоўскі, пасол Рэчы Паспалітай у Вене і Пецярбурзе, сакратар Вялікі літоўскі, каштлян трокскі, ваявода трокскі, стараста ашмянскі (з 1757 г.), гузаўскі, кадарыйскі, мацькоўскі і платэльскі.

Нарадзіўся ў Тадуліне, у Віцебскім ваяводстве. У траўні 1755 г. меў званне палкоўніка (ва ўзросце 15 гадоў), якое яму адступіў дзядзька з боку бацькі — Ігнацы. Вясной 1757 г. яго бацька перадаў яму правы на староства Ашмянскае, а 4 лістапада ён замяніў свайго бацьку ў наглядзе за сеймікам Ашмянскім. У кастрычніку 1758 г. — дэпутат на сейм ад Інфлянтаў. У 1760 г. атрымаў посах Літоўскага трыбуналу як ковенскі дэпутат. Як дэпутат ад Інфантаў пасля Варшаўскага сейму 1762 г. 8 кастрычніка атрымаў званне мечніка літоўскага (ва ўзнагароду за подпіс на маніфесце ў абарону правоў польскага шляхціца Брулова). У час бескаралеўя, у траўні 1764 г., у Варшаве падпісаў канфедэрацыю Чартарыйскіх. На каранацыйным сейме даў прысягу Станіславу Аўгусту.

У 1763 г., 21 ліпеня, Агінскі ажаніўся з Паўлінай з Шэмбекаў у м. Гузаў (каля Медневіц, недалёка ад Варшавы). Паўліна была дачкой Марка Шэмбека, старасты брэсцка-куяўскага, генерал-ад'ютанта, і Ядзвігі з Рудніцкіх. Гэта быў трэці шлюб Паўліны. Першы яна брала з Цэлестынам Лубеньскім (памёр у 1759 г.), другі — з Янам Патоцкім (памёр у 1759 г.). Ад Яна Патоцкага Паўліне перайшло Гузаўскае староства. Сын Андрэя і Паўліны Агінскіх Міхал Клеафас так пісаў потым у сваіх мемуарах:

*«Мая маці, Паўліна, народжаная графіня Шэмбек, была ў першым шлюбе жонкай Лубеньскага, які пражыў мала, у другім — Патоцкага, які пакінуў яе ўдавою праз год, і, нарэшце, майго бацькі, Агінскага... Яна мела ад кожнага з мужоў па аднаму сыну, што было нагодай часта называць яе «маці трох правінцыяў». Мая маці была адной з самых прыгожых спадыняў Польшчы, яе паводзіны былі самыя прыкладныя, яна магла служыць узорам найлепшай жонкі і адной с самых пяшчотных маці».*



*Паўліна з Шэмбекаў, княжна Агінская (партрэт з калекцыі Габрыэлі і Ксаверыя Красінскіх)*

На тыльным баку партрэта Паўліны (захоўваецца ў Польшчы, ва ўласнасці сям'і Красіцкіх) невядомы мастак зрабіў надпіс, які заканчваецца словамі: ***«Паўліна з Шэмбекаў... званая Паннай на Літве, Расеі і Кароне».*** У 1762 г. у Андрэя і Паўліны нарадзілася дачка Юзэфа, а потым, у 1765 г., другое дзіцё — сын Міхал Клеафас.

У 1766 г. па даручэнні сейму князь Андрэй удзельнічае ў працы Камісіі Скарбу Літоўскага (камітэт фінансаў). У 1769 г. ён, па даручэнні сенату, выязджае ў С.-Пецярбург як надзвычайны пасол, дзе прабыў нядоўга — з 30 верасня па 6 кастрычніка, бо не ведаў, што царыца Кацярына I не хоча прымаць ніякіх дэлегацый. За гэтую місію Барскія канфедэраты прызналі Агінскага ворагам і знішчылі яго ўладанні, а кароль Аўгуст, наадварот, надаў Агінскаму тытулы кавалера ордэнаў Белага Арла і Св. Станіслава, а 21 лістапада 1771 г. даў пасаду рэферэндарыя літоўскага

*(рэферэндарый — каронны чыноўнік, які разглядае каралеўскую пошту і падае каралю праекты, скаргі і просьбы насельніцтва).*

У снежні 1771 г. кароль даручае Агінскаму місію надзвычайнага пасла Рэчы Паспалітай у Вене. Пасылаючы князя, кароль спадзяваўся на дапамогу з боку Аўстрыі на карысць дзяржавы і падтрымкі ў справе паяднання барскіх канфедэратаў з тронам. Пасол выехаў з Варшавы ў студзені 1772 г., а ў сярэдзіне лютага быў ужо ў Вене. Аб гэтай вандроўцы ўпамінаў у сваіх мемуарах Міхал Клеафас Агінскі: **«*Ва ўзросце 6 гадоў я, матуля і сястра суправаджалі бацьку... ў Вену. Шлях быў небяспечны, нам надалі эскорт з дзвюх тысяч уланаў на чале з Браніцкім... і на падыходзе да Тыніцу, каля Кракава, нас нагнаў корпус з 500 расейцаў пад камандаю Суворава, ён быў тады яшчэ толькі палкоўнікам*».**

*Яшчэ не раз стрэнуцца Сувораў і Міхал Клеафас Агінскі — у 1793 г. у С.-Пецярбурзе, калі Сувораў ужо быў генералам, і потым, у час паўстання Т. Касцюшкі, але ўжо «па розныя бакі барыкадаў», калі Сувораў 4 лістапада 1794 г. патапіў у крыві паўстанне ў прадмесці Варшавы Празе (за гэта ён атрымаў ад Кацярыны II званне фельдмаршала). Былая афіцыйная савецкая гістарыяграфія, ствараючы нацыянальныя сімвалы (асоба Суворава — адзін з іх), не разглядала пабытовыя, будзённыя дэталі жыцця тых ці іншых асобаў. Таму вельмі цікавыя сведчанні сучаснікаў — дзіцячае ўспрыманне «фігуры Суворава» хлопчыкам князем Міхалам праз вакно карэты, якая рушыла зімой 1771 г. у Вену:*

**«*...Асоба Суворава ўразіла... Ён сядзеў на дрэнным казацкім каньку. Зламаныя астрогі ягоных ботаў, мундзір, што вісеў на ім, брудны і зашмальцаваны, запэцканы табакай нос, твар не зусім прыгожы, —***

***усе наводзіла на мяне асаблівы страх, і я баяўся на яго глядзець. Але ён вельмі любіў дзяцей і часта даваў мне і маёй сястры цудоўныя яблыкі. Мы іх бралі, адводзячы вочы, каб не спыняць на ім позірку».***

У Вене перамовы дыпламата Андрэя Агінскага з барскімі канфедэратамі (на чале з Міхалам Пацам), пры пасрэдніцтве французскага пасла, не далі выніку. На развітальнай аўдыенцыі (Андрэй выехаў з Вены ў снежні 1772 г.) імператар аўстрыйскі запэўніў пасла, што пастанова трох імперый (Аўстрыі, Прусіі і Расеі) адносна падзелу Польшчы нязменная і супраціў караля Аўгуста толькі пагоршыць сітуацыю. Місія Агінскага скончылася нічым. 5 траўня 1773 г. пасол даваў аб ёй справаздачу сейму, а з 27 красавіка ён ужо быў сакратаром Вялікім літоўскім. У чэрвені Агінскі ўдзельнічаў у тайных канферэнцыях і, як давераны караля, абмяркоўваў на іх формы ўраду краіны пасля падзелу Рэчы Паспалітай. Падзелавы сейм дэлегаваў Агінскага ізноў у Вену (ён быў там да верасня 1774 г.), місія якога была паспяховай. За гэта падзелавы сейм прызначыў Агінскаму староствы Гузаўскае (з зямлі Сахачэўскай), Кадарыйскае, Мацькоўскае і Платэльскае (у Трокскім ваяводстве). У ліпені 1775 г. князь Андрэй стаў дэпутатам ад Трокскага ваяводства. Агінскі быў адным з заснавальнікаў масонскай ложы «Сябры дасведчаных», ператоранай у ложу «Рыцары Св. Карла». 13 траўня 1778 г. ён як кашталян трокскі ўвайшоў у склад Сената, а са снежня 1783 г. ён ужо ваявода трокскі. У 1775 г. бяздзетная цётка Алена Агінская перапісала на Андрэя ў запавеце Сакалоўскія землі на Падляссі і фальварак Скандайтэ на Жмудзі, якія прылягаў да Платэльскага староства, а ў лістападзе 1783 г. ён атрымоўвае па спадчыне ад бацькі комплекс Ізабэлінскіх земель у Ашмянскім павеце. У Гузаве, у сваёй рэзідэнцыі, Агінскі

заняўся паляпшэннем гаспадаркі і ў 1783 г. правёў рэформу па падзелу зямель, іх захаванні і меліярацыі. У 1786 г. у Варшаве быў выдадзены яго «Інструктаж па эканоміцы для людзей, якія знаходзяцца на гаспадарскай службе...». 12 верасня 1787 г. князь Андрэй Агінскі памёр ў Гузаве, яго жонка Паўліна спачыла праз 10 гадоў, абое пахаваны ў кляштары францысканцаў у Медневіцах.



*Кляштар у Медневіцах (недалёка ад Гузава)*

# КНЯЗЬ МІХАЛ КЛЕАФАС

У 1765—1833 гг. — мечнік літоўскі, дыпламат Рэчы Паспалітай, падскарбі Вялікі літоўскі, удзельнік паўстання Т. Касцюшкі 1794 г., дзеяч польскай эміграцыі, сенатар Расейскай імперыі, тайны дарадца Аляксандра І, кампазітар і мемуарыст.

Нарадзіўся **25 верасня** (па старым стылі) у м. Гузаў (недалёка ад Варшавы ў гміне Віскіткі, Рэспубліка Польшча). Праз месяц быў ахрышчаны ў Віскіцкім касцёле, аб гэтым у кнізе хрышчэнняў запісана: ***«У Гузаве, дня 26 кастрычніка, я, Адам Маркевіч, прапазыт віскіцкі, ахрысціў дзіця, якому нададзены імёны: Клеафас, Міхал, Францішак, Фелікс, Антоні, Ігнацы, Юзаф, Тадэвуш, — сына вяльможнага пана графа Андрэя Агінскага, мечніка Вялікага княства Літоўскага, гузаўскага старасты, і Паўліны з Шэмбекаў, яго законнай жонкі. Хроснымі бацькамі былі вяльможны пан Юзаф Сяменьскі, кашталян раўскі, і вяльможная пані Барбара з Гаеўскіх, Радайшчэўская».***

Гэта было другое дзіцё ад шлюбу Андрэя і Паўліны Агінскіх. Першае — дачка Юзэфа — нарадзілася ў 1762 г. (у першым шлюбе сястра князя Міхала выйшла замуж за Ігнацыя Агінскага, старасту дарсуніскага, у другім — за Яна Лапацінскага, старасту мсціслаўскага, а ў трэцім была за Ігнацыем Шышкам, гербу «Адынец».. Яна памерла ў 1841 г.). У князя Міхала ад папярэдніх шлюбаў яго маці былі і два зводныя браты — граф Фелікс Лубенскі і Прот Патоцкі.

З мемуараў Міхала Клеафаса Агінскага: ***«Я з'явіўся на свет у эпоху, якая прадказвала маёй Радзіме змрочную будучыню. Грамадзянскія войны ўжо разбурылі Польшчу, і я добра памятаю, што, калі мне было каля 4 гадоў, ужо бачыў ў нашым доме ў***




*Гузаў на карце*

***вёсцы*** [г. зн. у Гузаве — аўт.], ***як з'яўляліся на чарзе то расейскія, то канфедэрацкія атрады, шукаючы адзін аднаго; яны трывожылі мае дзіцячыя гульні, наводзілі страх на жыхароў і разбуралі нашыя вёскі...»***

За год да нараджэння М. Кл. Агінскага, у 1764-м., на сойме пад уплывам Расеі каралём і Вялікім князем быў абраны Станіслаў Аўгуст Панятоўскі — фаварыт Кацярыны II. Рэформы, распачатыя Чартарыйскімі (адмена liberum veto, эканамічныя навацыі, павелічэнне арміі і інш.), занепакоілі Расею, і ў гэтым жа годзе яна падпісала дамову з Прусіяй, дзе абедзве імперыі абавязаліся не дапускаць ніякіх палепшанняў у Рэчы Паспалітай і трымаць яе ў стане анархіі.

*У 1765 г. у маёнтку дробнага шляхціца Антонія Казлоўскага, каля г. Прапойска (зараз г. Слаўгарад), бавіць дзяцінства васьмігадовы хлопчык* **Юзаф**, *які потым будзе вучыцца ў Варшаве, там жа спяваць салістам у хоры і граць арганістам у касцёле Св. Яна. У гэтым жа годзе ў Варшаўскай Рыцарскай школе пачынае вучыцца дзевятнаццацігадовы юнак* **Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка**, *які прыехаў сюды з бацькоўскага фальварка Мерачоўшчына, што каля Косава (зараз Івацэвіцкі раён).*

У **1769 г.** хлопчык Міхал разам з бацькамі сустрэўся на адным з прыёмаў у графіні Занусі з каралём Аўгустам, якому «здаваў іспыты» па Святому пісанню і геаграфіі. З мемуараў М. Кл. Агінскага: ***«Ён запытаў у мяне, што я буду рабіць, калі вырасту. Я адказаў, што хацеў бы служыць маёй Радзіме і майму каралю, але дадаў, што не хачу быць каралём, бо кажуць, што вы вельмі нешчаслівыя. Гэты адказ выклікаў слязу ў Станіслава Панятоўскага».***

У **1771 г.**, падчас знаходжання Андрэя Агінскага ў Аўстрыі, Міхал жыве ў Вене. Для свайго сына бацькі знаходзяць настаўніка-гувернёра, француза **Жана Ралея** (1735—1808), які да гэтага быў выхавальнікам эрцгерцага Леапольда (будучага імператара аўстрыйскага). На працягу 11 гадоў Ж. Ралей будзе жыць у Гузаве, выхоўваць і вучыць



*Фальварак Мерачоўшчына каля Косава*



*Палац Андрэя і Паўліны Агінскіх у Гузаве, малюнак Юзафа Цэльмоньскага 1865 г.*

князя Міхала французскай мове, батаніцы з элементамі агракультуры, гісторыі, геаграфіі, французскай і лацінскай літаратуры, геаметрыі, алгебры, эканоміцы, праву, паэзіі і красамоўству, заканадаўству, камерцыі і навуцы кіравання. З мемуараў Агінскага пра гады навучання: «***Мяне не прымушалі да цяжкай і луднай працы,... методыка, якую выкарыстоўваў настаўнік, дазваляла мне разглядаць вучобу як забаву,... ён вучыў мяне, больш тлумачачы, чым прымушаючы чытаць,... сваёй мяккасцю і прыветнасцю характару ён хутка заваяваў мой давер і пяшчотную прыхільнасць***».

*І. Г. Песталоцці (Pestalozzi, 1746—1828), заснавальнік тэорыі пачатковага навучання, быў на 11 год маладзейшым за Ж. Ралея і ў той час, напэўна, толькі распрацоўваў сваю тэорыю, а Ж. Ралей ужо ва ўсю карыстаўся у Гузаве на занятках з маленькім князем Міхалам сваёй уласнай методыкай навучання.*

***«Мой настаўнік удыхаў ў мяне ідэі свабоды, якія грунтаваліся на ідэях хрысціянства, што прымушаюць глядзець на чалавека як на брата. Аднойчы, калі, раззлаваўшыся, я аблаяў і ўдарыў аднаго са слугаў сваіх бацькоў, ён загадаў мне цалаваць таму ногі ў прысутнасці іншых. Мне тады было каля 10 гадоў...»***

*Міхалу-вучню пашанцавала на настаўніка — педагога-эрудыта (бібліятэка Ж. Ралея ў Гузаве налічвала 3 тыс. паасобнікаў), шчырага і добрага чалавека, які перадаў вучню веды і ідэалы эпохі Асветніцтва і склаў светапогляд князя Міхала — арыстакрата. Як удзячны вучань, ва узросце 57 гадоў, Агінскі, жывучы ў Залессі, ушанаваў памяць аб сваім настаўніку мемарыяльным каменем з надпісам на латыні. Камень дагэтуль знаходзіцца ў парку сядзібы.*



***Палац Агінскіх у Гузаве, сучасны выгляд***



*Сігнатура настаўніка Ж. Ралея на каталогу кніг Бібліятэкі князя Андрэя Агінскага*

Акрамя Ж. Ралея Міхал вучыўся нямецкай мове і арыфметыцы ў немца Штобе, танцам і пісьму — у француза Шыле, нумізматыцы — у каралеўскага сакратара Альбертрандзі, лацінскай мове і матэматыцы яго вучыў абат-езуіт Кадэ.

У **1773 г**. бацька Міхала запрасіў з Варшавы 16-гадовага арганіста і скрыпача **Юзафа Казлоўскага** ў якасці настаўніка музыкі для сваіх дзяцей — дачкі Юзэфы і сына Міхала. Тры гады Ю. Казлоўскі жыў ў Гузаве ў сям'і Агінскіх.

*Далей Юзаф вырашыў памяняць і грамадзянства, і кар'еру музыкі на іншую. У 1786 г. ён уступае ў расейскае войска (полк драгунаў), прымае ўдзел ў расейска-турэцкай вайне, дзе быў ад'ютантам князя Далгарукага. Даслужыўся да рангу маёра. У 1790 г. ён служыць пры двары графа Пацёмкіна, фаварыта Кацярыны II.*

**1776 г. — Т. Касцюшка** *ад'язджае ў ЗША, дзе ў чыне палкоўніка ўдзельнічае ў вайне за незалежнасць Паўночных Штатаў.*

***1778 г.*** *— у італьянскай Венецыі ў сям'і карчмара Нэры нараджаецца дачка* **Марыя.**

У **1782** г. Ж. Ралей завяршае адукацыю Міхала (якому споўнілася 17 гадоў) і застаецца жыць у Гузаве. Але прага да ведаў у князя Міхала, закладзеная настаўнікам, застанецца — шмат пазней ён самастойна будзе вывучаць курс астраноміі, а ў 1789 г. у Гамбургу стане наведваць курсы хіміі.

*У гэтым жа годзе швейцарац-гувернёр Лагарп вучыць 15-гадовага царэвіча Аляксандра (будучага імператара). Адам Чартарыйскі ў сваіх мемуарах напіша:* ***«ніхто і ніколі не прымушаў гасудара завяршаць вывучанне якой-небудзь сур'ёзнай кнігі».***

# Палітык

У **1786 г.** М. Кл. Агінскі быў абраны па рэкамендацыі свайго бацькі, трокскага ваяводы, дэпутатам ад Трокскага ваяводства на сойм — парламент Рэчы Паспалітай. У сваіх мемуарах (яны надрукаваны ў часопісе «Спадчына», №6, 1998) Агінскі яскрава перадае падзеі тагачаснага парламенцкага жыцця. На сойме ён быў абраны сябрам Камісіі скарбу. Пасля сойму наведаў бацькоў ў Гузаве і праз тры месяцы накіраваўся ў Гародню, каб выконваць функцыі скарбовага ўпаўнаважанага Літвы: ***«Бацькі далі мне 50 залатых чырвонцаў, дзядзька падараваў двух коняў і стары экіпаж... Я павінен быў правесці першыя месяцы ў Гародні»***. Аб працы упаўнаважанага Агінскі ўспамінае: ***«Калегі, сярод якіх я быў самы малады, заўважылі ў мяне шмат стараннасці і актыўнасці і нагружалі мяне працай, ад якой я адчуваў вялікае задавальненне, калі трэба было выпраўляць альбо ўрэгуляваць рахункі і паляпшаць працу розных галінаў грамадскіх прыбыткаў...»***

*Бачна, што маладому князю падабаецца займацца дзяржаўнымі справамі, якія ён добрасумленна выконвае. Але ў працы бываюць і «шэрыя моманты», на якія Міхал (здольны вучань Ж. Ралея) рэагуе па-мастацку — у стылі паэтычнай сатыры:*

***«Але я адчуваў вялікую агіду да судовых працэсаў,... якія мелі дачыненне да скарбу Літвы... здзекі ды інтрыгі суддзяў, якія заўсёды былі замешаныя ў кантрабандзе, махлярстве,... нудныя формы працэдураў і балбатанне адвакатаў рабіліся для мяне невыноснымі... У моманты чакання і суму, слухаючы істца, я браў ў рукі аловак і складаў на адваката эпіграму... з 12 вершаў».***



*Партрэт М. Кл. Агінскага, канец XVIII ст. Мастак Джозэф Грасі*

Праз некаторы час князь Міхал быў накіраваны на праверку ўсіх мытных пастоў на мяжы Літвы з Расеяй — ад Палангі да Берасця. У час гэтай экспедыцыі ўпаўнаважаны камісіі наведаў усе пасты, выяўляючы злоўжыванні і пакідаючы неабходныя інструкцыі і распараджэнні. ***«Я сам зрабіў тапаграфічныя мапы той часткі Літвы, якую толькі што перасёк, на якіх указаў усе памежныя пасты і ўсе дарогі, якія туды вялі»***.

Па вяртанні ў Гародню, у час працы Камісіі скарбу, Міхал Клеафас публічна выкрыў незаконныя злоўжыванні ў справе адбіцця новых медных манет, якая рабілася па тайным распараджэнні расейскага пасла. Каб уціхамірыць маладога дэпутата, нават звярталіся па дапамогу да яго бацькі Андрэя. Бацька ў лісце да сына пісаў: ***«... не адступай ад шляху гонару і цноты. Палажыся на Бога, павbooжай законы, кіруйся ў дзеяннях сваім сумленнем»***. Спробы паслухмянай камісіі прыняць рашэнне на карысць расейскага пасла праваліліся, закон быў на баку «бунтара», і Міхал пры галасаванні выкарыстаў сваё «права вета».

У **1787 г**. памірае бацька Агінскага. Маці яго разам са старэйшым сынам Ф. Лубенскім і Ж. Ралеем застаецца жыць у Гузаве.

З **1788 г**. Міхал удзельнічае ў працы 4-гадовага сойму і канчаткова вызначаецца як прыхільнік Караля Аўгуста, атрымоўвае ўзнагароды — ордэны Св. Станіслава і Белага Арла.

**17 траўня 1789 г.** ён жэніцца з **Ізабэлай Лясоцкай** (1764—1852). Шлюб адбыўся ў маёнтку цесця Антонія Лясоцкага (цеханавецкага ваяводы) у Бжэзінах пад Варшавай. Ад гэтага шлюбу два сыны — **Тадэвуш Антоні** (1789—1844) і **Францішак Ксаверы** (1801—1873). У жніўні месяцы атрымаў ганаровае званне мечніка літоўскага.



*Міхал і Ізабэла з Лясоцкіх Агінскія, канец XVIII ст.*

У **1790 г.** прызначаны надзвычайным паслом Рэчы Паспалітай ў Галандыю. У чэрвені разам з жонкай і сакратаром пасольства А. Мідлтанам выязджае ў Гаагу.

Гэты горад быў дыпламатычным цэнтрам Траістага саюза. У Гаазе Міхал Клеафас Агінскі быў прадстаўлены прынцу і прынцэсе Аранскім і еўрапейскім дыпламатам (пачынаючы з гэтай вандроўкі ён вядзе дзённік).

З **9 снежня 1790 г.** па **25 студзеня 1791 г.** адбылася паездка Міхала Клеафаса ў Англію з дыпламатычнай, сакрэтнай місіяй *(каб надаць ёй прыватны, свецкі характар, Міхал едзе з жонкай Ізабэлай)*. Праліў Ла-Манш яны праплылі за 18 гадзін, столькі ж ехалі ад порта Дуўра да Лондана, дзе спыніліся ў гатэлі па вуліцы ПЭЛ-МЭЛ (за 50 фунтаў у месяц, экіпаж для выезду каштаваў 50 шылінгаў у дзень). На наступны дзень на вячэры ў прымаса Польшчы Агінскі сустрэўся з афіцыйным паслом РП Букатым і Адамам Чартарыйскім.

Каб не вылучацца сярод лонданцаў, «сакрэтны дыпламат» Міхал змяніў свой гардэроб і звярнуўся дзеля гэтага да прыватнага краўца прынца Уэльскага. Агінскі ў сваіх запісах скардзіцца на тагачасныя «мас-медыя», якія падаюць аб ім несапраўдную інфармацыю — у газетах ён прачытаў аб ***«загінуўшых мужы і жонцы Агінскіх»*** *у* час нядаўняга шторму ў Ла-Маншы.

Міхал Клеафас Агінскі быў прадстаўлены каралю Георгу III, меў гутарку з ім і з каралевай, якая ўпамінала пра «дзядзьку» Міхала Казіміра Агінскага. Міхал Клеафас прысутнічае на пасяджэннях ангельскага парламенту, сустракаецца з герцагамі ўэльскім, йорскім і кларэнскім. З прэм'ер-міністрам Уільямам Піттам Агінскі абмяркоўвае дыпламатычныя пытанні, а ў г. Баце наведвае свайго знаёмага — ангельскага дыпламата Эварта, які і быў галоўным арганізатарам паездкі Агінскага ў Англію (па вяртанні ў Лондан на экіпаж Міхала напалі рабаўнікі).

Апошнія дні ў Англіі ён наведвае тэатры (слухае спявачку Марычэллі і адзначае, што ў тэатральных ложах шмат нявыхаваных людзей з амбрэ ад выпітага рому), слухае піяніста Клеменці, наведвае сабор Св. Паўла, Вестмінстэрскае абацтва, батанічны сад К'ю-Гардэнс, прытулак для вар'ятаў Бедлам, Брытанскі музей і заказвае сабе скрыпку. Шлях назад праз Ла-Манш, дзякуючы спадарожнаму ветру, заняў дзве гадзіны. Пакінуўшы замест сябе ў Гаазе як паверанага А. Мідлтана, Міхал Клеафас Агінскі, па сямейных абставінах, адмаўляецца ад пасады пасла і вяртаецца ў Варшаву.

**25 студзеня 1791 г.** Агінскі робіць справаздачу аб сваёй ангельскай місіі на пасяджэнні Дэпутацыі замежных спраў.

**3 траўня 1791 г.** Вялікі сойм прыняў Канстытуцыю, якая была першай у Еўропе і другой ў свеце (пасля ЗША). Агінскі казаў, што яе прыняцце спазнілася на паўтара года.

У Магілёве ён сустракаецца з ***«гэтым надзвычайным чалавекам»*** — князем Р. Пацёмкіным, які ехаў праз Магілёў на мірныя перамовы з Турцыяй.

*З гэтым князем быў знаёмы былы настаўнік музыкі Міхала Клеафаса Агінскага* **Юзаф Казлоўскі**, *які служыў пры двары фаварыта Кацярыны II. У* **1791 г.** *па парадзе Пацёмкіна Юзаф пераязджае на сталае жыццё ў Пецярбург, дзе служыць пры імператарскім двары дырэктарам царскіх аркестраў і складае музычныя творы. Напэўна, у час гутарак з Пацёмкіным (якія вяліся не пра палітыку, а болей пра музыку і жывапіс) былы вучань ўспамінаў і пра свайго гузаўскага настаўніка музыкі...*

Каб мець права ўезду ў свае ўладанні на Беларусі (яны пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай знаходзіліся на тэрыторыі Расейскай імперыі), Міхал Клеафас Агінскі ў **чэрвені 1791 г.** даў у Магілёве прысягу Кацярыне II. Зямельная ўласнасць Агінскіх на Меншчыне і Мсціслаўшчыне была ў заняпадзе — на яе пасля падзелу быў накладзены секвестр (забарона на карыстанне), таму Міхал Клеафас Агінскі займаўся тут маёмаснымі справамі — спачатку справамі маёнткаў свайго дзядзькі Фр. Ксаверыя (у Маладэчне, Ганупе, Залессі), а затым фінансавым дагаворам **(12.12.1794)** з Міхалам Казімірам Агінскім, які жыў у Слоніме.

*Паводле дагавору гетман Агінскі перадаваў Міхалу Клеафасу амаль усе свае літоўскія ўладанні пры ўмове згашэння 8 млн. злотых пазыкаў гетмана.*

Па ўспамінах Міхала Клеафаса Агінскага, у гэтым жа 1791 г. ім быў напісаны **першы паланэз** «сі-бемоль-мажор» (які не захаваўся) і быў запрошаны, у якасці настаўніка, венскі кампазітар і піяніст Ёзэф Вёльфль (1773—1812), вучань Леапольда Моцарта.

**1792 г.** — у час Таргавіцкай канфедэрацыі (яе ўдзельнікі скасоўвалі Канстытуцыю 3 траўня і звярнуліся па дапамогу да Кацярыны ІІ) Міхал Клеафас Агінскі эміграваў на кароткі час у Прусію. Яго маёнткі былі канфіскаваныя таргавічанамі ў час вайны (*Кацярына ІІ ўвяла рэгулярныя войскі ў Рэч Паспалітую*).

*У гэты час у арміі Рэчы Паспалітай супраць таргавічан і расейскіх войскаў ваяваў ужо грамадзянін і брыгадны генерал ЗША Тадэвуш Касцюшка, які вызначыўся як камандзір дывізіі ў бітве пад Дубенкай. 3 жніўня 1792 г. ён узнагароджаны ордэнам Віртуці Мілітары і ўдастоены звання генерал-лейтэнанта. У знак пратэсту супраць змовы караля Аўгуста з таргавічанамі Касцюшка падае ў адстаўку. А канвент Францыі (26 чэрвеня 1792 г.) надае яму званне Ганаровага грамадзяніна Францыі (разам з Дж. Вашынгтонам, І. Песталоцы, Ф. Шылерам і інш.) Напрыканцы 1792 г. ён ужо ў палітычнай эміграцыі ў Лейпцыгу.*

Урэшце Агінскі быў вымушаны вярнуцца з Прусіі і ў Брэсце даць прысягу Таргавіцкай канфедэрацыі.

*Галоўная прычына такога «прыніжанага ўчынку» ў тым, што ўся яго маёмасць на Літве (у Беларусі) была канфіскавана таргавічанамі, у тым ліку і атрыманая ад Міхала Казіміра. У выпадку невяртання маёмасці Агінскага чакала б нявыплата віннасцей, запазыкі і ўрэшце напаўжабрацкае існаванне. Гэта ўжо другі яго «горкі кампраміс» (першы —прысяга ў Магілёве) — Агінскі і пасля дыпламатычнай службы паводзіць сябе як дыпламат, але «за межамі палітыкі» (шукае выйсця «ва ўмовах», а не «ў прычынах») — у клопатах аб маёмасці.*

**12 снежня 1792 г.** — ён у Пецярбурзе па справах сваёй маёмасці, дзе вельмі ветліва быў прыняты пры двары і прадстаўлены Кацярыне ІІ, якая яго сустрэла «паважна і ветліва».

*У сваіх мемуарах Агінскі называе адну з прычын такога прыёму — яго* **паланез «фа-мінор»**, *складзены ў Варшаве на пачатку 1792 г., быў вельмі папулярны ў расейскай сталіцы, пад яго танцавалі тут на ўсіх балях.*



***Імператрыца Расейская Кацярына II***

У размовах з Міхалам Клеафасам Агінскім Платон Зубаў (фаварыт імператрыцы) абяцаў вярнуць канфіскаваныя маёнткі і прапанаваў яму працу ў новым урадзе Рэчы Паспалітай — пасаду Вялікага падскарбія літоўскага (*міністр фінансаў*).

*Гэта быў звычайны «палітычны гандаль», дзе паміж іншымі ўмовамі была і адмова Міхала Казіміра Агінскага ад пасады Вялікага гетмана на карысць прыхільніка Кацярыны II Сымона Касакоўскага, лідэра таргавічанаў у Вільні.*

**7 траўня 1793 г. у** Варшаве Агінскага зацвярджаюць Вялікім падскарбіем літоўскім (пад уплывам расейскага пасла Сіверса). Як дэпутат сойму (24 чэрвеня — 23 лістапада, Гародня) падскарбі Міхал Клеафас Агінскі часта адсутнічае на пасяджэннях, рэдка выступае, спрабуе лавіраваць, але ўрэшце быў вымушаны паставіць подпіс за другі падзел Рэчы Паспалітай.

**15 лютага 1794 г.** ён прымае ў Сакалове (на Падляшшы) караля Станіслава Аўгуста, які вяртаўся ў Варшаву з Гародні, і канфідэнцыяльна паведамляе яму пра намер эміграваць. Затым князь Міхал накіраваўся ў Вену, але ў Аламунцы (Польшча) яго затрымаў ліст ад караля з просьбай вярнуцца ў Варшаву.



*Тадэвуш Касцюшка*



*Стафан Грабоўскі*

У канцы сакавіка Агінскі ў Навагрудку, дзе давераны чалавек прывозіць яму копіі кракаўскага акта паўстання.

**24 сакавіка 1794 г.** *на Кракаўскім рынку Т. Касцюшка дае прысягу на вернасць паўстанню і робіцца яго кіраўніком.*

Агінскі піша жонцы ў Варшаву з просьбай неадкладна ехаць ў Вільню, куды ён сам праз час прыбыў. З мемуараў М. Кл. Агінскага: **«20 красавіка** ***афіцэр сёмага палка Нялепец данёс мне, што рэвалюцыя выбухне ў Вільні ў канцы 23-га...»***

*За два дні да гэтага падпалкоўнік* **Стафан Грабоўскі** *ў Смаргонях (недалёка ад Залесся) заклікае 7-мы пешы літоўскі полк да выступлення супраць расейцаў. Грабоўскі папрасіў падтрымкі ў смаргонцаў і атрымаў яе. 20 красавіка на чале 800-асабовага атраду пры дзвюх гарматах рушыў паскораным маршам са Смаргоняў праз Жупраны і Ашмяны на Вільню.*

У мэтах бяспекі Агінскі вырашае вывезці жонку, слуг і багаж з Вільні. Але перад гэтым, ***«каб не выглядаць як чалавек, які паспешліва***

***ўцякае, я пайшоў на вечар 21-га ў дом паніВаладковіч, куды былі запрошаны генерал Арсеннеў, маскоўскі камендант*** [Вільні — аўт.], ***і некалькі афіцэраў галоўнага штаба, і там упэўніўся, што яны не маюць нават падазрэння аб катастрофе, якая чакала іх у бліжэйшыя 24 гадзіны...»***.

*Што тут у паводзінах 28-гадовага Агінскага — халодны разлік, юнацкі авантурызм? Ці прага пабачыць апошні акт перад «катастрофай» і адчуць «прыліў адрэналіну»? Ці можа жаданне правесці апошнія часіны свецкага жыцця? Так ці інакш, трэба быць рызыкантам, каб перад паўстаннем апынуцца сярод ворагаў.*

***«На наступны дзень*** [22 красавіка — аўт.], ***а трэцяй гадзіне раніцы, я ўжо быў з усімі сваімі экіпажамі на гарадзенскай дарозе...»***

*А палове першай ночы* **23 красавіка ў Вільні стрэліла гармата** — *сігнал для пачатку атакі паўстанцаў.*

**Ноч з 22 на 23 красавіка** Агінскія правялі **ў Алькеніках** (7 км ад Вільні) у графа Граноўскага. **23 красавіка** Агінскі атрымаў з Вільні запіску ад Антонія Ляхніцкага.

*А. Ляхніцкі быў у той час віцэ-прэзідэнтам Вільні, а пазней, пасля 1802 г., ён будзе даверанай асобай Агінскага па юрыдычных справах.*

Тэкст запіскі князь Міхаіл прыводзіць у сваіх мемуарах: ***«Мы правялі страшную ноч. Кроў яшчэ цячэ па вуліцах. Ужо няма маскалёў у Вільні. Адны забітыя, другія ў няволі. Сярод апошніх генерал Арсеннеў і некалькі афіцэраў. Маскалі, што здолелі ўцячы, сабраліся за горадам і паляць усё, што сустракаецца па дарозе. Касакоўскі*** [гетман — аўт.] ***арыштаваны і прыгавораны да смерці. Крыкі радасці чуюцца ва ўсіх частках горада...»***

**29 красавіка** Агінскі ў Вільні і складае з сябе паўнамоцтвы падскарбія.



*Ратушавы пляц у Вільні*

*Агінскі быў пастаўлены ва ўмовы выбару — ісці былым «шляхам кампрамісаў» ці «прыняць удзел у радыкальнай змене «прычынаў». Ён выбірае апошняе і з гэтага моманту становіцца па-за законамі чужой дзяржавы — выбірае шлях паўстанца, страчваючы сацыяльны статус, маёмасць, але не губляючы гонару. Напэўна, у гэты час ён ўспамінае запавет свайго бацькі:* ***«Не адступай ад шляху цноты і гонару... кіруйся ў дзеяннях сваіх сумленнем».***

***«Я не быў дапушчаны... да таямніц тых, хто падрыхтаваў рэвалюцыю, і нават прызнаюся, што, ведаючы нашыя слабыя запасы і велізарныя сілы, якія можна было выкарыстаць для нашай пагібелі, я не ашукваў сябе дарэмнымі надзеямі і не лісліві́ў сабе, што вынік будзе адпавядаць чаканням патрыётаў, але, нягледзячы на гэта, катэгарычна вырашыў не пакідаць краіну, падзяліць небяспеку з маімі суграма-дзянамі і хутчэй загінуць са зброяй ў руках, чым зганьбіцца, старонячыся ад удзелу ў патрыятычным запале...»***

*Далейшыя падзеі жыцця паўстанца Агінскага дадзены коратка, у тэмпе маршу — «allegro impetuoso» (хутка і бурліва).*

# Паўстанец

**1794, ТРАВЕНЬ**

**6** — увайшоў ў склад Вышэйшай Літоўскай Рады (часовы ўрад паўстання).

Каб прадухіліць беспарадкі ў горадзе, па загаду Рады, як дэлегат Віленскай камісіі парадку, выступае перад 30-тысячным сходам жыхароў (на Пагулянцы пад Вільняй).

**11** — як дэлегат Рады разам з Тамашам Ваўжэцкім вёў агляд гвардыі на Пагулянцы.

Прызначаны Радай камандзірам атрада стральцоў, ахвяруе 118 тысяч злотых і на іх стварае (экіпіруе, праводзіць вучэнні) атрад з 480 чалавек. 100 тысяч злотых ахвяруе на ўзбраенне коннага палка **К. Нагурскага.**

*З гэтым прозвішчам мы яшчэ сустрэнемся у іншых абставінах у іншай краіне і праз некаторы час.*

**Пасля 14** — з дазволу Рады і з пашпартамі суправаджаў жонку ў спакайнейшае месца — маёнтак Міхала Казіміра Агінскага Седльцы пад Варшавай. На памежнай станцыі Шчэрбы (каля Гародні) яе мытнік Гушча затрымлівае экіпажы і абвінавачвае Агінскага ў здрадзе і ў спробе ўцячы ў Прусію.

*Гэтага мытніка Агінскі некалі зняў з пасады (калі як камісар скарбу Літвы інспектаваў мытні ад Палангі да Бярэсця ў 1786 г.), і вось гэты Гушча вырашыў паквітацца, бо быў, паводле слоў Агінскага, чалавек* ***«помслівы і грубы»****. З таго часу засталася ў народзе прымаўка: «Шляхціц Гушча да прусаў не пушча».*

Агінскі быў нават арыштаваны ў Гародні, але ў хуткім часе з яго знялі беспадстаўныя абвінавачанні, ён вярнуўся ў Вільню, дзе Рада афіцыйна выказала яму давер (жонка накіравалася ў Седльцы).



Якуб Ясінскі




Пячатка паўстанцаў

**ЧЭРВЕНЬ**

Якуб Ясінскі зацвярджае праект Агінскага (партызанскі рэйд да Менску), мэтай якога было дайсці да зямель Агінскіх на Магілёўшчыне, каб далучыць да паўстання 12 тыс. сялян. 300 стральцоў атрада Агінскага (павятовага генерал-маёра) і 200 коннікаў маёра Корсака сакрэтна пакідаюць Вільню. Першым горадам, які захапіў атрад, быў Валожын, затым атрад увайшоў у Івянец, дзе расейскіх войскаў не было .

**4** — з рапарту генерал-маёра Няплюева, губернатара Менска, князю Рэпніну *(на мове арыгінала)*: ***«4-го числа сего июня бунтовщики под командою Огинскаго и Сулистровского, в немалом числе регулярных и прочих, прокрались лесами в границы наши и напали на местечко Ивениц».***

**5 — у Івянцы** Міхал Клеафас Агінскі зачытаў жыхарам зварот да насельніцтва Меншчыны («Універсал»), заклікаючы іх падтрымаць паўстанне. Пад зваротам подпіс: ***«Міхал Агінскі, літоўскага корпусу шэф, камандуючы вольнымі войскамі»***.

У Івянцы ў вайсковых складах расейскай арміі паўстанцы знайшлі мноства амуніцыі, сукна і іншых рэчаў, а таксама шмат вырабаў з каштоўных металаў. Даведаўшыся, што каля Менска яго чакаюць моцныя сілы непрыяцеля, Агінскі загадвае ўзяць усё са складоў, загрузіць на падводы і рушыць, са зваротам, на злучэнне з паўстанцамі ў накірунку Бакштаў. Абоз складаўся са 170 падводаў. Пасля пераправы цераз раку Бярэзіну доўгі абоз на чале з атрадам падышоў пад **в. Вішнева**, дзе быў атакаваны атрадамі барона Бенігсена і графа Зубава (брат Платона Зубава).

7 — з рапарту Няплюева: « ***Сию минуту получаю от генерала Бенигсена известия, что... их*** [атрад Агінскага — аўт.] ***догнал в местечке Вишневе, отнял пушку, взял в полон двух офицеров и до 50 рядовых, положил более 200 на месте и в том числе первый из них начальник*** [Агінскі — аўт.] ***почитается убитым...»***

З рапарту барона Бенігсена графу М. Зубаву (*на мове арыгінала*): **«*Прибыв я поутру в девять часов к местечку Вишневу, не медля решился атаковать... Сражение... продолжалось до половины двенадцатого, в котором над неприятелем одержана была полная победа, и в величайшей онаго разстройке преследовал я его... далее шести верст... Неприятель принужден был оставить в добычу нам весь свой обоз в числе более двух сот повозок, в коих нашлось множество похищенного в местечке Ивениц*».**

А вось карціна бою з другога боку — Агінскі піша ў мемуарах: **«*...Калі я загадаў усім павозкам спыніцца пасля спуску з гары пад Вішневам і шукаў па мапе дарогу..., значны атрад казакоў разам з палком Мікалая Зубава... напаў... нечакана на нас... Калі я***

***залішне неразважліва высунуўся наперад, кулі прашылі мой капялюш, і я немінуча загінуў бы, калі б афіцэр, па прозвішчу Паўловіч, не ўхапіў майго каня за цуглі і не прымусіў мяне павярнуць назад. У гэтым баі я страціў ўвесь мой багаж, захоплены ў Івянцы, маю касу, якая налічвала больш як 7000 залатых дукатаў, шмат належачых мне каштоўных рэчаў і ўсе мае паперы. Дванаццаць чалавек з кавалерыі, каля 20 добраахвотнікаў, 25 стральцоў і ўсе людзі з маёй прыслугі былі забіты... Мне... ўдалося правесці з сабой каля 150 чалавек..., мае стральцы адступілі ў лясы, а непрыяцельская конніца ішла ўвесь час па баках у нас, каб абкружыць і перашкодзіць нашаму адступленню..., мы на працягу некалькіх гадзінаў адбіваліся ад моцных патрулёў корпуса Цыцыянава. Нарэшце, з надыходам ночы, нам удалося злучыцца з авангардам нашай арміі ў Крэве».***

*Прайграўшы Бенігсену гэты бой, Агінскі праз некалькі гадоў у яго ўсё ж выйграе — у дуэлі на «рамантычным фронце».*

**8** — Агінскі ў галоўнай стаўцы **ў Ашмянах**, дзе ***«генерал Ясінскі і ўсе баявыя афіцэры... прынялі мяне надзвычай па-сяброўску, яны дакаралі мяне за маю смеласць і стараліся суцешыць мяне па з-за тых параз, якія я пацярпеў»***. Праз дзень сюды ж прыйшла і ацалелая частка яго атрада.

**27 — у Вільні** атрымоўвае даручэнне ад генерала М. Вяльгорскага *(новага кіраўніка паўстання)* у якасці яго даверанага кур'ера накіравацца да Т. Касцюшкі ў Варшаву.

**29 — прыбыў пад Варшаву**, дзе сустрэўся з Т. Касцюшкам. ***«Была 5-я гадзіна раніцы, калі мяне ўвялі ў яго намёт, дзе ён спаў на ахапцы саломы...»*** Прачытаўшы

лісты ад Вяльгорскага і рапарты Агінскага ж і Ясінскага аб партызанскім рэйдзе, Касцюшка «*пацісную мне руку і падзякаваў за тое, што я даваў прыклад сваім землякам і аддаўся прафесіі небяспечнай і цалкам для мяне новай...*»



*Т. Касцюшка ў паўстанцкім строі*

Сярод іншага Касцюшка ўхваліў новы праект Агінскага — рэйд на Дынабург, які б адцягнуў на сябе рэгулярныя расейскія войскі, што сцягваліся да Вільні.

**ЛІПЕНЬ**

**19** — Агінскі з атрадам сваіх стральцоў і разам з іншымі паўстанцамі актыўна абараняе Вільню ў час штурму расейцаў.

**ЖНІВЕНЬ**

**1** — пачатак другога рэйду на **Дынабург** (г. Даўгаўпілс, Латвія) — праз Нямечын, Свянцяны і Дусяты. У атрадзе былі тысяча коннікаў і 1500 чалавек пяхоты. Але палова конніцы дрэнна забяспечана, а з пяхоты толькі 300 мелі стрэльбы, астатнія ўзброены пікамі, былі і дзве малыя гарматы. Каб захаваць рэйд у сакрэце, Агінскі пакінуў амаль ўвесь атрад у Дусятах *(Браслаўшчына)*, а з трыма сотнямі кавалерыі выйшаў на бераг Дзвіны (Даўгавы) да Дынабурга. Але паўстанцаў тут ўжо чакалі, і да гораду на падмогу падыходзілі расейскія войскі. Праз некаторы час, так і не пераправіўшыся праз раку, атрад вяртаецца ў Дусяты (але 30 добраахвотнікаў усё ж уварваліся ў горад і выпадкова яго падпалілі).

**11** — Т. Касцюшка адправіў ліст Агінскаму, дзе пісаў: ***«Грамадзянін! Я атрымаў рапарт, які ты мне паслаў з берагоў Дзвіны. Я задаволены, што ты змог здзейсніць мае намеры і што іх вынік адпавядаў нашаму чаканню...»***

Па прыбыцці ў **Дусяты** (праз Езяросы і Ілукшту) паўстанцы даведаліся, што Вільня была атакавана і захоплена расейцамі.

**12** — паўстанне ў Вільні пацярпела паразу, паўстанніцкія (літоўскія) войскі адышлі да Коўна (г. Каўнас, Літва).

У Дусятах Агінскі перадаў камандаванне атрадам Марыконі і вырашыў праз Коўна ехаць у Варшаву да Т. Касцюшкі: ***«Я знайшоў генерала Хлявінскага*** [трэці камандуючы (пасля Вялгорскага) войскамі паўстанцаў — аўт.] ***за тры мілі ад Коўна,... аб'явіў яму аб сваім рашэнні... і пакінуў берагі Нёмана, якія зноў убачыў толькі праз восем гадоў, пасля майго вяртання з эміграцыі, пасля шэрагу няшчасцяў, якіх я, нягледзячы на мае сумныя прадчуванні, ніколі не мог чакаць».***

*Так, недалёка ад Агінтаў — сядзібы яго далёкага продка князя Дзмітрыя Глушонка — заканчваўся шлях паўстанца Міхала Агінскага — сябра Віленскай Вышэйшай Рады, «камандуючага вольнымі войскамі».*

**18** — Агінскі **ў Варшаве**, дзе атрымаў дазвол ад Т. Касцюшкі выехаць у свой маёнтак **ў Саколаве.**

*У гэты ж дзень з Нямірава (Украіна) на Беларусь рушыў са сваім войскам «знаёмец Міхала» — генерал Сувораў, які пасля перамог над паўстанцамі пад Крупчыцамі (каля Кобрына) і пад Бярэсцем (у верасні) будзе месяц чакаць загаду ісці на Варшаву.*

**КАСТРЫЧНІК**

**10** — у баі пад Мацяёвіцамі **паранены Т. Касцюшка** трапляе ў палон.

Агінскі **ў Саколаве** атрымаў вестку аб палоне Касцюшкі і, даведаўшыся, што ў Саколаў рушыць атрад з 500 казакоў, з цяжкасцямі ўсё ж **вяртаецца ў Варшаву**. Кіраўніком паўстання абраны Тамаш Ваўжэцкі, які дазваляе Міхалу Клеафасу Агінскаму накіравацца да атраду генерала Дамброўскага.

**ЛІСТАПАД**

**4** — штурм войскамі Суворава прадмесця Варшавы — Прагі. Згодна з рапартам Суворава, абаронцаў было забіта 13 340 чалавек, 3 тысячы патанулі ў Вісле, 12 860 узята ў палон. Праз некалькі дзён Варшава капітулявала. За перамогу над паўстанцамі генерал-фельдмаршал Сувораў атрымаў ад імператрыцы Кацярыны II беларускія землі (сярод іх Кобрын і Кобрынская воласць) і болей за 25 тысяч душ прыгонных сялянаў.

Агінскі разам з афіцэрамі атраду Дамброўскага прабіраецца на захад (пры сабе мае **пашпарт на імя Міхалоўскага**) і пакідае краіну, якая болей не будзе існаваць. Аўстрыя і Прусія «падзеляць» паміж сабой польскія і частку ўкраінскіх і летувіскіх земляў, а Расея «далучыць»да сябе ўсю Беларусь і большую частку Летувы і Украіны. Кароль Аўгуст стане вязнем.

*Для князя Агінскага пачнецца 7-гадовы шлях выпрабаванняў і прыгод — шлях эмігранта-выгнанніка. Жыццё былога дыпламата і паўстанца ізноў зменіцца — ён стане ўцекачом з рознымі прозвішчамі, «палітыкам без краіны», але не здрадзіць сваім мастацкім захапленням і сваёй звычцы цікавіцца жыццём і запісваць яго падзеі ў свой нататнік. Гэта будзе яго «рэйд эмігранта па Еўропе», які будзе праходзіць па партытуры дыпламатаў Рэспублікі Францыя ў іншым тэмпе — у тэмпе моднага ў тыя часы танца, які меў французскую ж назву GALOP (гэты «рэйд» даецца праз геаграфію краін і гарадоў, дзе быў Агінскі).*

# Эмігрант

**ВЕНА**, Аўстрыя (лістапад **1794 г.**) — М. Кл. Агінскі сустракаецца з жонкай. Сярод венскай знаці ходзяць чуткі, што графіня Ізабэла Агінская «водзіцца з нейкім Міхалоўскім». Праз 10 дзён Агінскія едуць у Венецыю.

**Венецыя**, Італія **(7 снежня)** — атрымаў лісты ад Суворава (з пашпартам) і ад князя Рэпніна з прапановай напісаць Кацярыне II пакаянны ліст. Агінскі адмаўляецца і тым самым пазбываецца ўсёй сваёй маёмасці. Сустракаецца з былымі паўстанцамі.




*Шляхі М. Кл. Агінскага-эмігранта (лістапад 1794—1802 гг.)*

20 снежня ён распавядае ў лісце аб венецыянскім карнавале, тэатрах і аб прыёме ў палацы Дожаў.

*У гэтым жа годзе тут, у Венецыі, былы віленскі паўстанец, эмігрант Каэтан Нагурскі знаёміцца з 17- гадовай прыгажуняй* **Марыяй Нэры**, *дачкой карчмара. Закахаўшыся, Нагурскі адвязе яе праз час у Варшаву, а потым і ў Вільню, ажэніцца з ёй, і Марыя стане Нагурскай.*

**18 сакавіка 1795** М. Кл. Агінскі едзе ў Падую.

З **Падуі** 1 красавіка адпраўляе два лісты ў Гузаў свайму настаўніку Ж. Ралею, дзе апавядае пра гісторыю горада, пра універсітэт, батанічны сад, пра Пятрарку і Галілея.

**Верона** — сюды адвозіць сваю жонку (*яна потым паедзе ў маёнтак бацькі — у Бжэзіны пад Варшавай*), а ў горадзе наведвае палацы, касцёлы і амфітэатр.

**У Венецыі** (жнівень) даведваецца аб сваім прызначэнні прадстаўніком польскай эміграцыі ў Канстанцінопаль (Стамбул) дзеля тайных дамоваў — каб схіліць туркаў да новай вайны з Расеяй. Бярэ сабе **новае прозвішча Жан Рыдэль,** і яму выдаецца пашпарт з наступным тэкстам (пераклад з французскай мовы):

***«Прашу ўсіх, да каго прыйдзецца звярнуцца, прадставіць вольны праезд Жану Рыдэлю, ураджонаму паляку г. Вільня, на Літве (узрост — 37 год; рост — пяць футаў, чатыры пядзі; валасы — шатэн; бровы — такія ж; вочы — карыя; лоб — вузкі; нос — сярэдні; падбародак — акруглы; твар — авальны), едучаму з лёкаем у Канстанцінопаль, не чынячы яму якіх-небудзь перашкодаў, якія б прымусілі яго пакутаваць.***

***Дадзена ў Фларэнцыі 17 нівоза 4 года Рэспублікі адзінай і непадзельнай.***

***Подпіс — Жан Рыдэль.***

*Паўнамоцны прадстаўнік міністэрства Макс Фрэвіль — сакратар амбасады.*

*Прагледжана 22 жэрміналя 4 года Французскай Рэспублікі. Ламон — генеральны консул Французскай Рэспублікі ў Смірне.*

*Пасведчанне дае права на праезд.*

**Ларэта** (9 лістапада) — піша ліст сваёй жонцы ў Бжэзіны.

**Рым** (20 лістапада) — ліст жонцы.

**Спалета** (?) — адчувае сябе хворым (у яго жар) і спыняецца ў сваёй радні — княгіні Радзівіл, якая праз ангельскага пасла лорда Актона дабіваецца выдачы яму пашпарта для паездкі ў Неапаль.

**Неапаль** (?) — першы дзень наведвае оперны тэатр Сан Карло, дзе з-за сваёй блізарукасці не заўважае, што яго пазнае расейскі пасол граф Галаўкін.



*Горад Ларэта, сучасны выгляд*

*Кажучы «шпіёнскай мовай», канспіратар Агінскі «засвечваецца», таму што пасол абавязаны данесці ў Расею імператрыцы, дзе і калі бачыў «бунтаўшчыка», якога ўрэшце трэба арыштаваць. Але Галаўкін праз даццкага пасла Бурке і яго знаёмых папярэджвае былога калегу аб небяспецы. Бачна, што ў тыя часы паміж дыпламатамі існавала сапраўдная салідарнасць. Да таго ж былы дыпламат меў аўтарытэт, які, напэўна, грунтаваўся і на славе Агінскага-кампазітара. У той час хадзілі чуткі аб яго самагубстве з-за нешчаслівага кахання. Гэтыя чуткі і яго паланэз «фа-мажор», які ў тыя часы таксама называўся «Паланэз Агінскага» і быў вельмі папулярны ў Еўропе, стваралі эмігранту Міхалу арэол рамантычнага героя-выгнанніка.*

Ён жыве ў Неапалі шэсць тыдняў, заўважае, што за ім сочаць чатыры агенты-шпікі, і вымушаны знішчыць дакументы аб паўстанні і перапіску з Дамброўскім аб фармаванні польскіх легіёнаў ў Італіі.

**Рым** (?) — вяртаецца сюды, развітваецца з **генералам Калышкам**, з якім разам вандраваў.

**1796 г., Ліворна** (5 лютага) — піша ліст сваім паплечнікам, што ён сеў на ангельскі фрэгат *(у час вандроўкі вядзе дзённік, які чытаецца як авантурны, прыгодніцкі раман)*. Карабель плыве **па Цірэнскім моры**, каля выспаў **Эльба, Сардзінія**, **каля Сіцыліі** пасажыры бачаць уначы вулкан Этну, далей — **Міжземнае мора**.

Сярод пасажыраў карабля, што сілкаваліся за капітанскім сталом (елі двойчы на дзень салёны суп з бараніны і сухары з кавай без цукру), былі паломнік, перакладчык, які ехаў на в. Родас, два жыхары Ліворна, два габрэі з Александрыі, француз, які вёз на продаж у Турцыю дванаццаць афрыканскіх рабоў, і нейкі іспанскі святар махлярскага выгляду. З апошнім у Агінскага была палітычная спрэчка аб

адносінах Іспаніі і Рэчы Паспалітай. Тэмпераментны іспанец адстойваў свае погляды бандыцкім аргументам — накінуўся на суразмоўцу з нажом. Агінскаму прыйшлося ўгаворваць матросаў, з якімі пасябраваў, не выкідаць агрэсіўнага святара ў мора. Міхал Клеафас умеў дыпламатычна ладзіць з людзьмі, заключаючы ўдалыя пагадненні — за 10 дукатаў капітан карабля аддаў яму сваю каюту на час плавання, сам жа стаў разам з усімі на палубе, дзе быў размешчаны кубрык.

**Мальта** (належала Мальтыйскаму ордэну) — тут стаянка фрэгата доўжылася тры тыдні, далей курс па Эгейскім моры — да берагоў Турцыі.

**Смірна** (Ізмір), Турцыя — карабель стаяў каля трох тыдняў дзеля рамонту (шквальны вецер парваў парусы). Агінскі адпраўляе вестку Вернінаку — паслу Францыі ў Канстанцінопалі.

**У Эфесе** наведвае старажытны храм Дзіяны, знаёміцца з галандскім консулам.

Не дачакаўшыся канца рамонту, рушыць сухапутным шляхам, верхам на кані ў суправаджэнні янычара і некалькіх туркаў.

**Махаліц** — тут праз шэсць дзён. Адсюль адплывае па Мармуровым моры ў Канстанцінопаль.

**Канстанцінопаль** (Стамбул) — прабыў шэсць тыдняў. 13 чэрвеня пры пасрэдніцтве Вернінака адбылася сустрэча з прадстаўніком урада Турцыі — князем Маруцы, які нічога не абяцаў і раіў набрацца цярпення. У сваёй карэспандэнцыі Агінскі «як турыст» апісвае жыццё горада. Тут ён знаходзіць для сябе фартэпіяна, бярэ ўрокі турэцкай мовы. Адсюль піша ліст генералу Банапарту ў Італію, увагу якога скіроўвае да польскага пытання. Даведваецца, што ўся яго карэспандэнцыя перадаецца праз шпіка (яго лёкая, грэка)

князю В. Качубею, расейскаму дыпламату *(з 1802 г. — міністр унутраных спраў Расеі)*. Тым часам мяняецца ўрад Турцыі, які настроены ўжо па-прарасейску. Тайная місія Агінскага заканчваецца нічым, і ён выязджае з горада **4 лістапада** пад новым імем **«месье Мартэн, французскі купец».**

Разам з двума палякамі і янычарам па вузкіх горных сцежках пераходзіць праз **Балканскі хрыбет** (у тых мясцінах панавала чума). Далей — трохгадзінная пераправа цераз **р. Дунай.**

**У Бухарэсце** (Румынія) знаёміцца з французскім консулам, генералам Кара Сен-Сірам. У горадзе з насельніцтвам каля 40 тысяч жыло 1 800 палякаў.

**Ясы,** Малдавія (лістапад) — тут даведаўся аб смерці Кацярыны II і аб вызваленні новым царом Расеі Паўлам I Касцюшкі і іншых паўстанцаў. Далей — шлях цераз **Карпаты**, абмінаючы пасты аўстрыйскіх памежнікаў, у снегапад і 18-градусны мароз.

**Ябланаў**, Галіцыя (10 снежня) — уладанне графа Дзедушынскага, дзе Агінскі хаваецца ад аўстрыйскай паліцыі **пад імем Рачынскага** — вандроўнага музыкі (грае з дачкой графа Анжэлікай на скрыпцы і фартэпіяна). Канспірацыя не дапамагае — Качубей перадае аб ім інфармацыю аўстрыйцам.

10 студзеня **1797 г.** ад'язджае ў суправаджэнні графа Дзедушынскага ў **Львоў** з пашпартам на **імя Валяр'яна Дзедушынскага**.

**Кракаў** — тут ледзь не трапляе ў рукі паліцыі.

У **Прускай Сілезіі** сустракаецца са зводным братам Феліксам Лубенскім, даведваецца аб змене палітычнай сітуацыі — французы былі зацікаўлены ў збліжэнні з новым царом Расеі Паўлам, — і надзеі ўзвесці на польскі прастол прускага караля рушыліся.

**Берлін** — знаёмец Агінскага яшчэ па Гаазе французскі пасол дае яму пашпарт на сваё імя — Кайяр.

**Парыж**, Францыя (прыехаў 2 лютага) — сустрэўся з кіраўнікамі польскай эміграцыі, каб даць справаздачу аб сваёй місіі ў Турцыі. У Агінскага было дзве сустрэчы (другая — 5 красавіка) з міністрам Дырэкторыі Шарлем Дэлакруа, які параіў падрыхтаваць план паходу легіёнаў ў Паўднёвую Польшчу і з гэтым планам сустрэцца з Банапартам у Італіі (потым неабходнасць у такой сустрэчы адпала).

**Брусель** — наведвае оперу, балет, ходзіць на лекцыі Лагарпа па французскай літаратуры (таго Лагарпа, які вучыў царэвіча Аляксандра) і Фурэруа па хіміі.

**Парыж** (2 снежня) — вяртаецца з Бруселя.

Быў прадстаўлены Напалеону (які вярнуўся з Італіі). На сустрэчы з ім іграў яму свой «Марш для легіёнаў», які склаў вясною гэтага года. Таксама меў сустрэчу з міністрам замежных спраў Талейранам, які раіў Агінскаму вярнуцца да сям'і, дамоў. Міністр прапанаваў яму дыпламатычную падтрымку і дапамогу, калі князь накіруецца ў Берлін.

**Гамбург** — тут ён знайшоў для сябе фартэпіяна, сустракаўся з цікавымі людзьмі (лексікографам Рыварола́м) і, як раней, заўважыў, што за ім сочаць ангельскія і расейскія шпікі.

**Берлін** — быў прыязна прыняты каралём і каралевай, але яго сябра з часоў Траістага саюза галандскі барон дэ Рыд папярэджваў Агінскага, што тутэйшыя ўлады, як і раней, лічаць яго небяспечным якабінцам.

**1798 г., Бжэзіны**, маёнтак цесця Лясоцкага пад Варшавай (1 ліпеня) — выязджае сюды, атрымаўшы дазвол прускіх караля і каралевы. Гэты дазвол выклапатала яму яго жонка Ізабэла пры падтрымцы Вільгельма Аранскага. (Тут, напэўна, сустрэўся са сваім настаўнікам Жанам Ралеем.). У гэтым годзе **нарадзіўся сын Тадэвуш Антоній**.

**1799 г.** (3 сакавіка) — праз прускага пасла ў С.- Пецярбурзе звяртаецца да расейскага імператара Паўла з просьбай даць дазвол на вяртанне ў Літву (Беларусь). Атрымоўвае адмову.

**1801 г. — нараджэнне** другога **сына — Францішка Ксаверыя.** Атрымоўвае дазвол на вяртанне ад новага расейскага цара Аляксандра І. Лаяльнасць маладога цара да былога паўстанца была выклапатана Адамам Чартарыйскім, адным з дарадцаў Аляксандра І.

*У 2002 г. па запрашэнні дырэктара Віленскай беларускай школы імя Фр. Скарыны сп. Галіны Сівалавай супрацоўнікі Залескага музея Агінскага наведалі гістарычны архіў г. Вільні, дзе быў знойдзены дагэтуль невядомы рукапіс невялікага дзённіка М. Кл. Агінскага. У ім апавядаецца аб падзеях пасля прыезду Агінскага з эміграцыі на тэрыторыю тагачаснай Расейскай імперыі з 1801 па 1802 год. Далей даецца кароткі пераказ гэтага дзённіка з цытатамі (пераклад з польскай мовы Т. Кляшчонак).*

**30 лістапада** — выезд з Варшавы ў Гародню, дзе Агінскага чакаў пашпарт для вольнага ўезду на тэрыторыю імперыі.

**Гародня** — дае прысягу Аляксандру І і атрымоўвае пашпарт (ужо легальны) ад былога праціўніка па 1794 г. — генерал-губернатара Л. Бенігсена.

Галоўнай мэтай паездкі было атрыманне ў спадчыну маёмасці ад бяздзетнага старога дзядзькі Францішка Ксаверыя, які жыў у Маладэчне. Уся маёмасць былога паўстанца была канфіскавана, падзелена і адышла ў іншую дзяржаву. Агінскі піша: ***«Я быў пазбаўлены ўсіх сваіх сродкаў. Мае крэдыторы былі незадаволены, мая жонка, растраціўшы 600 000 злотых, забяспечаных маімі маёнткамі, карміла мяне і дзяцей з зямель Бжэзінаў..., а гэты маёнтак, нават абцяжараны***

*пазыкамі, мог даваць на патрэбы жыцця каля 12 000 штогод. Дзеці мае ўрэшце не маглі спадзявацца ні на якую спадчыну пасля мяне, і я не меў на іх выхаванне іншых сродкаў, апрача тысячы талераў Кампетэнцыі* [пенсіі — аўт.], *гарантаванай мне штогод да маёй смерці Прускім каралём. Такое жахлівае было маё становішча, калі я пачаў падарожжа на Літву».*

Справы з крэдыторамі трэ было ўладкоўваць у С.-Пецярбурзе, а справы аб спадчыне — у Маладэчне. Таму з Гародні Міхал Клеафас **накіраваўся ў Маладэчна**, спадзеючыся станоўча вырашыць усе праблемы і сустрэць прыязны прыём у дзядзькі, які пісаў аб гэтым у сваіх лістах.

Але па прыездзе Агінскі з сумам убачыў самотнага, знясіленага ўзростам чалавека, які не мог ужо ні аб чым лагічна меркаваць і ўсё заблытваў. Карыстаючыся нямоглацю старога чалавека, апеку над ім і ўсе правы на яго ўладанні незаконна прысвоіў сабе швагер М. Кл. Агінскага **Ян Вільгельм Лапацінскі***. Ён аддаў усе маладэчанскія фальваркі ў арэнду сваім сябрам, пасадзіў сваіх адміністратараў і ўзбагачаўся, ледзь задавальняючы пабытовыя патрэбы хворага Францішка Ксаверыя. Маладэчанская пушча, раней не кранутая, была высечана, фальваркі давалі мізэрныя прыбыткі. **Ганута** (спадчына ад дзеда М.Кл. Агінскага — Тадэвуша) была ўжо ацэнена на продаж за 18 тыс. злотых. На **Залессе** (спадчына ад прадзеда Марцыяна) ужо быў гатовы дэкрэт аб продажы яго айцам кармелітам.

Пасля тыдня дарэмных угавораў, вырашыўшы ратаваць маёмасць дзядзькі, ***«які не ўмеў судзіць аб рэчах здаровым розумам»***, Агінскі **едзе ў Менск** да губернатара Карнеева па падтрымку. Менскі губернатар дапамагае — піша лісты ў С.-Пецярбург генерал-пракурору Беклешаву і самому маладэчанскаму графу Францішку.

* Муж сястры Агінскага Юзэфы.

Пасля трох дзён у Менску Агінскі ізноў **у Маладэчне**, дзе ізноў угаворвае свайго дзядзьку, але дарма (ліст ад Карнеева, у якім губернатар абяцаў сваю падтрымку і прасіў графа даверыцца пляменніку, ніякіх вынікаў не даў).

Каб далей абараняць правы па маёмасці, Агінскі выязджае **ў Вільню**, дзе меўся адбыцца судовы працэс з тым жа Лапацінскім (апошні па-махлярску спрабуе грашыма, балямі і прыёмамі схіліць на свой бок суддзяў-дэпутатаў). З Вільні Агінскі яшчэ два разы накіроўвае пасланцоў да дзядзькі на даверанасць, але той нікога не пускаў нават на парог палаца.

Урэшце, абавязаўшы даверанага дзядзькі, каб ён ***«не пераставаў быць уважлівым да яго*** [гэта значыць дзядзькі — аўт.] ***інтарэсаў»***, Агінскаму нічога не заставалася, ***«як толькі аддаць справу на волю лёсу і даверыцца апецы некаторых ласкавых сяброў, а самому заняцца выездам у Пецярбург, куды клікалі найважнейшыя справы»***.

Агінскі рыхтаваўся да сустрэчы з вышэйшымі саноўнікамі расейскай сталіцы і прыслухоўваўся да парадаў генерал-губернатара Вільні Л. Бенігсена (які даў Міхалу Клеафасу ліст да Беклешава і выслаў лісты аб справах Агінскага графу Варанцову, Трашчынскаму і інш.). Агінскаму трэба было ***«мець дакладную інфармацыю аб цяперашнім стане спраў у Пецярбурзе, аб характары пануючага манарха, яго атачэнні, аб тых, хто мае на яго ўплыў, і аб спосабах, якімі трэба да іх трапляць»***.

**1 студзеня 1802 г.** Агінскі выязджае з Вільні ў **С.- Пецябург**. Ён складае план тактыкі сваіх дзеянняў у сталіцы. *Гэта праява адной з рысаў характару Агінскага — планаванне падзеяў жыцця і рацыянальнасць паводзінаў дзеля поспеху справы. Прафесійная звычка былога дыпламата (планаваць стратэгію і тактыку ў*

*палітыцы) бярэ пачатак яшчэ ад бацькі Агінскага (таксама дыпламата) і ад урокаў геаметрыі настаўніка Жана Ралея — здзіўленне і захапленне вучня ад складання плана гузаўскага парка і малявання плана свайго пакоя. Дарэчы, і ў складанні кампазітарам музыкі тое ж — перанос узніклых мелодый у значкі нотаў, «планаванне» гукаў на нотным стане дзеля пошукаў музычнай гармоніі. Розум (Racio), парадак і гармонія — вось інструменты, якімі карыстаецца ў жыцці «выхаванец» эпохі Асветніцтва М. Кл. Агінскі. Ён складае «кампазіцыю» сваіх паводзінаў, едучы ў карэце ў С.-Пецярбург (хаця і не без разумення фатальнасці «ўчынкаў лёсу»).*

План паводзінаў складаецца з 6-ці пунктаў. Сярод іх: ***«нікога не абвінавачваць і не скардзіцца, нават з найбольшымі ворагамі абыходзіцца ветліва, каб яны не пашкодзілі ў маіх справах», «дзейнічаць з як мага большаю павольнасцю і цярпліва чакаць лёсу, які мне выпадзе», «не быць ні подлым, ні нахабным, але паказваць рэчы так, каб мне не было патрэбы самому прасіць аб сваіх інтарэсах, а каб слушнасць справы сама вымагала патрэбы справядлівага рашэння».***

**6 студзеня** — прыезд у С.-Пецярбург і на наступны дзень — візіт да Адама Чартарыйскага, дарадцы цара (каб, напэўна, падзякаваць за пратэкцыю, з дапамогай якой ён атрымаў дазвол на ўезд у імперыю). Атрымаўшы парады ад Чартарыйскага, Агінскі піша, што сказаў яму: ***«Маім адзіным намерам з'яўляецца падзякаваць імператару за дазвол вярнуцца на Радзіму, а адначасова шукаць яго пратэкцыі, каб вызваліць маёнткі майго дзядзькі з-пад незаконнай апекі Лапацінскага».***

Князь Адам паабяцаў дапамагчы і параіў прадставіцца двару і звярнуцца да генерал-пракурора Беклешава.

**На наступны тыдзень** — прадстаўленне імператару і імператрыцы і візіт да Беклешава, каб перадаць яму лісты ад Бенігсена і Карнеева.

Далей быў ізноў візіт да генерал-пракурора (апошні параіў скласці на імя Аляксандра І мемарыял — прашэнне аб перадачы Агінскаму зямель яго дзядзькі і аб скасаванні прэтэнзіяў яго крэдытораў), потым прадстаўленне Вялікаму князю Канстанціну і іншыя патрэбныя для справы візіты.

**18 лютага** — падаў мемарыял графу Міхаілу Мікалаевічу Мураўёву. Праз два дні мемарыял быў у цара. Агінскі чакае адказу і, згодна з выбранай тактыкай (***сакрэт — душа кожнага мерапрыемства***), ні з кім не сустракаецца і не выходзіць з дому. Пасля хваробы (цяжкая прастуда) ён зноў чакае, абыходзіцца без візітаў ***«з-за пераканання, што ў Пецярбурзе нельга аб'яднаць забавы са справамі»***.

Праз час, знудзіўшыся ад чакання, ён вырашае прыспешыць падзеі — піша ліст адной з кузінаў (якая была пры двары імператара) і распавядае пра свае клопаты, ведаючы, што ліст можа быць прачытаны самому імператару.

*Гэты «абходны манеўр» з практыкі дыпламата, бо Агінскі ведае, што справы вырашаюцца не толькі ў кабінетах. І «манеўр» спрацаваў!*

**26 сакавіка** (у нядзелю) яго выклікае на сустрэчу Беклешаў. Агінскі піша, што распавёў яму генерал-губернатар: ***«Я вас віншую! Імператар... шчыра жадае паправіць Ваш лёс. Ён паклікаў мяне пазаўчора да сябе і сказаў такія словы: «Агінскі нешчаслівы, трэба падумаць, каб выправіць яго справы. Праўда, ён быў у супрацьлеглым нам лагеры, але выконваў свой абавязак і служыў сваёй Радзіме. Цяпер ужо ўсё***

***зьнікла і забыта. Трэба падаць яму руку, а таму зрабі, што можаш, каб даць станоўчую рэзалюцыю на мемарыял».***

*На гэтых словах канчаецца рукапіс дзённіка М. Кл. Агінскага.*

Усе справы, дзеля якіх Агінскі вярнуўся з эміграцыі, былі паспяхова вырашаны на яго карысць. Амаль праз месяц ён выедзе з С.-Пецярбургу ў Залессе (праз Вільню), каб пачаць новае жыццё. Разам са зменамі ў справах маёмасці далей яго чакае радыкальная змена і ў прыватным жыцці.

*На «хвалі перамогі», атрымаўшы ўвагу найвышэйшай улады і статус уласніка, Агінскі ператвараецца з былога няўпэўненага (без маёмасці і ў пазыках) эмігранта ў аптыміста-рамантыка, які вырашае змяніць і сваё сямейнае жыццё. Невядома калі, але верагодна ў гэты час ён пачынае перапіску з жонкай Ізабэлай аб разводзе — усё таму, што ў Вільні ён сустракае іншую жанчыну, якая потым стане яго выбранніцай да канца жыцця (справа аб разводзе зацягнецца надоўга, і канчатковае ўзгадненне ўсіх яе ўмоў завершыцца толькі ў кастрычніку 1803 г.).*



**Ізабэла Агінская, з Лясоцкіх (1764-1852)**

**Вільня** — у 1802 г. тут ад хваробы памірае былы паўстанец 1794 г. Каэтан Нагурскі. Яго жонка — прыгажуня ва ўзросце 26 гадоў, італьянка Марыя Нэры становіцца заможнай удавой з капіталам 400 тыс. залатых дукатаў. На яе «маюць віды» 59-гадовы генерал-губернатар Вільні Лявонцій Бенігсен і 36-гадовы былы эмігрант-вандроўнік, вядомы ў Еўропе аўтар паланэзаў, былы паўстанец Міхал Агінскі.



Князь М. Кл. Агінскі, 1808 г. Мастак Францыска Фабр (1764—1852)



Барон Лявонці Бенігсен

*Былыя праціўнікі часоў паўстання 1794 г. ізноў сышліся, але ўжо ў рамантычнай дуэлі за руку маладой венецыянкі. Калі бой пад Вішневам Агінскі прайграў Бенігсену, то на «віленскім фронце» ён атрымаў «вікторыю» — Марыя праз некаторы час выйшла за яго замуж.*

# Гаспадар Залесся



*Міхал Клеафас Агінскі*



*Марыя Нэры Агінская (1778—1851)*
*Мастак А. Малінары*

**28 красавіка 1802 г. Міхал Клеафас едзе ў в. Залессе,** у маёнтак свайго дзядзькі — апошняга кухмайстра ВКЛ Францішка Ксаверыя Агінскага.

*Атрымаўшы магчымасць жыць на Беларусі і ўзаконіўшы свае правы нашчадка, князь Міхал, напэўна, з надзеямі на лепшую будучыню, пачынае новы этап жыцця. Бадзянні і «авантуры» выгнанніка скончыліся, яго чакалі іншыя справы — стварэнне новай сям'і, аднаўленне гаспадаркі дзядзькі. Новага гаспадара сустрэла занядбалая сядзіба, дзе, напэўна, яшчэ захаваўся ў той час* **«компас перад палацам з каменя белага мармуровага, на пастаменце драўляным»** (з інвентара 1795 г.).

Як піша Агінскі ў мемуарах, ён выехаў сюды на сталае жыццё, ужо як уладальнік Залесся, таму што, напэўна, меў на руках указ цара (*цытаты з яго дадзены на мове арыгінала*): ***«апреля 15 числа за собственноручным Его Величества подписанием»***, у якім канстатавалася, што




План зямель фальварка Залессе 1800 г.

***«литовский кухмистр князь Ксаверий Огинский, владея знатным имением в Минской и Литовской губерниях, по крайней его слабости здоровья и старости лет*** [князю было ў той час 60 гадоў — аўт.], ***управлять оным сам собой не в состоянии,... происходят разные упущения и беспорядки,... крестьяне остаются без должного призора...»***, таму ***«...повелеваем означенное имение отдать от него в управление подскарбия графа Михайла Огинского, яко законнаго наследника перваго, с тем... дабы доходы, с имения собираемые, вполне доставляемые были кухмистру князю Огинскому до самой его смерти...»***

*Гэты ўказ будзе перададзены Сенату, а 28 красавіка пасланы менскаму губернатару Карнееву, канцылярыя якога атрымае яго ўжо 8 траўня. Паводле гэтага ўказа князь Міхал прызначаўся фактычна апекуном-упраўляючым маёмасцю свайго дзядзькі.*



*Фрагмент плана 1800 г.*

Сядзіба кухмайстра князя Францішка Ксаверыя складалася з драўлянага палаца (1) (пабудаваны ў 1-й палове XVIII ст.), перад галоўным фасадам якога (з боку става) быў гаспадарчы двор (2). Другі (дваровы) фасад палаца выходзіў у рэгулярны «італьянскі парк» (3) — чатырохкутнік (310х140 метраў), абсаджаны ліпавымі алеямі, у якім былі квадраты з кустоў агрэсту,

парэчак і садовыя дрэвы — грушы і яблыні. Каля става — драўляны млын (4), бровар, далей фальварак (5) з гаспадарчымі пабудовамі, сад і агарод (6). Да сядзібы Залессе яшчэ належалі вёскі Міхневічы, Алянец, Зарудзічы, Перабродзічы, Заскавічы, Готкавічы, Яневічы, Белая; царква недалёка ад палаца; касцёл на значнай адлегласці; рэкі і перавоз на Віліі (мяжа сядзібы з поўначы); тры карчмы; лугі ў поймах рэчак, Алянецкі бор і цагельня на рацэ Белай. На плане сядзібы 1800 г. пазначана, што пад палацавымі забудовамі і паркам — 8 моргаў і 207 прутоў; царква і могілкі — 46 прутоў; стаў з берагамі — 8 прутоў.

*Тагачасныя адзінкі вымярэння плошчаў: морг = 0,53 га; прут = 23,7 $м^2$. Вёскі Залессе тады не існавала, так называлася толькі сядзіба Агінскіх.*

Уся сядзіба (асабліва драўляны палац) з-за недагляду прыходзіла ў заняпад. Новы гаспадар, князь Міхал, пасяліўшыся ў палацы дзядзькі і троху яго аднавіўшы, адразу ж пачаў справы па ўзвядзенні новага, мураванага — для сваёй новай сям'і.

**10 ліпеня 1803 г.** нарадзілася **дачка Амелія.** У гонар гэтага была пасаджана алея таполяў (напэўна, на месцы новага ангельскага парку — за новым палацам). Выхаваннем і доглядам Амеліі займаліся ангельская гувернантка **Mistres Whiter**, нянька — вясковая спадыня **пані Загурская** і стары лёкай, у абавязкі якога ўваходзіла выконваць ўсе пажаданні маленькай князёўны.



***Партрэт Амеліі Агінскай 1808 г. Мастак Франсуа Фабр***

Вёска Амеліна, непадалёку ад Залесся, была названа ў гонар дачкі Агінскага — першага дзіцяя ад шлюбу з Марыяй Нэры. Калі Амелія троху падрасла, ёй для гульняў было дадзена мядзведзяня з ліку «выхаванцаў Смаргонскай акадэміі».

*«Смаргонская акадэмія» — гістарычная жартаўлівая назва Смаргоні, дзе з XVI ст. Радзівіламі была заснавана так званая «школа навучання медзвядзёў», якіх вучылі танцаваць пад музыку, стоячы на задніх лапах. «Выхаванцы акадэміі» прадаваліся ў каралеўскія двары Нямеччыны, Італіі і Францыі.*

У гэтым годзе Юзаф Казлоўскі на ўласныя грошы выдае ў С.-Пецярбурзе музычныя творы свайго вучня. Казлоўскі «прапагандуе» творы Агінскага і, як настаўнік музыкі сям'і імператара, запісвае іх у сшыткі сваіх вучаніц-сясцёр цара.

**1804 г.** — жонка Агінскага піша зімой ліст з Залесся ў Італію — сваёй сястры, графіні Скоці, у якім апавядае пра ўражанні ад новага сямейнага жыцця: ***«Залессе — цудоўная мясціна. Вакол нас снег і маразы, але мы іх не заўважаем — праўду кажуць, што шчасце можна знайсці ўсюды, калі ў сэрцы няма дакораў і нікчэмных слабасцяў...»***

З 1804 г. Агінскі ў Залессі пачынае сістэматызаваць свае дзённікавыя запісы — адсюль бяруць пачатак яго «Мемуары».

У гэтым жа годзе Агінскаму царскім указам былі вернуты землі Міхала Казіміра Агінскага (памёр у 1800 г.). Акрамя таго, Аляксандр І паабяцаў выплаціць з дзяржаўнай казны вялікія віннасці з маёнткаў, вернутых Агінскаму (іх было шмат, у тым ліку Ракаў, Еўе, Бялынічы, Цяцерын, Гаўя, таксама былі і палацы — ў Вільні, Гародні і Варшаве).

**1807 г.** — у Агінскіх нараджаецца другая **дачка — Соф'я**, якая хутка памірае. Пахавана ў капліцы Агінскіх касцёла Св. Яна ў Вільні.

**Ліпень** — пасля Тыльзіцкай дамовы (паміж Аляксандрам I і Напалеонам) Агінскі звяртаецца да цара па дазвол, каб выехаць з сям'ёй за мяжу: мясцовы клімат дрэнна адбіваецца на здароўі яго жонкі.

*Напэўна, для Агінскіх гэты ад'езд — яшчэ і спроба змяніць абстаноўку пасля сумнай падзеі — смерці і пахавання маленькай Соф'і.*

**1807–1810 гг.** — паездкі Агінскіх ў **Венецыю, Фларэнцыю, Парыж.**

**1807** г. — сустрэча Агінскага з Напалеонам у **Венецыі.**

**1808 г.** — у **Фларэнцыі** нарадзіўся **сын Ірэнеуш.** А ў маёнтку стрыечнага брата Агінскага — Фелікса Лубенскага (напэўна, у Бжэзінах) ва ўзросце 73-х гадоў скончыў сваё жыццё ўлюбёны настаўнік Агінскага **Жан Ралей**.

**1809 г. — у Залессі** нарадзілася **дачка Эма**.

**1810 г.** — атрымаў ад Аляксандра I пасаду сенатара Расейскай імперыі і стаў дарадцам імператара па справах тэрыторый, далучаных да Расеі пасля падзелу Рэчы Паспалітай (Летува і Беларусь).



*Партрэт Ірэнеуша Агінскага 1820 г. Мастак Франсуа Фабр*

Жонка Агінскага ў сувязі з гэтым, як сенатарыха, дадала да свайго італьянскага прозвішча частку «de» і стала

звацца «Агінская Марыя дэ Нэры». Агінскія былі частымі гасцямі на царскіх балях. Сучаснік дае такі партрэт сенатарыхі: «У ***той час яна было ўжо сапраўднай дамай,... ганарлівай арыстакраткай у сапраўдным сэнсе гэтага слова... У вышэйшае грамадства прыйшло новае пакаленне, якое не ведала аб яе мінулым*** [маецца на ўвазе яе паходжанне — дачка карчмара — аўт.], ***і яна здавалася сур'ёзнай, паважанай, знакамітай і прывабнай спадыняй, перад якой, як перад багіняй, у нас і за мяжой пакорліва схілялі галовы»***.

Падчас паездкі сенатара ў Парыж (верагодна, па даручэнні цара) была яшчэ адна сустрэча з Напалеонам. У доме Марыі Валеўскай (Марысі — каханкі Наполеона) паміж сенатарам і маршалам Дзюрокам адбылася размова, у якой апошні казаў пра незалежнасць Польшчы як пра ілюзію **(«un projet chimerique»).**

*Агінскі яшчэ раз пераканаўся ў марнасці спадзяванняў палякаў атрымаць сапраўдную незалежнасць ад французаў і ў тым, што стварэнне ў 1807 г. Варшаўскага герцагства — не болей чым «фармальнасць» з боку Напалеона.*

**1811 г.** — з Парыжу разам з Агінскім у **Залессе прыехаў** італьянскі музыка і кампазітар **Джузэпэ Паліяні**, які 11 гадоў будзе жыць тут і выкладаць музыку дзецям Агінскага.

*Д. Паліяні нарадзіўся ў Рыме ў 1781 г. У Неапалі ён напісаў оперу «La sinta amante». Ствараў оперы для тэатра Альдэбрандзіні, вакальныя і інструментальныя творы, жыў у Парыжы.*

Сярод дзяцей Агінскага яго дачка Амелія вызначалася музычнымі здольнасцямі. Пад кіраўніцтвам Паліяні яна вельмі добра навучылася граць на фартэпіяна і набыла

рэдкія на той час для паненак тэарэтычныя веды па музычнай кампазіцыі. У Залессі яна пачала складаць свае творы. Адзін з іх вядомы — паланэз «до-мінор» у 4-ры рукі. У 1825 г. яна піша рамансы на французскія тэксты «Мая душа сёння» і «Я люблю ноч». З сястрой Эмай яна апрацавала для фартэпіяна ў 4-ры рукі марш-экспромт свайго бацькі. Таксама была аўтаркай сольных і харавых твораў для хатніх імпрэзаў і скрыпічных твораў у суправаджэнні фартэпіяна. Потым здольнасці да музычнай кампазіцыі перадаліся і яе дзецям, якім яна была першай настаўніцай музыкі.

Амелія мела здольнасці таксама і да паэзіі і малявання. Пра паэтычнае натхненне сведчыць яе зборнік вершаў «З нагоды», а таксама «Верш да музыкі», змешчаны ў друку Леанардам Ходзькам.

Урокі малявання Амелія брала ў Вільні ў Рустэма. Ёсць сведчанні пра яе малюнкі і пра яе краявід залескага парку з постаццю бацькі.

**У красавіку** Агінскі атрымаў даручэнне ад Аляксандра І зрабіць праект аўтаноміі заходніх губерняў — Віленскай, Гарадзенскай, Віцебскай, Менскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Падольскай і Валынскай (таксама і акругаў — Беластоцкай і Тарнопальскай).

**15 траўня з'явіліся «Запіска графа Агінскага, пададзеная Аляксандру І» і «Праект указа аб новай арганізацыі заходніх губерняў».**

*Яны ўпершыню надрукаваны на Беларусі ў 1995 г. у перакладзе Анатоля Грыцкевіча (гістарычны альманах «Адраджэнне». Вып. 1. Мінск: «Універсітэцкае». Ст. 195-233).*

«Запіску...», якая з'яўляецца абгрунтаваннем «Праекта...», Агінскі пачынае... з Напалеона — дае яго псіхалагічна-палітычны партрэт, прапануючы цару прыглядзецца ***«разважна і непрадузята да асабістага***


Расейскі імператар Аляксандр I

***характару гэтага манарха і ягоных вайсковых прыёмаў»***. Аналізуючы паводзіны Напалеона (прыпамінаючы яму ахвяры палякаў ў Італіі, Санта-Дамінга і Іспаніі), Агінскі дае «сістэму» гэтага хітрага палітыка, дзякуючы якой ён атрымоўвае ***«прыхільнікаў, спакушаючы і падпарадкоўваючы сабе людзей, і дабіваецца поспеху, і знаходзіць сродкі для выканання сваіх планаў»*** (асабліва ў справе стварэння Варшаўскага герцагства). Урэшце аўтар дыпламатычна даводзіць цару, што толькі ён, стварыўшы ***«каралеўства Польскае з васьмі губерняў пад назвай «Вялікае княства Літоўскае», ...праверыць прыхільнасць літоўцаў і атрымае на заходняй мяжы Вашае імперыі апору больш надзейную, чым усе крэпасці і войскі, што там знаходзяцца»*** (Агінскі як палітык прадбачыў вайну 1812 г.). У якасці прыкладу аўтар запіскі ўпамінае Фінляндыю, якой цар у 1810 г. даў правы аўтаноміі.

*Праз довады князя Міхала — на прыкладзе Напалеона — праглядаецца (можа і суб'ектыўна) крыўда чалавека, надзеі якога не спраўдзіліся і якога некалі падманулі, а запіска для яе аўтара з'яўляецца ў нейкім сэнсе спробай расквітацца за падман. Даводзячы сэнс запіскі, аўтар мімаволі вядзе старую спрэчку з апанентамі — палякамі, якіх Напалеон «спакусіў» Варшаўскім герцагствам...*

У «Праекце...» сенатарам прапаноўваецца зрабіць Вільню сталіцай княства, кіраванне княствам даручыць імператарскаму намесніку, а дзяржаўныя пасады — ураджэнцам княства. Асноўным законам у новай аўтаноміі павінен быць Статут ВКЛ 1588 г.

**1 снежня** — Агінскі праз шэсць месяцаў дасылае яшчэ адну «Запіску...» імператару. Ведаючы пра рэальную магчымасць вайны (якая зменіць стаўленне Аляксандра да польскага пытання), сенатар спяшаецца і ўжо прапануе не аўтаномію Літвы, а... аб'яўленне яе польскім каралеўствам, на чале з каралём Аляксандрам І. Ён нават прапаноўвае паабяцаць каралеўству канстытуцыю, якая была б **«прыбліжанай да Канстытуцыі 3 траўня...»**

*Агінскі-дыпламат тут робіць памылку: упамінае аб канстытуцыі, супраць якой «ваявала» яшчэ бабка Аляксандра (Кацярына ІІ), і дае «прагноз» не для вушэй імператара Расеі аб аб'яднанні Варшаўскага герцагства з Літвой (**«рана ці пазней, але гэта мусіць адбыцца...»**). Так ці інакш, але ўсе намаганні стваральніка праекта «Правінцыі Вялікага княства Літоўскага» будуць дарэмнымі.*

**У чэрвені 1812 г. у** ноч на Янаў дзень французская армія на чале з Напалеонам пераправілася цераз р. Нёман на тэрыторыю Літвы (сучаснай Беларусі). У складзе Вялікай арміі было 100 тысяч чалавек — як палякаў, так і ўраджэнцаў Літвы. Агінскі адступае разам з расейскімі войскамі. Праз чатыры дні ў Вільні Напалеон распытваўся пра здрадніка — сенатара Агінскага. А Вільня



*Напалеон Банапарт*



*М. І. Кутузаў*

вітала яго воклічамі: «Слава вызваліцелю!» Быў створаны Часовы ўрад, юнакі запісваліся ў Вялікую армію.

**У Пецярбурзе** Агінскі некалькі разоў сустракаўся **з Кутузавым**, які быў губернатарам Літвы, а потым стане пераможцам Напалеона.

*А ў Вільні імператар Францыі толькі абяцаў аднавіць Вялікае княства і вымагаў новых падаткаў (запатрабаваў сплаціць і ўсе старыя даўгі цара), вялізных паставак фуражу і харчу і 100-тысячнай арміі. Чаканні сялян аб скасаванні прыгону, а патрыётаў — аб адраджэнні Княства былі марнымі. Далейшыя падзеі вядомыя — восеньскае адступленне з Масквы і ўцёкі «Вялікай арміі». У мястэчку Смаргонь Напалеон, пераапрануўшыся польскім уланам, кінуў сваю армію...*

**1813 г.** — нарадзілася **дачка Іда**.

**1814 г.** — памірае граф Францішак Ксаверы, і Агінскі становіцца спадчынным уладальнікам яго маёнткаў, сярод якіх і Залессе.

**1815 г.** — заканчвае будаўніцтва мураванага палаца ў залескай сядзібе. **Праект палаца** быў **зроблены** (не без удзелу Агінскага, які ўмеў чарціць) **прафесарам архітэктуры** Віленскага ўніверсітэта **Міхалам Шульцам.** Пасля яго смерці будоўляй кіраваў **віленскі архітэктар Юзаф Пусэ**. Захаваліся імёны будаўнікоў (магчыма, жыхароў навакольных вёсак): **Юзаф Астроўскі, Якаў Буйноўскі, Францішак Высоцкі**.



*Залессе. Краявід сядзібы, 1812 г., малюнак Альбрэхта Адама*

Доўгае будаўніцтва палаца было звязана з фінансавымі праблемамі ў сенатара Агінскага і з вайной 1812 г.

*Французскія войскі былі ў Залессі, пра што сведчыць* **малюнак Альбрэхта Адама, зроблены 15 ліпеня 1812 г**. *На ім не бачна недабудаванага, новага палаца (бо малюнак зроблены з боку става), але ёсць выявы новага мураванага млына, старога драўлянага палаца графа Францішка і выспы на ставе. На беразе става (як сцвярджаюць даследчыкі) — постаці італьянскіх грэнадзёраў падчас купання.*

Новы палац сенатара ўзведзены на сціплыя сродкі — без скляпенняў, без багатага архітэктурнага арнаменту. Цэнтральная частка яго — дарычны порцік з калонамі, над

якім вежачка, «***дзе размешчаны гадзіннік з боем, з чатырох бакоў маючы цыферблаты са стрэлкамі. Над вежачкай шар, у якім замацаваны звон гадзінніка***». Пра малыя сродкі на будоўлю сведчаць і даследаванні археолагаў — у якасці падмуркаў выкарыстоўваўся насціл з галля, на якім узводзіліся муры палаца. Акрамя палаца, былі пабудаваны мураваныя млын і капліца.

Разам з пачаткам будоўлі Агінскім быў закладзены ангельскі, рамантычны парк.

*У параўнанні з XVIII ст., калі панавала мода на ўсё французскае, на пачатку XIX ст. пачынаецца ўплыў ангельскага рамантызму — гувернанткай дачкі Агінскіх Амеліі была ўжо не француржанка, а англічанка.*

У новым парку быў звярынец (дзе бегалі лані і іншыя жывёліны) і так званы «прагулачны звярынец» — са сцежкамі, масткамі цераз р. Бабрынку і мураванымі грэка-рымскай і кітайскай альтанкамі (першая звалася **альтанка Амеліі**).

**23 чэрвеня** — выйшаў указ Аляксандра I аб аплаце з дзяржаўнай казны ўсіх віннасцяў (даўгоў) сенатара Агінскага. Сенатар яшчэ сустракаецца з імператарам (1814 г.), едзе ў Варшаву на яго каранацыю (лістапад 1815 г.), працуе ў 5-м аддзеле Сената (па справах тэрыторый былой Рэчы Паспалітай), але, бачачы «пахаладанне» ў адносінах з Аляксандрам, паціху адыходзіць ад палітычных спраў. Ён болей жыве ў Залессі і піша ў мемуарах: «***Мой ўзрост і здароўе патрабуюць ад мяне кінуць дзяржаўныя справы, шукаць салодкага адпачынку і цішыні ў родным доме. Бурлівае жыццё, даючы пры невыразных успамінах надзею на тое, што часам мары могуць здзяйсняцца, часцей саграваліа радасцю, што займаўся справамі маіх братоў і маёй Радзімы***».



*Сенатар М. Кл. Агінскі 1815 г.*
*Мастак Дзюбуф Клод Мары*



*Марыя дэ Нэры*
*з дачкой Ідай*

Цяпер 50-гадовы князь Міхал у атачэнні жонкі і дзяцей, напэўна, атрымоўвае задавальненне ад гаспадарчых спраў у сядзібе і ў парку. Ён стварае сваю «прыватную дзяржаву» — сям'ю і сядзібу і, як пісьменнік, у цішыні кабінета ці ў альтанцы парку, вяртаецца ў мінулае, працуе над мемуарамі. Ён ганарыцца сваёй аранжарэяй ***(«мая аранжарэя цудоўная і магла б скласці гонар Пецярбургу») і,*** знаходзячыся за мяжой, у лісце да эканома просіць пракансультавацца ў **навукоўца-садавода з Вільні Юзафа Струмілы** аб развядзенні туберозаў і гваздзюкоў, каб бачыць потым іх у сваім парку. Другім кансультантам быў адзін з выдатных батанікаў таго часу **прафесар Віленскага універсітэту Станіслаў Юндзіл** (ён заснаваў віленскі батанічны сад). Частка раслін для залескага парку была прывезена са шчорсаўскага парку сядзібы Храбтовіча.

**У 1817 г.** за свой кошт выдае ў Вільні два зборнікі (у першым — рамансы, у другім — паланэзы). Сярод паланэзаў і знакаміты ў наш час **«ля-мінор»** («Развітанне з Радзімай»).

*Па году выдання гэтага паланэза, верагодна, можна меркаваць, што ён створаны Агінскім у час яго жыцця ў Залессі. Але гэта быў не адзіны папулярны паланэз Агінскага — у розныя часы была «мода» на розныя з іх. Чытаючы мемуары кампазітара, можна скласці ўмоўную «храналогію папулярнасці» яго трох паланэзаў:*

- *пачатак 1792 г. —у Расеі — «фа-мінор»;*
- *1794 г. — у Еўропе — «фа-мажор»;*
- *пачынаючы з 1817 г. — ва ўсім свеце — «ля-мінор» (пра другую назву апошняга паланэза распавядзём далей).*

Грошы ад продажу зборнікаў ён перадае Дабрачыннаму таварыству (быў яго прэзідэнтам 1-га аддзелу), якое апекавалася справамі беднаты. За свае грошы Агінскі будуе і дом беднаты ў Вільні. Як ганаровы сябра навуковага савета Віленскага універсітэту ён падараваў гэтаму храму навукі мікраскоп, а збудаванай на яго сродкі павятовай школе ў Маладэчне перадаў частку сваёй бібліятэкі.

*Выхаванец гэтай школы Ян Машчынскі дапамагаў князю ў Залессі, у перапісцы ўласных карэспандэнцый (затым ён займаў дзяржаўную пасаду дарадцы і быў вядомым лекарам).*



*Леанард Ходзька, сакратар М. Кл. Агінскага*

**15 кастрычніка 1817 г.**, у швейцарскім мястэчку Салюр памёр кіраўнік паўстання 1794 г. **Тадэвуш Касцюшка**.

**1819 г.** — Агінскі ўзяў да сябе на службу сакратаром 19-гадовага **Леанарда Ходзьку.** З ім сенатар **едзе ў Кіеў**, а потым у **С.-Пецярбург**. Юнак дапамагаў князю ў Залессі весці карэспандэнцыю і ў працы над «Мемуарамі».

*Л. Ходзька (1800—1871) нарадзіўся 6 лістапада ў фальварку Аборкі Ашмянскага павету ў сям'і Людзвіка Ходзькі (дэпутата Гарадзенскага сейму, удзельніка паўстання 1794 г.) і Валерыі з Дэдэркаў. Вучыўся ў калегіуме ў Барунах, потым у Маладэчне, дзе пазнаёміўся з Тамашам Занам. Затым вывучаў гісторыю ў Іахіма Левеля ў Віленскім універсітэце.*

У Залессі князь Міхал пачаў і працу над «Лістамі пра музыку», якія засталіся пасля яго смерці ў рукапісах на французскай мове і былі выдадзены (у перакладзе на польскую) ў 1879 г. У «Лістах...» аўтар распавядае ўмоўнаму «фларэнційскаму сябру» аб музыцы, музыках і музычных інструментах Еўропы на мяжы XVIII — XIX ст.

*Як піша беларуская даследчыца С. Немагай,* ***«Лісты...»****, дзе аўтар іх выступае як гісторык і крытык музыкі, з'яўляюцца* ***«аўтапартрэтам Агінскага-музыкі»****.*

Ацэньваючы сябе як аматара музыкі, якому «здаралася скласці нейкія дробязі», Агінскі піша пра свае музычныя здольнасці: «*Усё, што я маю, гэта добры слых, глыбокае пачуццё гармоніі і густ, які я ў сабе выхаваў, слухаючы і часта займаючыся добрай музыкай*». Пра тое, як ён складае музыку, піша: «*рэдка мне выпадала ўносіць змены ў маю першую імправізацыю*», — маўляў ён не «вучоны музыка», а аматар, «*які адзіную толькі мае заслугу — непасрэдна перажывае музычныя ўражанні і мяркуе аб музыцы паводле пачуццяў свайго сэрца...*». У «Лістах...» ён піша пра музычныя інструменты — фартэпіяна, арфу, віяланчэль, аб рогавай музыцы і аб скрыпцы. Узгадвае сваіх настаўнікаў-скрыпачоў: у Польшчы — скрыпача-самавука **Ярновіка**, затым **Віёцці** (1797 г.), а ў Фларэнцыі (1808 г.) — **Кампанэлі**.

Агінскі быў ў той час блізарукі, і гэта «***рабіла немагчымым чытанне нот без ўсаджэння носу ў пюпітр, што ўскладняла рухі смыка***», а Кампанэлі пераканаў яго іграць ... у акулярах.



*Нікола Паганіні, музыка і кампазітар*

У Парыжы (1810 г.) яго настаўнікам быў **Байе**, а ў С.-Пецярбурзе (1811 г.) — **Ляфон**.

*Пяць настаўнікаў еўрапейскага ўзроўню — не так мала для «музыкі-аматара»...*

Ацэньваючы **Н. Паганіні** (1782—1840) — скрыпача-віртуоза таго часу (Агінскі слухаў яго ігру ў 1827—1828 гг. у Фларэнцыі, Люцы і Ліворне), аўтар «Лістоў...» піша: ***«не магу сцвярджаць, што Паганіні не з'яўляецца вялікім артыстам,... дастаткова кінуць вокам на ягоныя кампазіцыі... Квартэты ці капрысы гэткія ж мастацкія, як і складаныя»***.

Але манера выканання Паганіні, старамоднага аўтара, не задавальняе: ***«я б не вяртаўся болей слухаць яго,... ва ўсім, што грае, ён паказвае больш шарлатанства, чымсьці таленту»***.

Агінскі піша і пра Дж. Расіні (1792—1868), пра сустрэчу з **Ф. Гайднам**) (1732—1809) у Вене, у гасцёўні графа Эстэргазі, і пра тое, што бачыў **В. А. Моцарта** (1756—1791): ***«толькі раз, і то выпадкова, я спаткаў Моцарта за якія-небудзь тры гады да яго смерці. Звыш гадзіны я быў у тым самым, што і ён, таварыстве... Я не мог паверыць, што знаходзіўся паблізу чалавека такога знакамітага, з якім я здаўна прагнуў пазнаёміцца. Ён пакінуў салон..., а я застаўся пазбаўлены прыемнасці хоць бы хвіліны размовы»***.

Апавядаючы пра фартэпіяна, Агінскі ўпамінае сваіх настаўнікаў ігры на гэтым інструменце — Клеменці і Адама, піша аб выканаўцах Фільдэ і Штэйбельцэ (слухаў іх у С.-Пецярбурзе), аб захапленні імправізацыямі піяніста-аматара прынца Людзвіга Фердынанда і аб польскай піяністцы і кампазітарцы (з якой сябраваў) Марыі Шыманоўскай.



*Марыя Шыманоўская.*
*Мініяцюра Н. Жака XIX ст.*

Канчаткова «Лісты пра музыку» будуць напісаны ўжо ў Фларэнцыі ў 1828 г.

*На адным з рукапісаў (захоўваецца ў Ягелонскай бібліятэцы Кракава)Агінскі зрабіў надпіс* ***25 верасня 1828 г.****, які прызначаўся дачцэ Амеліі. Такім чынам ён «адзначыў» свае 63 гады...*

*Але вернемся ў Залессе, дзе Агінскі пачынаў пісаць «Лісты пра музыку»,* — у **1819 год.**

Прыкладна да гэтага часу (1820 г.) адносіцца апісанне (інвентар) бібліятэкі ці кабінета Агінскага, якое мы працытуем, каб уявіць, дзе ён працаваў над сваімі музычнымі і літаратурнымі творамі: ***«паркет з ясеня, столь пабеленая, ... вокнаў пяць, ... шторы паркалёвыя, белыя, печка з кафляю белаю і дзверцамі чыгуннымі. У бібліятэцы мэбля: клавікорды*** [тагачаснае піяніна — аўт.] ***з чырвонага дрэва, ... більярд з вольхі на 6-ці нагах, сукном зялёным абцягнуты. Крэслаў з чырвонага дрэва — шэсць. Шафы з чырвонага дрэва, шафа вялікая з бярозы, чатыры шафы з ясеня».***



*Кабінет Агінскага, рэканструкцыя арх. Л. Івановай*

**У 1821 г.** *складзена* ***камічная опера «Жняцы, ці Дажынкі ў Залессі».*** *Музыка* **В. Казлоўскага,** *лібрэта* **Юзафа Лубенскага,** *пляменніка М. Кл. Агінскага (сына Фелікса Лубенскага).*

*Тэкст і ноты оперы пакуль, на жаль, не знойдзены. Звесткі пра яе ў наш час былі адшуканы амбасадарам Рэспублікі Беларусь у Англіі Уладзімірам Шчасным, ураджэнцам Смаргоншчыны. Упамін пра оперу надрукаваны ў 1835 г. у Парыжы, у часопісе «La Poloqnie historiqie, litteraire, monumentale et pittoresque» (выдавец Л. Ходзька).*

**У ліпені 1822 г.** Залессе наведаў студэнт Віленскага універсітэту, 19-гадовы **Аляксандр Ходзька**, сваяк Леанарда Ходзькі (Аляксандр быў сябрам А. Міцкевіча і ўваходзіў у тайнае Таварыства філаматаў і філарэтаў, ведаў А. Адынца, І. Дамейку). Гуляючы па сядзібе і парку, Аляксандр быў так уражаны іх прыгажосцю, што за некалькі гадзін... склаў **паэму «Залессе».**

*Потым, у 1837 г., гэтая паэма будзе надрукавана па-польску А. Ходзькам у Парыжы ў часопісе «La Pologne historique...» (у 1-м томе). У наш час часопіс «Спадчына» (№ 3, 1997) змясціў яе падрадковы пераклад на беларускую мову В. Калніным. Тэкст паэмы адшуканы Т. Кляшчонак (г. Смаргонь).*



Аляксандр Ходзька ў сталым узросце

Ужо ў гэтыя часы госці князя Агінскага далі яго Залескай сядзібе другую назву — **«Паўночныя Афіны»**, і студэнт Аляксандр у сваёй паэме красамоўна распавядае пра тое, што ўбачыў. З аповяду (які для даследчыкаў з'яўляецца своеасаблівым «паэтычным інвентаром») мы даведваемся пра Лебядзіную **выспу** на ставе, пра **кітайскую альтанку, альтанку Амеліі, клумбу Эмы, пра вадаспад, грот, масткі цераз** р. Бабрынку і, галоўнае — пра Бэльведэр.

*Дзякуючы паэме ў 1999 г. было зроблена невялікае адкрыццё: склаўшы паводле яе «маршрут паэта», залескія даследчыкі знайшлі ў ёй назву невялікага ўзвышша-горкі ў парку — у часы Агінскага яна звалася* **Бэльведэр** *(ад італьянскага BELVEDERE — прыгожы краявід). Магчыма, на Бэльведэры стаяла белая драўляная альтанка. У 1874 г. Генрых Шліман (1822—1890) па паэме Гамера «Іліяда» знайшоў знакамітую Трою. А цяпер невядомы Бэльведэр быў знойдзены па паэме А. Ходзькі ў былых «Паўночных Афінах» Агінскага.*




Мемарыяльны камень у гонар паўстанцаў 1794 г.




Мемарыяльны камень, прысвечаны Жану Ралею

А. Ходзька ў сваім творы ўзгадвае і пра мемарыяльныя камяні. Адзін з іх гаспадар Залесся, былы паўстанец 1794 г., устанавіў у гонар Т. Касцюшкі з надпісам **«CIENIOM KOSCIUSZKI»**. Другі камень з выбітым надпісам **«INSTITVTORI SUO JOAN. ROLAY GRATUS DISCIPULUS M. O. MDCCCXXII»** (Настаўніку Ж. Ралею — удзячны вучань М. А. 1822) прысвечаны «вучнем Міхалам» (яму было ў той час 57 гадоў) настаўніку Жану Ралею. У *1995 г., 2 жніўня (на Іллю), гэты камень быў знойдзены мясцовымі краязнаўцамі-настаўнікамі Казлоўскімі (Віктарам Піліпавічам і Тамарай Георгіеўнай) і вучнямі Лёшам і Вольгай Ліс. А праз два гады (2 траўня) студэнты з Віцебска, дактары, настаўнікі і вучні з Залесся і Смаргоні адкапалі яго і праспявалі гімн у гонар настаўніка Агінскага са словамі:*

*«... Каб засталося ў вяках*
*І разнясло ся па алеях:*
*«Жыў вучань Міхал Клеафас,*
*Вучыўся ён у Жан Ралея!»*

Як выглядалі залескія «Паўночныя Афіны» можна меркаваць і па малюнку Л. Ходзькі (1822 г.) .Малюнак зроблены з боку става (*магчыма, мастак сядзеў у лодцы*), дзе мы бачым масток да **выспы Лебядзінай,** злева б**ровар**, **млын**, за агароджай — шкляная **цяплярня**, далей **аранжарэя, палац і каплічка**. Гледзячы на гэтую сядзібу, разумееш, чаму паэма А. Ходзькі пачынаецца радкамі: ***«Праўнукам даслаў бы я Залессе, /Ды, адчуваючы ў грудзях духоўнага агню ўздымы,/Сюды! Склікаў бы мастакоў! Сюды, паэт, бяжымы!»***

У сядзібе Агінскага гасцяваў у гэтым годзе і яго былы настаўнік музыкі **Восіп Казлоўскі**, які быў дырэктарам аркестраў імператарскіх тэатраў, педагогам і загадчыкам царскай музычнай бібліятэкі.




*Залессе. Краявід сядзібы, 1822 г., малюнак Леанарда Ходзькі*

Ён з'яўляўся таксама аўтарам шматлікіх твораў (опер, рэлігійных мес, вакальных паланэзаў і песень), сярод якіх быў і паланез «Гучы, гром перамогі» — да 1833 г. афіцыйны гімн Расейскай імперыі («Гром победы, раздавайся»).

Пасля інсульту (у 1821 г.) Казлоўскі пакінуў усе свае пасады і, вяртаючыся з дачкой на радзіму, у г. Прапойск (зараз г. Слаўгарад Магілёўскай вобл.), спыніўся на некаторы час у свайго былога вучня ў Залессі.



*М. Кл. Агінскі ў строі для палаваньня*



*Восіп Казлоўскі, кампазітар*

Госці князя Агінскага пасля вандровак на конях ці брычках да Віліі збіраліся ў адной з гасцёўняў палаца, дзе ладзіліся музычныя вечарыны. Гучаў **квартэт**, і **першую скрыпку** граў сам **князь Міхал** (напэўна, скрыпку тую ён заказаў у Лондане ў 1791 г.), **другую** — вядомы ў той час у Вільні музыка **іспанец Р. Эскудэра** (меў ад князя пенсію), на віяланчэлі граў **В. Казлоўскі**, на фартэпіяна — **Амелія Агінская** (яна ў той час ужо складала паланезы, добра малявала і захаплялася паэзіяй). Настаўнік музыкі дачок князя **Д. Паліяні** спяваў па-італьянску арыі ці рэчытатывы з опер пад акампанемент фартэпіяна. Магчыма, дочкі князя — Эма і Іда — яму падпявалі.

*«Залескі квартэт» граў, напэўна, папулярныя ў тыя часы опусы Гайдна, Моцарта, і, зразумела, сам Агінскі не мог не іграць сваіх твораў. Усяго ён склаў* ***20 паланэзаў, 60 вакальных і інструментальных твораў****. Ён — аўтар знакамітага* ***«Марша польскіх легіёнаў»****. Анджэй Залускі ў сваёй кнізе «Час і музыка М. К. Агінскага» (раздзел «Дыскусія») даказвае, што музыку сучаснага польскага гімна склаў Агінскі, а не І. Выбіцкі, які напісаў толькі словы. Князь Міхал складаў і* ***мазуркі, і яшчэ ён аўтар*** **оперы «Зеліс і Валькур, ці Напалеон у Каіры»** *(як сцвярджае музыказнаўца-даследчык В. Скарабагатаў, опера створана ў 1799 г.).*

Сярод гасцей князя былі выкладчыкі Віленскага універсітэту і былы паўстанец **афіцэр Паўловіч** — той, што выратаваў Агінскага ў час бою з расейскімі войскамі ў 1794 г., пад Вішневам.

Захаваўся інвентар тых часоў, які дае апісанне **«Ружовай гасцёўні»**, дзе маглі праходзіць «Музычныя вечарыны «Паўночных Афінаў»: **«Падлога паркетная, ясеневая... У цэнтры столі — гіпсавая разетка. Камін — белы, кафляны. У гасцёўні вялікая таполевая канапа...; два таполевыя столікі з верхам, абцягнутым зялёным сукном; адзін стол васьміграннай формы на гнутых ножках; шэсць крэслаў...; 10 крэслаў, абабітых чырвоным муарам. Вялікая лямпа на бранзовай падстаўцы... Невялікі столік з белага мармуру... На століку гіпсавы бюст Касцюшкі. Фартэпіяна з чырвонага дрэва, венскае з вензелямі, пюпітры для нотаў. Вялікае люстэрка ў пазалочанай раме. Краявідаў у рамах — шэсць. Партрэт князёўны** [Марыі дэ Нэры — аўт.]. **Партрэт імператара Аляксандра I у раме».**



*Габрыэла Пузыніна (пісьменніца, нарадз. у м. Дабраўляны)*

Габрыэля Пузыніна (1815—1869) у сваёй кнізе «У Вільні і літоўскіх сядзібах» упамінае, што ў адной з залаў залескага палаца была **галерэя партрэтаў** (князі, графы, генералы), пра якія сенатарыха Марыя дэ Нэры казала па-французску «*Ce sont mes amies*» (гэта мае сябры). Кожны год у Залессі **15 жніўня — у дзень імянін княгіні**, — у аранжарэі накрывалі стол для прыгонных сялянаў (а на хрэсьбінах яе сына Ірэнеўша ў сядзібе частаваліся каля 3-х тысяч душ).

Ад сядзібы ў Залессі ў розныя бакі вялі таполевыя, ліпавыя і бярозавыя алеі. Адна з іх прыводзіла да паштовага гасцінца, каля якога стаяў мураваны будынак заезнага двара (там, дзе зараз аўтобусны прыпынак «Міхневічы»). Каля яго быў **«лес Міхала»** (1), у якім канцэнтрычна сыходзіліся алеі і стаяла **Ратонда**, збудаваная ў стылі рымскага Пантэона (у гэтым лесе-парку спыняліся госці Агінскага ў час конных вандровак да Віліі). Каля в. Міхневічы былі вялікі стаў і млын.




*Залессе на тапаграфічнай карце 1850 г.*



*Праект Ратонды ў «лесе Міхала»*

# Італьянскі перыяд (пасля 1822 г.)

**У 1822 г. Агінскі з сям'ёй пакінуў Залессе і выехаў у Італію** — праз Дрэздан і Парыж. Разам з імі паехаў і сакратар Л. Ходзька. Галоўная, афіцыйная прычына ад'езду — дрэнны стан здароўя князя (у яго была падагра), якое ён хацеў паправіць у сонечнай краіне. Сям'я пасялілася ў **Фларэнцыі**, у прадмесці **Ф'езоле** (Fiesole). На раніцу Амелія хадзіла на малітву ў мясцовы касцёл (магчыма, Сан-Францыска). Побач былі летнія палацы, у бліжэйшым жыў князь Каніна (Люцыян Банапарт). У час вандровак па горадзе ў экіпажы Агінскія, як і іншыя, спыняліся на плошчы Мікеланджэла (PIAZZALE MICHELANGELO), адкуль адкрывалася прыгожая панарама Фларэнцыі. Праз нейкі час **Амелія з маці** былі **ў Неапалі**, а затым сям'я вярнулася ў Залессе, а князь з сакратаром засталіся ў Фларэнцыі. Агінскі ў гэты час бывае на балях і вячэрах у князя Баргезэ, амбасадах і дамах ангельскіх выгнаннікаў.



*Фьезоле, сучасны выгляд*



*Панарама Фларэнцыі*

У гэты год Агінскі з Фларэнцыі піша ліст у Залессе свайму сыну, які ад'язджае на вучобу ў Італію. (*Гэты ліст быў адшуканы ў Віленскім архіве ў 2002 г. супрацоўнікам музея Ул. Ліхотам. Рукапіс на французскай мове, пераклад (на расейскую) зроблены настаўніцай Залескай школы Н. А. Цімонінай.*)

Калі ў іншых вядомых нам мемуарах ці дзённіках Агінскі апавядае пра мінулыя гістарычныя падзеі як сведка, аналітык ці храніст, то ў яго лісце да сына раскрываецца Агінскі-бацька, які дае свайму нашчадку наказы на будучыню. Па сутнасці гэта духоўны запавет з практычнымі парадамі. Наказы дадзены ў характэрнай для Агінскага форме — з 14 пунктаў (гл. у канцы кніжкі).

*Дзіўна, але гэтыя наказы бацькі-арыстакрата далёкага XIX ст. актуальныя і зараз — праз 180 гадоў! Пры гэтым у іх не ідзе гаворка аб прыярытэце «быць першым». Агінскі з мудрасцю філосафа проста кажа сыну —* ***«гэты запавет змяшчае тое, што спатрэбіцца, каб стаць шчаслівым»***.



171

1

Tu quittes le toit paternel, mon enfant, et de ce premier pas s'ouvre une nouvelle carrière pour toi: c'est de ce moment que tu peux te dire je commence la vie.

Songes bien à ce mot la vie: ce n'est pas seulement la peine de vivre, chose commune à tous les animaux; mais c'est de savoir vivre; pour cela il faut réfléchir sur les moyens et le but de la vie.

Que ce mot de réfléchir ne t'effraie pas mon cher enfant, il n'y a point d'age qui ne soit propre à la réflexion, et la science de la vie est une science comme toutes les autres, qu'on peut apprendre, pourvû qu'on s'accoutume à se replier sur soi-même en s'étudiant et à suivre docilement les conseils que te donneront les personnes qui seront préposées à te guider dans les premiers sentiers de la vie.

Je ne serai plus au nombre de ces guides; mais cette feuille te parlera comme par ma bouche et te dira mes conseils mes ordres, et peut-être mes dernières volontés si la Providence ne m'accorde pas le bonheur de te revoir.

Voici donc ce que je te conseille et te prescris:

1° avant tout pénètre-toi bien de cette vérité que l'homme n'est pas le jeu du hasard; qu'il n'est pas né sans but; qu'il doit tout à son Créateur, à Dieu; que la religion est donc son premier devoir, sans laquelle l'homme n'est rien, n'est qu'un chiffre sans valeur. Sois donc Chrétien avant tout, car c'est là la religion que Dieu même a donnée aux hommes; sois le d'abord par la foi, et tâche à le devenir ensuite par conviction: ce que je dis ici est à présent trop au dessus de ta conception; mais un jour viendra où tu pourras le concevoir et te convaincre que ce précepte contient à lui seul tout ce qu'il faut pour parvenir à être heureux sur la terre.

2° Ne perds pas un instant de vue tout ce que tu dois à ta première bienfaitrice, à ta Mère, à celle qui t'a donné le jour, qui t'aime avec une tendresse que tu n'as pas eu le temps de mériter encore, mais que tu peux mériter et justifier en t'efforçant tous les jours à te rendre digne d'elle. Avec une bonne et ferme volonté le moyen d'y parvenir dépend uniquement de toi: c'est de t'accoutumer à ne rien entreprendre, rien dire, rien faire sans te demander préalablement ma mère l'approuverait-elle ou non?.. Cette question faite, si ta conscience te dit ma mère l'approuve, agis hardiment; ton instinct ne te trompera pas. Si ton sentiment interne te dit le contraire, abstiens-toi et tu t'épargneras une faute et un remord. A cet égard il faut que tu penses continuellement à ce qu'elle t'a prescrit à ce qu'elle t'a commandé, ce qu'elle t'a prié de faire.. Réfléchis bien mon enfant à ce mot prier: pourrais-tu résister à la prière d'une mère aussi bonne, aussi tendre, aussi aimante que la tienne! Ses volontés à l'égard de ta conduite sont les suivantes:

3° Etre matinal, te lever à l'heure qui te sera prescrite. A l'instant même qu'on te réveille, sortir du lit, pour ne pas donner le temps au sommeil et à la paresse de te gagner. Première, indispensable action, rendre grace au Créateur, le prier de te conserver ton excellente mère, appeler ses bénédictions sur tes parens et sur toi-même en te conservant dans les voies de la vertu. A la suite de ce premier acte qui est un devoir sacré vient la toilette, qui doit être courte, mais strictement observée, car la propreté, si importante pour la santé du corps, influe aussi par une sympathie mystérieuse sur la pureté de l'âme.

Першы ліст рукапісу «Ліст Агінскага сыну Ірэнеушу»

Яшчэ ў Залессі Агінскі ўпарадкаваў свае запісы і дзённікі, і тут, у Італіі, ён некалькі гадоў працуе над «Мемуарамі».

**У 1826 г. у** Парыжы на французскай мове выходзяць ягоныя «Мемуары» (2 тыс. паасобнікаў), якія выдаў, выехаўшы сюды, Л. Ходзька. У Жэневе надрукаваны 3 тыс. асобнікаў.

У гэтым жа годзе ў Віленскім касцёле кармелітаў старэйшая дачка Агінскага Амелія бярэ шлюб з маршалкам шляхты Упіцкага павету — Каралем Тэафілам Залускім (1794—1845).

Маладая сям'я жыве спачатку ў Гульбіне, потым — у Мемеле (Клайпеда), а з 1837 г. — у маёнтку Івоніч, сярод карпацкіх гор, на шляху паміж Кракавам і Львовам. Стараннямі Амеліі і Караля Івоніч стаў цэнтрам музычнага жыцця і курортам.

**У 1827 г.** — «Мемуары» выйшлі з друку на нямецкай мове (на польскай — у 1870 г.)

Тагачасныя мас-медыя («Le Globe», «Le Fiqaro», «la Revue britannique», «Le Pilote», «Journal de geneve» ды інш.) далі вельмі высокую ацэнку гэтаму твору Агінскага, падкрэсліваючы, што «Мемуары» з'яўляюцца «гісторыяй Польшчы» апошніх сарака гадоў.

**16 сакавіка** князь піша ліст з Фларэнцыі ў Залессе да сваёй 17-гадовай дачкі Эмы: «***Мая каханая Эма! Гэта першы ліст, які ты атрымаеш ад твайго бацькі з таго часу, як ты ёсць на свеце..., я заўсёды любіў цябе гэтаксама, як твайго брата і тваіх сясцёр... Я адрасую некалькі гэтых радкоў непасрэдна табе, якая займае па прычыне ад'езду Амеліі і Ірэнеуша месца самай старэйшай у сям'і, побач з мамай... Любі яе, давай ёй доказы тваёй ўдзячнасці, старайся яе парадаваць у час хваляванняў, прынось ёй повады***



*Эма Агінская (1810—1871 гг.), у другім шлюбе Высоцкая*



*Амелія Агінская (1803—1858 гг.), у шлюбе Залуская*

***толькі для радасці...»*** [Тэксты лістоў з Фларэнцыі ў перакладзе Т. Кляшчонак узяты з кнігі Е. Высоцкага «Старыя лісты распавядаюць». Літаратурнае выдавецтва. Кракаў, 1986 г. — аўт.].

**2 верасня 1827 г**. у Вільні адбыўся шлюб Эмы з Іпалітам Бжастоўскім. Маладыя пасяліліся далёка ад Літвы — у Вялюньскай зямлі (паблізу ад Лодзі ў Польшчы), у маёнтку Бжастоўскіх Чарнажылы.

**У 1828 г.** М. Кл. Агінскі заканчвае рукапіс «Лісты пра музыку» на французскай мове.

**2 лістапада** — ліст да Эмы: ***«Мая каханая Эма! Мяне вельмі ўзрушыла твая памяць аб маіх імянінах...»***

*Далей з сумам і тугой адзінокі і стары князь успамінае пра сямейнае жыццё ў Залессі, пра «той* ***час, калі мы былі ўсе разам, калі дзеці мае прыходзілі мяне абняць, а я, тулячы іх да сябе, даваў ім з глыбіні сэрца маё бацькоўскае блаславенне. Гэтыя хвіліны, такія***

*шчаслівыя для мяне, мінулі і ўжо не могуць вярнуцца, бо вы ўсе раскіданы па свеце, а я занадта стары і занадта прыгнечаны маім недамаганнем, каб мець надзею, што мне ўдасца яшчэ раз сабраць вакол сябе гэтых каханых дзяцей, на якіх я засяродзіў бы ўсю ўцеху маёй старасці..»*

**У 1829 г.** князя Агінскага наведалі **А. Міцкевіч і А. Адынец** (Адынец быў сябрам А. Ходзькі і прыязджаў з ім у Залессе). Князь чытаў паэзію Міцкевіча (Л. Ходзька прысылаў яе з Парыжу) і вельмі яе цаніў. Маладым Міцкевічу і Адынцу запомнілася гэта сустрэча, і яны яшчэ некалькі разоў сустракаліся з Агінскім. У сваіх успамінах А. Адынец піша, што сустрэчы звычайна канчаліся партыяй у шахматы (князь добра іграў не толькі на фартэпіяна) паміж Агінскім і Міцкевічам. У сваёй паэме «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіч ўпамінае пра М. Кл. Агінскага.



*А. Міцкевіч 1827 г., фрагмент з карціны В. Ванькові́ча*



*А. Адынец*

## *Адступленне — пра лёс паланэзу «ля-мінор»*

*У 1830 г. адбылося паўстанне ў Варшаве супраць Расейскай імперыі і ўзнікла яго пагроза ў верасні 1831 г.*

*Даследчыкі сцвярджаюць, што другая назва паланэзу «ля-мінор» Агінскага («Развітанне з Радзімай») была дадзена не яе аўтарам, а з'явілася ў асяроддзі былых паўстанцаў, якіх выслалі ў Сібір, менавіта пасля паразы паўстання 1830 г.*

*Няспраўджаныя мары аб свабодзе, настальгія і сум па канчаткова зніклай Рэчы Паспалітай ператварылі невялікі камерны музычны твор у рамантычны сімвал — успамін аб страчанай Радзіме.*

*Аўтар паланэзу, былы паўстанец 1794 г., жывучы ў Італіі, напэўна, не ведаў, што яго твор, напісаны ў далёкім Залессі, набыў новае найменне і новую будучыню. Дзіўным чынам гэтая новая назва расшыфравала, раскрыла і ўзбагаціла новым сэнсам шматтэмнасць эмацыянальных настрояў паланэзу. Гэты ўдалы саюз слова і музыкі, верагодна, і абумовіў папулярнасць паланэзу, якая дайшла і да нашых дзён. (Існуе некалькі аматарскіх, народных тэкстаў на яго мелодыю. У 1990 г. нават разглядалася прапанова зрабіць паланэз гімнам рэспублікі, а ў 2000 г. на CD-альбоме «Я нарадзіўся тут» з'явілася і песня «Развітанне з Радзімай» на словы Сержука Сокалава-Воюша, якія ён, дарэчы, склаў у эміграцыі.)*

**У 1833 г. у** Парыжы выходзіць другое выданне «Мемуараў» Агінскага (дзякуючы Леанарду Ходзьку). У гэты год радасная падзея для Агінскага-бацькі — да яго **прыехала Эма** з мужам.

*Пасля 10-ці гадоў расстання гэта была іх першая сустрэча, якая хутчэй нагадвала новае знаёмства, бо ўсё было ўпершыню...*

**4 студзеня** Эма ў сваім дзённіку запісвае: ***«Сёння я шпацыравала з бацькам першы раз»***. Пад іншай датай: ***«Першы раз папа частаваўся ў нас абедам»***.



*М. Кл. Агінскі, партрэт часу жыцця ў Італіі*

Іх сустрэчы былі частымі, па Фларэнцыі кружылі іх кароткія лісты (17 студзеня — пра танныя білеты ў ложу тэатра, пра візіты і г. д.).

**У сакавіку** Эма з мужам адпраўляецца ў працяглае падарожжа па Італіі. Бацька і дачка ізноў абменьваюцца лістамі. З яго лістоў мы даведваемся, што Эма з мужам былі ў В'ярэджо, дзе пазнаёміліся з пані Гуадані. Зрок Агінскага пагаршаецца, некаторыя лісты ён вымушаны дыктаваць: ***«16 ліпеня, Фларэнцыя... Холадна не толькі ў вёсцы*** [г. зн. ў Ф'езоле — аўт.], ***але і ў горадзе. Вільготны і дажджлівы час з халодным ветрам не дазваляе мне выйсці з маіх пакутаў, да якіх я прыгавораны з даўніх часоў»***.

Далей ён піша, што ў нядзелю больш за гадзіну правёў у тэатры «de L'ARENA» і яшчэ глядзеў ў тэатры д'Альф'еры першы акт оперы «Ганна Балейн» і балет пасля яе. Балет яму не спадабаўся, але музыкай і выкананнем оперы ён задаволены.

***«... Гэта праўда, што калі ходзіш у тэатр раз за шэсць месяцаў, маеш меншую патрабавальнасць. Я працягваю той самы стыль жыцця ў вёсцы, робячы экскурсы ў горад тры разы на тыдзень..., калі прыходзіць пошта і калі прыносяць газеты, бо гэта яшчэ з'яўляецца маім адзіным задавальненнем. Я вельмі сумую з той пары, як ты ад'ехала. Час так цягнецца...»***

У верасні Эма з мужам вяртаецца ў Фларэнцыю і **13 верасня ў Бжастоўскіх нараджаецца дачка Гелена**.

У кастрычніку князь Агінскі захварэў.

**13 кастрычніка** Эма прывезла паказаць сваю дачку. Князь гаварыць ўжо не мог і толькі перахрысціў немаўлятка-ўнучку.

**15 кастрычніка** у доме Марыёні, на плошчы Санта Марыя Навэла (вул. Ленайолі № 1014) у Фларэнцыі **ва ўзросце 68 гадоў памёр дыпламат, паўстанец 1794 г., кампазітар, дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, сенатар Расейскай імперыі і ўладар залескіх «Паўночных Афінаў» князь Міхал Клеафас Агінскі**.

Эма з мужам Іпалітам пахавала свайго бацьку на кляштарных могілках пры храме Санта Марыя Навэла. Затым Агінскі быў перапахаваны ў пантэон Санта Крочэ (BASILICA DI SANTA CROCE)* — гэта зрабіла яго жонка Марыя Агінская, якая ўстанавіла ў пантэоне ў правай капліцы (Capella castelliani del santissimo) надмагільны помнік свайму мужу з карарскага мармуру.


N° 90 del Registro
Al di 15 8bre
È passato all'altra vita Michele Oginski dal rapporto del quale mi sono state date le seguenti indicazioni.
Ora, giorno, mese, ed anno della morte: ore 9 ½ antemeridiane
Età del defunto: Anni 68.
Mestiere, o condizione del defunto: Possidente
Popolo al quale apparteneva: S. Trinita
Comunità nella quale è compreso d.° popolo: Firenze
Celibe, coniugato, o vedovo: Coniugato
Cognome e nome del padre: Oginski fu Andrea
Nome, e cognome della madre: fu Paolina Zambat
Cognome, e nome del marito, se il defunto era donna coniugata:
Avvertenze particolari a piacimento del Paroco.
Sottoscrizione del Paroco: P. Carlo Corelli
ARCHIVIO DI STATO DI FIRENZE
La presente fotocopia corrisponde all'originale qui conservato: STATO CIVILE TOSCANO, filza 9597 duplicati morti FIRENZE a. 1833 atto n°50
Firenze li, 2 APR 1996
Il Direttore

*Акт аб смерці М. Кл. Агінскага*

* Ксеракопію пасведчання прывёз з Італіі і перадаў у Залессе сп. П. Краўчанка.



***Базіліка Санта Крочэ. Фларэнцыя***

*Пантэон Санта Крочэ — галоўны храм ордэна францысканцаў. Але для Італіі гэта яшчэ і сімвал яе гісторыі, месца пахавання каля 300 яе знакамітых прадстаўнікоў — Галілео Галілея, Макіявелі, Леанарда Бруні, Мікеланджэла, Керубіні і інш. Зусім побач з М. Кл. Агінскім пахаваны яго пагодак — «геній оперы і слава Італіі», кампазітар Джаакіна Расіні (1792—1862).*

Жаночая постаць надмагілля — алегорыя смутку. Але, прыгледзеўшыся да жаночага твару, можна, здаецца лёгка пазнаць саму заказчыцу — Марыю Агінскую дэ Нэры (успомніўшы яе партрэт мастака А. Малінары). Гэта, напэўна, другі з пакуль што вядомых, але скульптурны партрэт жонкі М. Кл. Агінскага.




**Надмагілле М. Кл. Агінскага ў пантэоне Санта Крочэ**

*На гэтым апошнім прыпынку зямнога шляху князя Агінскага можна было б і паставіць кропку... Але гісторыя роду Агінскіх — гэта і гісторыя «Паўночных Афінаў» пасля 1833 г. і гісторыя роду Агінскіх да нашага часу. Пра ўсё гэта будзе скарочана распавядацца далей.*

# ЗАЛЕССЕ ПАСЛЯ М. КЛ. АГІНСКАГА

Слава «Паўночных Афінаў» пасля смерці гаспадара паціху пачала згасаць. Залессе перайшло ў спадчыну сыну **Ірэнеушу Агінскаму** (1808-1863), які жыў тут са сваёй маці. Сюды прыязджалі Амелія, Эма і Іда з сем'ямі.



*Ірэнеуш Агінскі, малюнак Антоніна Высоцкага*

**У 1838 г., 15 жніўня, прыехала** ў Залессе **Іда Кубліцкая** з чатырохгадовым сынам Каролекам на імяніны княгіні Агінскай. У гэты дзень тут гасцявалі гаспадары суседніх маёнткаў, святочны абед падавалі ў аранжарэі, а ўвечары была ілюмінацыя (феерверк) у парку і «Дажынкі» у Ратондзе ў «Лесе Міхала». (У Ратондзе яшчэ ставілася камінная опера В. Казлоўскага і Ю. Лубеньскага.)



*Амелія Агінская (1813—?) з дачкой Ідай*

Здароўе ўдавы Агінскай патрабавала лячэння. Яна хварэла на артрыт і ездзіла на курорт у Друскенікі.

**У 1843 г. Марыя дэ Нэры Агінская** з-за пагаршэння здароўя ад'язджае ў Італію і там **памірае ў 1851 г.** Gахавана ў г. Піза.**

Ірэнеуш Агінскі пасля смерці маці пераносіць сваю рэзідэнцыю ў Рэтаў (зараз Літва), дзе будуе новае мястэчка, касцёл і палац. У 1835 г. адмяніў у сваіх уладаннях паншчыну, замяніўшы яе чыншам. Стаў



*Іда Агінская*



*Сядзіба І. Агінскага ў г. Рэтаў. Малюнак Напалеона Орды*

фундатарам двухкласнай агранамічнай школы (1859) з узорнай гаспадаркай і навучаннем на літоўскай мове. Падтрымліваў пачатковую школу, школу музыкі і спеву. Заснаваў вясковую ашчадную касу, арганізаваў выставы гаспадарчых дасягненняў. У Вільні аднавіў капліцу Божага Цела ў касцёле Св. Яна, якую фундаваў яго прадзед Тадэвуш. Памёр і пахаваны ў Рэтаве.

Быў жанаты двойчы: з Юзэфінай Каліноўскай (1816—1844), а затым з 1845 г. — з яе сястрой Вольгай (памерла ў 1899) — дочкамі генерала Войска Польскага Юзафа Каліноўскага. Меў ад другога шлюбу двух сыноў. **Старэйшы Багдан Міхал** жанаты з Габрыэлай Патуліцкай. **Малодшы сын Міхал Мікалай** быў жанаты з Марыяй Скаржэўскай (1857—1945), жыў у Плунге.



*Багдан Агінскі*
*(1848—1909 гг.)*



*Міхал Мікалай Агінскі*
*(1850—1902 гг.)*

Пасля смерці Ірэнеуша маёнтак у Рэтаве перайшоў у спадчыну Багдану Агінскаму, а маёнтак Плунге (недалёка ад Рэтава) атрымоўвае Міхал Мікалай. Яму ж пераходзіць у спадчыну і Залессе (яно належала Агінскім да 1909 г.), якое пачало здавацца ў арэнду.

*Міхал Агінскі быў мецэнатам юнака М. Чурлёніса — даваў яму стыпендыю ў 13 рублёў на навучанне ў школе музыкі ў Варшаве. М. Чурлёніс потым стане сусветна знакамітым літоўскім кампазітарам і мастаком.*

Багдан і Міхаіл Агінскія нашчадкаў не мелі. Далей род Агінскага вядзецца па дзвюх жаночых лініях, ад дачок Міхала Клеафаса — **Амеліі Залускай** (1803—1858) і **Эмы**, у другім шлюбе **Высоцкай** (1809—1871).

**Анджэй Залускі** (нарадзіўся ў 1929 г.) скончыў у Англіі школу музыкі і Лонданскі універсітэт. Працаваў выкладчыкам музыкі. Напісаў і выдаў у Англіі ў 1997 г. кнігу «Час і музыка М. Кл. Агінскага» (у перакладзе В. Плютава яна выйшла ў Беларусі ў 1999 г.). Дзякуючы кнізе з'явілася шмат новых звестак пра Агінскага. Спадар Анджэй мае сына, трох дачок і трох унучак, жыве ў Англіі.



*Анджэй Залускі*

**Іва Залускі** (нарадзіўся ў 1939 г. у Кракаве), брат Анджэя. Жыве ў Англіі. Скончыў Акадэмію музыкі, музыка і кампазітар. Як піяніст канцэртуе ў Еўропе, выдаў у Англіі два кампакт-дыскі «Музыка дынастыі Агінскіх» (у 1995 і 1998 гг.). У першым найграў 18 паланэзаў свайго прапрадзеда. Спадар Іва і яго жонка Памэла маюць дзвюх дачок.



*Іва Залускі*

**Геранім Высоцкі** нарадзіўся ў м. Ясеніца (каля польска-славацкай мяжы). Скончыў Вышэйшую эканамічную школу, жыве ў Кракаве. Зараз на пенсіі. Ад шлюбу з Вандай Дэскур мае дзвюх дачок (адна — выкладчыца французскай мовы Кракаўскага ліцэя, другая — архітэктар у Варшаве). Аднаго з двух унукаў сп. Геранімa завуць Міхал. Геранім Высоцкі вывучае гісторыю свайго роду і на аснове вялізнага сямейнага архіву выдаў кнігу «Старыя лісты распавядаюць» (з яе намі ўзяты партрэты сям'і М. Кл. Агінскага).

На жаль, звестак пра нашчадкаў дзяцей ад першага шлюбу М. Кл. Агінскага з Ізабэлай з Лясоцкіх мы не маем.

Далей вернемся да падзей гісторыі сядзібы ў Залессі.

Да першай сусветнай вайны і ў 20-х гадах XX ст. уладальнікам Залесся зрабіўся **Генрых Высоцкі** (1884—1969), праправўнук дачкі Агінскага Эмы. Ён быў апошнім з роду Агінскіх уладальнікам гэтай сядзібы.



*Генрых Высоцкі фота 1903 г. (апошні ўладальнік Залесся з роду Агінскіх — па лініі Эмы Высоцкай)*

У **30-я гады XX ст.** маёнтак і сядзіба Агінскіх пераходзяць польскаму зямельнаму банку. У канцы 20-х гадоў землі, стаў і млын набылі **браты Кабчынскія** (прыехалі з Расеі), а маёнтак з паркам — **Марыя Жаброўская** (жыла ў Варшаве). Апошняя зрабіла там капітальны рамонт і ператварыла маёнтак у прыватны летні пансіянат, куды прыязджалі на адпачынак з Вільні і Варшавы. У палацы была зала, якая звалася «кампазітарская». Яшчэ ў 1934 г. у парку стаяла альтанка Амеліі.



*Альтанка Амеліі ў парку залескай сядзібы. Фота 1926 г.*

У час другой сусветнай вайны тэрыторыя Заходняй Беларусі, якая належала Польшчы, была далучана (пасля 17 верасня 1939 г.) да БССР.

**У 1939—1941 гг. у** былым палацы Агінскіх размяшчаўся Дом адпачынку для жыхароў Менску. Напэўна, у гэты час на месцы часткі ангельскага парку з'явіўся сад.




***Жыхары Залесся каля «Дому адпачынку», фота 1940 г.***

*Паводле ўспамінаў старога жыхара Г. Казлоўскага (1928 года нараджэння), пра пачатак Айчыннай вайны адпачываюцы даведаліся, калі глядзелі ў двары каля палаца кінафільм «Сувораў».*

Пасля вайны Дом адпачынку аднавіў дзейнасць.

**У 1961 г. ён** ператвораны ў Дом для састарэлых.

**У 1977 г.** тэрыторыя сядзібы і маёнтак перададзены на баланс Смаргонскаму сілікатнаму (цагельнаму) заводу.

**У 1979** г. новы ўладальнік дае заказ на рэстаўрацыю сядзібы і прыстасаванне яе пад прафілакторый (аўтар праекта рэстаўрацыі Л. Іванова).

*На пачатку рэстаўрацыі ў цэнтральнай зале палаца знік апошні камін з рэльефнай кафлі.*

**У 1990 г., 25 верасня,** першы раз было наладжана свята ў залескім маёнтку «Агінскаму — 225 гадоў».



*Мемарыяльная дошка на доме, дзе жыў і памёр М. Кл. Агінскі*

**У 1992 г.** адрэстаўравана і пачала дзейнічаць для залескай парафіі капліčка Агінскага.

**У 1995 г., 31 жніўня,** залескую сядзібу наведаў амбасадар Італіі ў Рэспубліцы Беларусь сп. Жан Лука Берценета.

**У красавіку 1996 г.** адкрылася мемарыяльная дошка (скульптар В. Янушкевіч) у Фларэнцыі на доме, дзе жыў М. Кл. Агінскі. Гэта адбылося дзякуючы намаганням і пры ўдзеле П. Краўчанкі — тагачаснага міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Былая сядзіба Агінскіх пераходзіць ў падпарадкаванне Міністэрства культуры — да Аб'яднання літаратурных музеяў. Плануецца стварыць тут музей Агінскіх і школу мастацтваў для дзяцей Залесся.

**У чэрвені** настаўнікі і вучні Залесся (тэатральная студыя «Альтанка») наведалі радзіму Агінскага — м. Гузаў (Польшча) пры фінансавай падтрымцы Беларускага фонду Сораса.

**25 верасня** на свяце ўгодкаў М. Кл. Агінскага ў залескім маёнтку дзіцячая тэатральна-музычная студыя «Альтанка» паказала прэм'еру аматарскага музычнага спектакля ***«Вечар у «Паўночных Афінах», ці сон Антонькі»*** (лібрэта і музыка W. Ramejki Zaleskaga). Спектакль створаны пры падтрымцы Беларускага фонду Сораса.

**У верасні** ж ксёндз П. Станяк, настаўнікі і вучаніцы Гузава наведалі Залессе.

**У 1996 і 1997 гг.** у Залессе прыязджалі нашчадкі Агінскага — сп. ***Анджэй Залускі*** (1996 г.) і сп. ***Іва і Памэла Залускія*** (1997г.). Гэтыя прыезды адбыліся дзякуючы амбасадару Рэспублікі Беларусь ў Англіі У. Шчаснаму.

*Такім чынам, два беларускія дыпламаты — П. Краўчанка і У. Шчасны — узнаўляюць памяць пра Агінскага.*

**У 1997 г.** у Англіі выдадзена кніга А. Залускага ***«Музыка і час М. К. Агінскага»***.




***Кніга А. Залускага, выдадзеная ў Англіі***




***Кніга П. Станяка, выдадзеная ў Польшчы***

**У верасні 1998 г.** адкрыты помнік Агінскаму ў Гузаве. На адкрыццё былі запрошаны жыхары Залесся і Смаргоні. Выдадзена кніжка гузаўскага святара П. Станяка «Клеафас Міхал Агінскі».

**У 2000 г.** вучні з Залесся і Смаргоні ***(студыя «Альтанка»)*** запрошаны ў Італію (італьянскім фондам «L'ARCA»), ***дзе наведалі ў Фларэнцыі* (25 ліпеня)** месца пахавання князя Міхала Клеафаса Агінскага — ***пантэон Санта Крочэ.***



*Тэатральна-музычная студыя «Альтанка», 2001 г.*

**30 ліпеня** «Альтанка» паказвае ўрыўкі са спектакля аб Агінскім «Вечар у «Паўночных Афінах» на міжнародным фестывалі тэатраў для дзяцей у г. Порта Сан Эльпідыю (у якасці гасцей). Гэта адбылося дзякуючы прэзідэнту фонду «L'ARCA» сп. Расане Берыні.



*Малюнак герба «Агінец», 1800 г.*

*Гэтая спроба аўтара нешта даведацца і распавесці пра асобу князя Міхала Клеафаса Агінскага, пра яго род і памяць аб ім, напэўна, не будзе апошняй. Яна — толькі невялікая аматарская старонка ў шэрагу сур'ёзных даследаванняў.* Таму мы не будзем спяшацца ставіць кропку, а паставім пакуль шматкроп'е, запрашаючы іншых зрабіць свае «крокі памяці» аб АГІНСКІМ У ЗАЛЕССІ...

**P. S.** А 25 верасня, на чарговыя ўгодкі М. Кл. Агінскага, у Залессе з'едуцца людзі, цікаўныя да мінуўшчыны свайго краю. Будуць гучаць музыка, творы князя Міхала і акцёры дзіцячай тэатральнай студыі «Альтанка» будуць спяваць для гасцей:

*«Пра мінулыя стагоддзі хочам даведацца мы,*
*Пра ўчынкі і падзеі — як нашы продкі жылі.*
*У кожным з нас жыве былое — з тых мінулых часоў,*
*З тых памылак і здабыткаў продкаў, братоў, землякоў.*
*Хто мінуўшчыну шануе, ведае яе,*
*Той не згубіць, захавае карані свае!*
*Дрэва без карэнняў гіне — мёртвае яно,*
*Без сваіх карэнняў дрэва — гэта бервяно...»*



**Алея залескай сядзібы М. Кл. Агінскага**

# ЗАПАВЕТ СЫНУ ІРЭНЕУШУ,
## які, ад'язджае на вучобу ў Італію (1822 г.)

Дзіця маё, ты пакідаеш бацькоўскі дом, і з гэтага першага кроку пачынаецца новы этап твайго жыцця, з гэтага моманту ты можаш сказаць сабе: я пачынаю жыццё.

Задумайся і памяркуй разважліва над гэтым словам *жыццё*: гэта не толькі праца жыцця, якая з'яўляецца агульнай для ўсіх жывых чытачоў, але і ўменне жыць — дзеля гэтага трэ задумацца аб сродках і сэнсе жыцця.

Няхай гэтыя словы «меркаваць, думаць» не пужаюць цябе, мой дарагі сын. Няма такога ўзросту, якому не быў бы ўласцівы розум, а навука жыцця такая ж, як і ўсе іншыя, якія можна было б вывучыць, калі толькі прызвычаіцца засяроджвацца на саміх сабе, вывучаючы сябе, прыслухоўваючыся да парад, якія даюць людзі, што будуць весці цябе першымі пуцявінамі твайго жыцця.

Я не далучаю сябе да такіх павадыроў, але з дапамогай гэтага ліста буду размаўляць з табой так, як быццам бы я побач, даючы табе парады і наказы, і, магчыма, яны будуць апошнія, калі толькі Боская воля не падорыць мне шчасце ўбачыць цябе ізноў.

Вось што я табе раю і наказваю:

1. Перад усім засвой адну ісціну: чалавек — гэта не воля выпадку, ён не нараджаецца без мэты. Усім ён абавязаны свайму Творцу — Богу, рэлігія — гэта яго абавязак, без якога чалавек нішто, усяго толькі лічба. Перш за ўсё будзь хрысціянінам — рэлігію людзям даў сам Гасподзь. Спачатку будзь проста вернікам, каб урэшце стаць вернікам па перакананні. Усё, што зараз тут я табе апавяду, ты яшчэ не зусім зразумееш, але аднойчы пераканаешся, што ў гэтым запавеце ёсць тое, што спатрэбіцца, каб стаць шчаслівым.

2. Ні на імгненне не забывай нічога з таго, чым ты абавязаны сваёй самай першай дабрадзейцы — тваёй Маці. Нічога з таго, што дала табе аднойчы яна, якая любіць цябе з такой пяшчотаю, меры якой ты яшчэ не зразумееў, але якую ты зможаш зведаць і спраўдзіць, намагаючыся быць яе вартым. Ты дасягнеш поспеху, дзякуючы добрай і цвёрдай волі, усё залежыць толькі ад цябе. Прызвычайся нічога не гаварыць, не рабіць, папярэдне не запытаўшыся ў сябе: «А мая маці ўхваліць ці не?..» І калі на гэтае пытанне тваё сумленне адкажа: мая матуля гэта ўхваліць — тады дзейнічай смела, тваё пачуццё цябе не падмане. Калі яно скажа табе адваротнае — устрымайся, і ты пазбавішся ад памылкі і згрызотаў сумлення. Прымаючы гэта да ўвагі, ты ўспомніш пра тое, што яна табе наказвала і прасіла рабіць. Добра падумай, сынок, над гэтым словам *прасіць*: ці зможаш ты адмовіць просьбе Маці, такой добрай, пяшчотнай і каханай?! Яе просьбы наконт тваіх паводзін такія:

3. Будзь заўсёды раннім — уставай на золку, як толькі цябе пабудзяць, адразу падымайся і не давай часу для сну і ляноты, перамагай сябе. Першае і неабходнае — прасі захаваць тваю цудоўную матулю, прасі блаславіць тваіх родных і самога сябе накіраваць на шлях дабрачыннасці. Затым, пасля гэтай першай справы, другая — гігіена. Чысціня цела ўплывае на чысціню душы.

4. Што тычыцца ежы, ты павінен пазбягаць празмернасці, асабліва ў віне (калі не, то гэта дрэнна адаб'ецца на тваім здароўі, і ты гэта ведаеш), троху віна (на 2 пальцы) — усё, што ты можаш сабе дазволіць. Не захапляйся таксама і півам, лепш за ўсё для цябе і твайго здароўя — гэта прахаладжальныя напоі. Трэба, каб ты ведаў, што празмерная прага — гэта наступства дрэннай звычкі ці нездаровага страўніка, таму трэба пазбягаць залішняга ў ежы і ў піве — усяго таго, што можа пашкодзіць здароўю.

5. Ты захаваеш сваё здароўе, калі будзеш захоўваць чысціню, а таксама і рэжым, выконваючы практыкаванні. Ёсць два віды гімнастыкі, да якіх у цябе таксама ёсць слабасць — гэта язда вярхом і плаванне. Я хачу, каб ты іх развіваў і надалей, але каб рабіў гэта з асцярогай, якой яны патрабуюць. Спачатку я спадзяюся на чалавека, ад якога ты будзеш залежаць і давяраць як конніку, каб разлічваць на яго разважлівасць. Што да плавання, то я павінен цябе папярэдзіць: ты павінен добра зразумець, што ёсць вялікая розніца паміж плаваннем у моры, рацэ ці возеры. Абодва мы калісьці плавалі як рыбы, я бачыў, як ты смела кідаўся ў ваду, гэта заўсёды давала мне самае вялікае задавальненне. Але там, дзе мы праводзілі лета, мы скакалі ў мора з лодкі, там было глыбока і далёка да дна; а большасць рэкаў — заўсёды з цячэннем і ў возерах на дне травы, ціна, і багна — гэта вельмі небяспечна для ныральшчыкаў. Купаючыся, не забывай аб розніцы плавання ў рацэ, моры ці возеры — памятай пра ўсё, што я табе кажу.

6. Дзень трэба заканчваць таксама, як і пачынаў, — малітвай, успамінаючы тваю добрую матулю, яе клопаты аб табе. Прааналізуй сябе — ці ацаніў ты на працягу мінулага дня гэтыя яе клопаты і дабрыню. Калі ты гэта зрабіў, то Усявышні і тваё сумленне пашлюць табе спакойны сон. Але калі на бяду ты гэтага не зрабіў, трэба папрасіць прабачэння ва Усявышняга, шчыра пакаяцца з рашэннем выправіцца і супакоіць сваё сумленне, без чаго не можа быць сапраўднай радасці у жыцці.

7. Для паслуг я адпраўляю з табою Санці, слугу, які ўжо 3 гады апякуецца табою. Трэба да яго ставіцца з пяшчотаю, дабрынёю і нават удзячнасцю, таму што ён пакідае сваю жонку і дзяцей, каб ехаць з табою. Але паміж дабрынёю і фамільярнасцю ёсць вялікая розніца. Першае — велікадушнасць сэрца, другое — з-за пасрэднасці і пошласці. Нарадзіўшыся не дзеля таго, каб абслугоўваць, а быць тым, каго абслугоўваюць, ты абавязаны гэтым выпадковасці, таму няма ніякіх падстаў тут ганарыцца; тым не менш, гэта перавага, дадзеная табе. Табе трэба намагацца выхаванасцю і высакародствам пачуццяў надаць сабе сапраўдную значнасць і зразумець, што ўсё астатняе дасталася табе толькі па волі фартуны.

8.. Каб замацаваць тваю звычку самааналізу, няма нічога лепшага, чым завесці дзённік і запісваць усе свае ўчынкі, асабліва свае думкі. Гэтая звычка мае двайную выгаду: першая — звычка засяроджвацца на самім сабе, заглядваць у сябе, захаваць сябе; другая — сфарміраваць стыль, здольнасць пісаць, становячыся пісьменнікам. Гэта прыдумана добра, бо звычка саманазірання яшчэ спрыяе лепшаму запамінанню падзей. Я вельмі задаволены, што гэтая звычка ёсць і ў тваіх сясцёр.

9. А зараз пра тое, што тычыцца тваіх заняткаў — тваёй вучобы. Гэты пункт спатрэбіцца, каб пазнаёміць цябе з маімі поглядамі. Я прадракаю табе кар'еру дыпламата, таму што яна, спадзяюся, падыдзе табе больш за ўсё. Неабходна, каб твае заняткі былі скіраваны для дасягнення гэтай мэты. Для пачатку — лекцыі па гуманізму. Ты ўжо валодаеш асновамі грэчаскай мовы і мог бы, каб захацеў, валодаць ёю лепей. Неабходна табе прыкласці ўсе намаганні, таму што я ўпэўнены: вывучэнне дзвюх класічных моваў можа быць аднačасовым, тым болей, што грэчаская папярэднічае лацінскай і дапамагае яе вывучэнню. З некаторага часу рамантызм у літаратуры — тое ж самае, што cholera mortus [халера — аўт.] для народаў, але гэтая бяда міне, як і ўсе іншыя,— добрае і прыгожае застанецца такім назаўсёды, таму што дабро і прыгажосць, як і ісціна, не змяняюцца ніколі. Тое, што распавёў я тут, у гэтым наказе, табе яшчэ цяжка зразумець, але пачакай, міне час — і ты згодзішся са мной, што не можа быць добрых і моцных ведаў, калі яны не грунтуюцца на веданні гэтых дзвюх класічных моваў.

10. Я не буду паглыбляцца ў дэталі розных галінаў гістарычных і філасофскіх ведаў, якія ты павінен будзеш спасцігнуць, каб затым служыць з гонарам; парадак пераемнасці рэчаў, як і выбар сродкаў, заўсёды ў распараджэнні адукаванага чалавека. Я хачу далучыць яшчэ адно маё пажаданне — вывучаць сучасныя замежныя мовы, што неабходна для тваёй кар'еры, якую ты сабе выбераш. У гэтую пару твайго жыцця памяць твая такая добрая, што авалодаць мовамі будзе лёгка, і гэта ў выніку будзе вельмі карысна для цябе, таму што несумненна дапаможа зрабіць кар'еру.

11. A quelo fine; non dimenticar, o caro mio la dolce favolla Toscana. La Lingva di quell bel paese dove il si suona*! Недастаткова адно размаўляць з Санці, бо гэта ўсяго толькі гаворка вуліцы Фларэнцыі. Трэба добра вывучыць мову, неабходна яе разумець і любіць. Дзеля гэтага трэба чытаць кнігі лепшых італьянскіх аўтараў і трэба пісаць на гэтай мове. Лістуйся на італьянскай мове са сваімі сябрамі.

12. Пасля таго як скончыш падрыхтоўчыя заняткі, ты будзеш працягваць навучанне ва універсітэце. Намагайся заслужыць добразычлівасць тваіх аднакурснікаў роўнымі паводзінамі, прыязнымі і ветлівымі, да ўсіх аднолькавымі. Бываюць такія студэнты, неспакойнага характару, якім падабаецца шукаць сварак са сваімі таварышамі. Гэта чума, якой трэба пазбягаць з найбольшай стараннасцю, і самы лепшы сродак пазбягаць гэтага (я казаў табе вышэй) — быць з усімі як мага болей ветлівым і не ўцягвацца ў справы, якія ты лічыш для сябе непрымальнымі. Сапраўдная мужнасць у тым, каб быць непахісным і нязменным у выкананні сваіх абавязкаў. Часцей той, хто баіцца славы баязліўца і сваю ганарыстасць выдае за смеласць, — той і ёсць баязлівец і даносчык. Апошняе лічыцца ў грамадстве самым агідным.

13. Поўная паслухмянасць і давер да чалавека, які згодзіцца ўзяць на сябе клопат аб тваіх паводзінах і занятках. Самы лепшы сродак заваяваць яго добразычлівасць — гэта педантычна выконваць свае абавязкі. Думай заўсёды пра чалавека, які будзе нас замяняць. Ты павінен паважаць і слухаць яго, як свайго бацьку.

14. На час тваёй вандроўкі ўсе клопаты аб табе захацелі ўзяць на сябе цётка і дзядзька Далгарукія і апекавацца табой, як маці і бацька, да таго моманту як вярнуць цябе ў рукі Боскай Волі, якая заменіць іх потым. Няма патрэбы табе казаць, як ты павінен сябе паводзіць са сваімі велікадушнымі роднымі. Я вельмі добра думаю аб табе, мой дружа, і ўпэўнены ў тым, што ты прыкладзеш усе намаганні, каб заслужыць іх прыязнасць, што ты будзеш шанаваць іх волевыяўленне.

Бывай, сынок, хай Неба блаславляе цябе, як я гэта раблю ад усяго сэрца. Пішы нам не меней чым два разы на месяц. Хай давер і праўда заўсёды водзяць тваім пяром. З якім задавальненнем мы будзем даведвацца аб усіх тваіх поспехах, якія залежаць толькі ад цябе, і толькі ад цябе залежыць, калі надыдзе той шчаслівы дзень, калі мы ізноў зможам цябе абняць. Калі ты нас любіш так, як я спадзяюся, гэта павінна цябе падтрымаць ва ўсіх тваіх пачынаннях. Не пазбывайся нічога з таго, што я табе наказваў на працягу 3 гадоў. Выкарыстоўвай мае наказы, каб вытрымаць экзамен, і гэта будзе адзіным сродкам, каб ты змог выканаць адну са сваіх мэтаў у Італіі перад тым, як мы ізноў убачымся, каб потым ужо ніколі не расставацца.

*Пераклад з французскай мовы настаўніцы*
*Залескай школы Н. А. Цімонінай.*

---

* Дзеля гэтай мэты не забудзь, мой даражэнькі, салодкую казку — Таскану, дзе гучыць мова гэтай цудоўнай краіны (італ.). [Агінскі мае на ўвазе тасканскі дыялект, які ляжыць у аснове італьянскай мовы. — аўт.]

# Спіс літаратуры


**Арлоў У., Сагановіч Г.** Дзесяць вякоў беларускай гісторыі. Вільня, «Наша будучыня», 1999.

**Афтаназі Р.** Гісторыя рэзідэнцый... Т. 4. Ваяводства Віленскае.

**Вольф Ю.** Князі на абшарах ВКЛ //«Спадчына», 1993, №3. Ст. 86-87.

**Грыцкевіч А.** Памятныя запіскі М. К. Агінскага Аляксандру І...// Гістарычны альманах «Адраджэньне». Мінск, 1995.

**Емяльянчык У.** Паланез для касінераў. Мн., 1994.

**Кляшчонак Т.** Міхал Клеафас Агінскі і Беларусь//«Беларускі гістарычны часопіс», 2000, №2. Ст. 79-90.

Лісты ў Смаргонскі музей (рукапіс) ад краязнаўцы **Э. К. Равецкене** з г. Плунге, 1982-1983 гг.

**Мальдзіс А.** Падарожжа ў ХІХст. Мн., 1969. Ст. 100-110.

**Немагай С.** Міхал Агінскі і яго эпоха ў «Лістах аб музыцы»// «Мастацтва», 1997, №9, 11.

**Немагай С.** Музычная дзейнасць прадстаўнікоў роду Агінскіх: новыя факты і імёны.//Зб. Міжнар. навук. канф. «Валенцій Ваньковіч». Менск, 2000.

**Розінер Ф.** Мастацтва Чурлёніса. М., 1993. Ст. 22-24.

**Скарабагатаў В.** Зайгралі спадчынныя куранты. Мн. , 1988. Ст. 90.

**Трэпет Л.** «Паўночныя Афіны» ў Залессі//«Роднае слова», 1998, №12.

**Трэпет Л.** Там, дзе гучалі паланезы. Мн., 1990.

**Хмяльніцкая Л.** Род фундатараў і мецэнатаў //«Віцебскі сшытак»,1995, №1. Ст. 42-46.

**Ходзька Л.** Залессе//«Спадчына», 1997, №3.

**Цеханавецкі А.** Міхал Казімір Агінскі//«Культура», 4 лютага 1993 г.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1. Мінск, 1993. Ст. 32-34.

Genealogia polskich rodów szlacheckih. Ks. OGINCY (tabl. 179, 180).

**Zaluski A.** The Times and Music of Michal Kleofas Oginski. London, 1997.

Polski Slownik Biograficzny. T. XXIII. Warszawa, 1984.

**Staniak P.** Kleofas Michal Oginski. Guzów, 1998.

**Wysocki E.** Stare listy opowiadają. Krakow, 1986.

Аўтар выказвае падзяку
прадстаўніцтву кампаніі «TRANEX»
у Рэспубліцы Беларусь
за падтрымку ў выданні гэтай кнігі

Літаратурна-мастацкае выданне
**Верамейчык** Сяргей Іванавіч
**Міхал Клеафас Агінскі, 1765—1833:
Продкі, жыццё ў Залессі, нашчадкі
(спроба храналогіі)**

Стыль-рэдактар *М. І. Аўхімовіч*
Мастацкі рэдактар *К. У. Хацяноўскі*
Тэхнічны рэдактар *С. Г. Фёдараў*
Карэктар *І. А. Ксяневіч*

Фармат 70х100/32. Папера афсетная. Гарнітура Лазурскі. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 5,16. Тыраж 1500 экз. Заказ №.159

Выдавецкае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Кавалер Паблішэрс».
Ліцэнзія ЛВ № 134 от 23.12.2002 г.
220035, Мінск, вул. Ігнаценкі, 7-39. Тэл./факс (017) 223 80 41.
E-mail: kavaler@inbox.ru, kavaler@tut.by
Надрукавана на ТАА «Юстмаж».
220090, Мінск, вул. Кнорына, 50.



*Верамейчык Сяргей Іванавіч — мастак па адукацыі (Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў). Удзельнік і аўтар шматлікіх праектаў рэстаўрацыі і рэканструкцыі помнікаў архітэктуры. Адзін з аўтараў праекта рэстаўрацыі і прыстасавання Мірскага замка. У 1989 г. пераехаў з Менску ў в. Залессе, дзе выкладаў маляванне ў пачатковых класах школы. Кіраўнік дзіцячых майстэрні малявання «Апалонік» і тэатральна-музычнай студыі «Альтанка». З 1997 г. — ст. навуковы супрацоўнік залескага філіяла Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь, працуе ў галіне музейнай педагогікі.*



ISBN 985-6427-78-9

МІХАЛ КЛЕАФАС АГІНСКІ

